Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 13 (4508) 3 красавіка 2009 г.

У нумары:

Хто мы, беларусы?

Вычарпальны адказ дае новае 10-томнае выданне.

Стар. 4

Жыццё перад мікрафонам

Алег Вінярскі — кумір радыёслухачоў — госць «ЛіМа».

Стар. 5

Дыягназ не суцяшае

Палемічныя развагі пра стан сучаснай беларускай літаратуры.

Стар. 7

Славутая «Купалінка», або Гісторыя аднаго замоўчвання

Шмат якія «народныя» песні маюць рэальных прафесійных аўтараў!

Стар. 11

Ураганная «бухта»

Герой нарыса — Таццяна Ражэва, начальнік Смаргонскага райаддзела культуры.

Стар. 13

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7390 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 9580 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 4950 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7500 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

3 красавіка пачынаецца XXVI Міжнародны фестываль музыкі "Мінская вясна-2009". Яго адкрыццё ў Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі будзе не проста ўрачыстым, а ў літаральным сэнсе мажорным. Сённяшнюю фестывальную праграму напоўніць магутная энергетыка бетховенскіх твораў: прагучаць Ля мажорная сімфонія № 7 і До мажорны фартэпіянны канцэрт № 1. Выканаўцы — Акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі ды яркі малады саліст Габрыэліюс Алекна: літовец з амаль беларускім прозвішчам, які жыве ў ЗША, часта выступае ў Вільнюсе, ён з прыемнасцю адгукнуўся на прапанову мастацкага кіраўніка БДФ Юрыя Гільдзюка паўдзельнічаць у адкрыцці "Мінскай вясны-2009". Канцэрт адбудзецца пад кіраўніцтвам дырыжора нашага аркестра Андрэя Галанава — аднаго з лепшых вучняў маэстра Генадзя Праваторава.

Імёны сённяшняй вясны

Дырыжор-легенда, народны артыст Расіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Генадзь Праваторaў адзначыў нядаўна сваю 80-ю вясну. У Вялікай зале сталічнай філармоніі з аншлагам прайшоў дабрачынны канцэрт-бенефіс "Музычнае прынашэнне". Галоўнымі арганізатарамі падзеі былі Міністэрства культуры краіны і Беларускі саюз музычных дзеячаў. Удзел у праграме, задуманай і пастаўленай рэжысёрам Валерыем Уколавым (вядучая — Іна Зубрыч), узялі творчыя калектывы, з якімі ў розныя гады супрацоўнічаў Маэстра, і малодшыя калегі-дырыжоры, пераважна яго вучні: Іван Касцяхін, Вячаслаў Воліч, Віктар Бабарыкін, Андрэй Галанаў, Пётр Вандзілоўскі, а таксама Аляксандр Сасноўскі, сённяшні кіраўнік канцэртнага аркестра "Няміга". Гэты юбілейны вечар увайшоў у гісторыю і як прэзентацыя новай суполкі ў структуры БСМД — Асацыяцыі оперна-сімфанічных дырыжораў на чале з ганаровым старшынёй Г. Праваторавым.

Пра тое, што Генадзь Праваторaў — Імя ў музыцы, сведчылі словы глыбокай пашаны, накіраваныя на адрас юбіляра: прывітальны адрас ад кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, зачытаны міністрам культуры Беларусі Уладзімірам Матвейчуком; віншаванні з адміністрацыі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, ад НАВТ оперы і балета Беларусі, ад расійскіх калектываў, з якімі працаваў маэстра, — Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя К. Станіслаўскага і У. Неміровіча-Данчанкі, "Новай оперы" імя Я. Колабава; ад выдатных дзеячаў мастацтва Беларусі, ЗША, Літвы... Творчую працу выдатнага інтэрпрэтатара класікі і сучаснай музыкі, яго вялікі ўнёсак у сусветную культуру адзначыў Міжнародны саюз музычных дзеячаў на чале з легендарнай расійскай прымадоннай Ірынай Архіпавай, узнагародзіўшы Генадзя Панцеляймонавіча Ганаровай граматай і медалём "За жыццё ў мастацтве"...

"Публіка прыходзіць у залу філармоніі для сустрэчы з высокай музыкай і чакае гэтую сустрэчу з асаблівым трапяткім пачуццём. Але не менш трапятліва ставяцца да сустрэчы з высокай музыкай і выканаўцы: нават не раз іграванае выклікае ў музыкантаў пачуццё вялікай асабістай адказнасці і патрабавальнасці адно да аднаго", — мяркуе адзін з удзельнікаў фестывалю, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага камернага аркестра Беларусі Пётр Вандзілоўскі.

Ды няма большай радасці для рыцара Музыкі, як выступленні яго аднадумцаў у мастацтве і маладых паслядоўнікаў. У захапленні ад праграмы была і публіка. Багатая і маляўнічая палітра духавога канцэртнага аркестра "Няміга"; шыкоўны ансамбль фінала II дзеі оперы Д. Вердзі "Аіда"... А якое свята стварылі на сцэне музыканты пад кіраўніцтвам Андрэя Галанава, увасобіўшы сапраўдны тэатр вобразаў "Італьянскага капрыччыо" П. Чайкоўскага! Як грандыёзна і кранальна прагучала заключная частка 9-й бетховенскай сімфоніі са знакамітым хорам! Пётр Вандзілоўскі ў адказ на авацыю залы крочыў да ложы, перадаў дырыжорскую палачку свайму настаўніку, і некалькі тактаў на "біс!" пазначыў дакладны красамоўны жэст маэстра Праваторава...

Яго вучні ды спадзвіжнікі ўдзельнічаюць і ў адкрыцці "Мінскай вясны". А ўжо заўтра Дзяржаўны камерны аркестр пад кіраўніцтвам Пятра Вандзілоўскага распачне ў межах фестывалю міжнародныя дні мандалінна-гітарнай музыкі "Мандалінісіма". У якасці салістаў выступяць маладыя прадстаўнікі Беларусі, Венесуэлы, Германіі, Францыі... Наогул жа, сёлетняя "Мінская вясна", якая працягнецца да 6 мая, збірае музыкантаў больш як з 15 краін. Адбудзецца каля 40 канцэртаў. Чакаюцца музычныя прэм'еры, у тым ліку твораў беларускіх кампазітараў. І ці не кожная праграма будзе для мінскай публікі сустрэчай з майстрамі выканальніцкага мастацтва і адкрыццём новых імён. Нездарма сёлетняе свята музыкі ладзіцца пад рубрыкай "Зоркі XXI стагоддзя". А яшчэ — мае дэвіз: "Таленавітая моладзь — 65-годдзю Вялікай Перамогі". Прынамсі, наша элітная музычная моладзь рыхтуе цыкл фестывальных вечароў "Меладрама", а юначы сімфанічны аркестр Беларусі і Расіі пад кіраўніцтвам А. Якупава — фестывальны апафеоз. Пакуль жа ўсё толькі пачынаецца...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымку: маэстра Генадзь Праваторaў падчас прысвечанага яму канцэрта-бенефіса; музычнае прывітанне ад канцэртнага аркестра "Няміга".

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

• Серыя мультфільмаў Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" "Аповесць мінулых гадоў-3" стала лаўрэатам XIV фестывалю анімацыйнага кіно, які прайшоў у Суздалі. Праект беларускіх мультыплікатараў перамог у намінацыі "лепшае выяўленчае рашэнне". "Аповесць мінулых гадоў-3" — гэта трэцяя частка з цыкла анімацыйных карцін аб узнікненні гербаў гарадоў Беларусі. На фестывалі дэманстраваліся стужкі аб узнікненні гербаў Чэрвеня, Шклова, Полацка, Навагрудка, Пружан. Над праектам працавалі пяцёра мастакоў-мультыплікатараў — Ганна Емельяновіч, Таццяна Кубліцкая, Канстанцін Касцючэнка, Яўген Надточа, Міхаіл Тумеля.

• У Віцебску на вуліцы Пакроўскай і яе ваколіцах з'явіцца квартал Марка Шагала. Такі праект быў прадстаўлены на міжнародным форуме "Інвестыцыйныя ініцыятывы Віцебскай вобласці". Плошча квартала складзе 50 гектараў. Над праектам працуе заслужаны архітэктар Беларусі Леанід Левін. Усе работы пройдуць у тры этапы. Спачатку будзе адноўлена вуліца Пакроўская ў стылі пачатку XX стагоддзя, калі там жыла сям'я мастака. Затым у квартале пабудуюць крамы, кавярню, Цэнтр сучаснага мастацтва з выставачным залам і мастацкай школай.

• Як вядома, для ўсёй сусветнай культурнай грамадскасці па рашэнні ЮНЕСКА 2009 год прызнаны Годам Мікалая Васільевіча Гогаля. Да слова, сёння ён уваходзіць у пяцёрку самых чытаемых пісьменнікаў свету.

У Мінску ўжо ладзілася некалькі святочных мерапрыемстваў, прыкладам, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прысвечаныя 200-годдзю з дня нараджэння М. Гогаля. А адно з апошніх, у сэнсе па часе, адбылося ўчора. Так, у сталічным кінатэатры "Цэнтральны" прэзентаваны Дні Мікалая Гогаля ў Мінску, таксама прымеркаваныя да двухсоттоддзя пісьменніка. Іх арганізатарамі выступілі Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, Арт-праект Алега Коца і Студыя кніг і аксесуараў "Вилка".

Наведвальнікаў жа кінатэатра чакаў сюпрыз: прэм'ера фільма "Тарас Бульба" (Расія, 2009), віртуальна прэзентаваная... вялікім пісьменнікам.

• Амерыканская кінастудыя "XX стагоддзе Фокс" зацікавілася сцэнарыем фільма "Юленька" беларускага драматурга Андрэя Курэйчыка. Фільм з'явіўся ў расійскім пракаце 19 лютага і ўжо рыхтуецца да паказу ў заходнееўрапейскіх краінах. "Юленька" зацікавіла і Галівуд. Амерыканскія рэжысёры мяркуюць зрабіць рымейк фільма. Гэта будзе першы выпадак, калі ў аснову амерыканскай стужкі ляжа сцэнарый беларускага аўтара.

• На біялагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта на розных патоках у адзін дзень адбыліся дзве сустрэчы з паэтам, галоўным рэдактарам часопіса "Нёман" Міхасём Пазняковым і загадчыкам аддзела прозы гэтага ж часопіса Наталляй Касцючэнкай.

Сустрэча сталася яркай, захапляльнай творчай імпрэзай, змест якой далёка не вычэрпваўся толькі чытаннем вершаў. Гэта быў дыялог, зацікаўленая размова пра самае набалелае, хвалюючае. Падчас сустрэчы, як праталіны напрадвесні, "адкрываліся" сэрцы і душы студэнтаў, выяўлялася, пра што думаюць, чым заклапочаны сучасныя студэнты, якія ідэалы іх вядуць па жыцці.

Творчая сустрэча з супрацоўнікамі часопіса "Нёман" прысвячалася Году роднай зямлі, які сёлета аб'яўлены ў Беларусі.

Падрыхтавалі Павел РАДЫНА, Уладзімір НАВУМОВІЧ

З гонарам за продкаў

Канферэнцыі

Адкрыў навуковую канферэнцыю доктар філалагічных навук, прафесар Адам Мальдзіс, які ў сваім дакладзе расказаў пра жыццё і дзейнасць графа Эмерыка Чапскага, а таксама пра незайздросны лёс Кракаўскай калекцыі графа, якая ў пасляваенны час аказалася ў сховішчах і цягам 70 гадоў заставалася недасяжнай. Супрацоўнікі Кракаўскага нацыянальнага музея адзначылі, што калекцыя, некалі перададзеная ў Кракаў графам Чапскім, стане асновай Еўрапейскага цэнтра польскай нумізматыкі.

У канферэнцыі прынялі ўдзел больш як 30 навукоўцаў. З замежных гасцей прысутнічалі нашчадкі былых уладальнікаў Прылук і Станькава — Аранда Эдуарда Гадлеўскі і Аляксандра Ванькоўская, якія прыехалі са Злучаных штатаў Амерыкі.

У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 180-годдзю з дня нараджэння Эмерыка фон Гутэн-Чапскага. Сустрэча навукоўцаў адбылася дзякуючы намаганням народнага гісторыка-краязнаўчага аб'яднання "Прылуцкая спадчына" Прылуцкага цэнтра народнай творчасці Мінскага раёна пры падтрымцы Інстытута Польскага ў Мінску.

На трэці дзень канферэнцыі адбылася экскурсійная вандроўка "Чапскія на Міншчыне". Яе ўдзельнікі пабывалі ў Прылуках, наведалі магілу Юзэфіны, нявесткі графа Эмерыка, Свята-Пакроўскую царкву ў Дзяржынску. Завяршылася экскурсія ў Станькаве наведваннем школьнага музея, царквы і старажытнага парку.

У бліжэйшыя гады нас чакаюць юбілеі славутых сыноў Эмерыка фон Гутэн-Чапскага: у 2010-м — 150-годдзе з дня нараджэння Караля Чапскага, які доўгі час з'яўляўся губернатарам Мінска, у 2011-м — гэткая ж круглая дата ў сына Юрыя, апошняга ўладальніка сядзібы Прылукі.

Лявон ЦЕЛЕШ

На здымку: нашчадкі графа Эмерыка фон Гутэн-Чапскага — грамадзяне ЗША Аляксандра Ванькоўская і Аранда Эдуарда Гадлеўскі.

Фота аўтара

І пярсцёнак Браніслава Тарашкевіча

Навідавоку

Фонды Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва папоўніліся новымі дакументамі. Ірына Уладзіславаўна, дачка Веры Тарашкевіч-Ніжанкоўскай, перадала частку сямейнага архіва.

— *Гэта ўжо трэцяе паступленне ад Ірыны Уладзіславаўны,* — распавядае дырэктара архіва-музея Ганна Запартыка. — *Упершыню яна перадала частку дакументаў гадоў дзесяць таму. Найперш яны датычылі яе дзеда Андрэя Канстанцінавіча Сніткі і бабулі Лізаветы Мікітаўны Уласавай. Другое паступленне было звязана з пажарам у хаце Ірыны Ніжанкоўскай. Вялікі гонар ёй і нізкі паклон, што яна выратавала архіў. Гэта былі кнігі з сямейнай бібліятэкі, фота. І вось у пачатку сакавіка яна ўжо трэці раз прывезла нам дакументы.*

— Ганна Вячаславаўна, скажыце, калі ласка, што цікавага сярод дакументаў?

— Гэта ўласна дакументы Браніслава Тарашкевіча. Як арыгіналы ўжо вядомых здымкаў, так і невядомыя: да прыкладу, фота маці Тарашкевіча, бацькі, дзеда. Цікава, што захаваліся дакументы і фота сына Тарашкевіча Радаслава, які загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны, а таксама дакументы па стварэнні музея-сядзібы, якая так і не была створана. Сярод перададзеных дакументаў ёсць здымкі, на якіх адлюстраваны першапачатковы выгляд хаты Тарашкевічаў у Радашковічах, якая сёння захавалася, але ў перабудаваным стане.

Тут таксама дзённікі і ўспаміны Веры Андрэеўны Тарашкевіч-Ніжанкоўскай. Дакументы яе брата Андрэя Андрэевіча Сніткі, які ў 1920—50-х гадах у Чэхаславакіі быў вядомым інжынерам. Шмат інфармацыі пра такіх асоб, як браты Нестар і Павел Кукальнікі. Іх родная пляменніца (дачка сястры Марыі) была замужам за Канстанцінам Сніткам, бацькам знакамітага археолага і гісторыка Андрэя Канстанцінавіча Сніткі і дзедам Веры Ніжанкоўскай. Род вельмі разгалінаваны. Андрэй Снітка ажаніўся з роднай сястрой Аляксандра Уласава, а Кацярына Снітка выйшла замуж за Аляксандра Жыркевіча, пісьменніка і калекцыянера. Ён быў знаёмы з Львом Талстым, Антонам Чэхавым, Карлам Бруловым, Ільёй Рэпіным. Пэндзлю апошняга належыць некалькі партрэтаў Жыркевіча.

— Акрамя невядомых фота сям'і Браніслава Тарашкевіча, што яшчэ эксклюзіўнага вам перадала Ірына Уладзіславаўна?

— Пярсцёнак Браніслава Тарашкевіча. На ім, праўда, пакуль не атрымалася прачытаць гравіроўку. Таксама шмат фотаздымкаў сям'і Аляксандра Уласава. Вялікую цікавасць уяўляе апошняе фота колішняга выдаўца "Нашай Нівы", зробленае яшчэ да арышту савецкімі органамі.

— Калі з дакументамі змогуць пачаць працаваць даследчыкі?

— Даследчыкам прыйдзецца пачакаць. Спачатку трэба правесці ідэнтыфікацыю кожнага дакумента, праанатаваць кожны здымак. Для кожнага дакумента трэба вырабіць спецыяльную папку. Скласці вопіс. Гэта дастаткова працяглы працэс, доўжыцца ён будзе, думаю, каля года.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымку: Браніслаў Тарашкевіч.

Маладзечанская цэнтральная бібліятэка імя Максіма Багдановіча і яе філіялы даўно сталі прыцягальным цэнтрам культуры, дзе ладзяць прэзентацыі кніг паэты, пісьменнікі, дзе праходзяць рознага кшталту і ўзроўню літаратуразнаўчыя канферэнцыі, а таксама выставы мастакоў.

З нагоды

Пачуццё прыгожага

На выставе Лявона Станкевіча, што днямі адкрылася тут, усё быццам напоўнена светласцю, вясною. Карціны мастака — часцінкі рэальнага жыцця. Ахоплівае такое пачуццё, быццам у сэрцах гледачоў ён стварае светланосны запас, які радуе, цешыць і лечыць чалавечую душу.

Кранаюць, заварожваюць цеплынёй і святлом карціны "Жыта", "Апошні прамень", "Купальская ноч", "Подых вясны" ды інш. Асобныя з іх нагадалі маю родную Смаргоншчыну, пакатыя узгоркі, рэчку дзяцінства і квяцісты луг. Адчуваць, разумець і аберагаць прыгажосць родных краявідаў, за якімі паўстае нашая сінявокая Беларусь, мы абавязаны не толькі ў Год роднай зямлі, а штодзённа, без прынукі. Павага да ўсяго роднага не мае патрэбу ў зычных словах, яна павінна быць ціхай, натуральнай, як карціны Л. Станкевіча "Восень у лесе", "Месячная саната", што красамоўна гавораць пра чыстыя намеры мастака, як і яго настаўніка, вядомага беларускага графіка Юрася Герасіменкі-Жызнеўскага.

— Ніколі не думаў, што на выставу прыйдзе столькі гараджан, — расхвалявана сведчыць мастак.

Выставы, што ладзяцца ў нашым горадзе, характэрныя і тым, што тут жывуць цікавыя, творчыя людзі, якія нясуць у сабе веру, дабро і духоўнасць. І дораць іх іншым, каб паўтарыцца ў пакаленнях.

Аркадзь ШАГАКІН

Фота Віктара Кавалёва

Подых часу

Машыны вывучаць беларускую мову?

У Мінску адбыўся семінар па праблемах бібліятэчнага абслугоўвання інвалідаў па зроку. Гэта новы напрамак дзейнасці для Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь — такія спецыялізаваныя бібліятэкі раней знаходзіліся пад патранатам грамадскага аб'яднання БелТІЗ. З 2006 года іх паступова пачалі перадаваць на баланс упраўленняў культуры. Цяпер яны знаходзяцца ў сетцы публічных бібліятэк.

На семінары прысутнічалі прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскага аб'яднання БелТІЗ, Міністэрства працы і сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, бібліятэкары, прадстаўнікі выдавецтваў і паліграфічных прадпрыемстваў краіны.

Падчас зацікаўленай размовы былі прадэманстраваны сучасныя выданні для інвалідаў па зроку і тэхнічныя магчымасці для далучэння людзей, якія слаба бачаць, да багатай духоўнай спадчыны. Амаль фантастычнае па сённяшнім часе абсталяванне, якое прадастаўляе неабмежаваныя магчымасці доступу да інфармацыі, маецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Машыну са сканерам, якая дапамагае ў працы, ўжо назвалі "Кнігалюб". Прынцып яе дзейнасці надзіва просты: сканіруецца тэкст, і старонкі кнігі выводзяцца на экран-дысплей. Тэкст можна павялічваць да 72 разоў. Калі ў чалавека дрэнны зрок, пры такім павелічэнні, натуральна, літары і словы ён зможа прачытаць. Акрамя таго, машына-камп'ютэр умее чытаць тэксты ўголас: яна распазнае тры мовы: рускую, англійскую і нямецкую. Такім чынам, праз навушнікі можна праслухаць любы літаратурны твор, які вас зацікавіў.

Сучасныя тэхналогіі толькі ўкараняюцца ў жыццё. Машыны нямецкай фірмы, на жаль, не адаптаваныя да беларускай мовы, і вялікі фонд айчынных дакументаў пакуль застаецца недасягальным для чытача з аслабленым зрокам. Але што самае цікавае: наш БДУІР прадставіў сваю распрацоўку па аналагу нямецкага абсталявання. Яна будзе таннейшая і, магчыма, па-сапраўднаму беларуская: зможа, нарэшце, чытаць і беларускамоўныя тэксты.

Зразумела, ад кніг, напісаных і аддрукаваных шрыфтам Брайля, адмаўляцца пакуль нельга, таму што такая літаратура неабходна для вучобы і адукацыі. Асабліва ж незаменныя друкаваныя кнігі, калі патрэбна мець пры сабе навукова-выверанны, дакладны тэкст. Ёсць і кнігі, выдадзеныя ўзбуйненым шрыфтам — яны таксама запатрабаваны. Але відавочна: ва ўсіх буйных бібліятэках, калі адкрыецца такая магчымасць, будуць ствараццa спецыялізаваныя месцы для абслугоўвання інвалідаў па зроку.

Ірына ТУЛУПАВА

Майстра слова

Мікола Мятліцкі і ў звыклай нашай будзённшчыне гаворыць, як быццам піша высокамастацкі твор: вобразна, эмацыйна, прачула, надзвычай шчыра. Яго выразны густы барытон кожнае слова на хаду адточвае да люстранога бляску.

І піша ён, як гаворыць: проста, зразумела, адухаўлёна і таму надзвычай даходліва.

Можа, таму ўдаецца яму перадаць з такой паднябеснай дакладнасцю нашы зямныя перажыванні і турботы. Выказаць тое, што ў душы кожнага неабыякавага да лёсу Айчыны чалавека трапечацца тонкім камертонам, настроеным менавіта на чалавечую — калі пакутніцкую, калі місіянерскую, калі лірычна-сардэчную — хвалю.

Вечарыны

Сакратару Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, галоўнаму рэдактару часопіса "Полымя", старшыні Рады таварыства "Беларусь — Славакія", вядомаму паэту і перакладчыку Міколу Мятліцкаму — пяцьдзесят пяць гадоў. На вечарыну з гэтай нагоды прыйшлі літаратары, грамадскія дзеячы, сябры і паплечнікі паэта, літаратуразнаўцы, выкладчыкі і студэнты ВНУ, супрацоўнікі Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, дэпутаты Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. А распачала сустрэчу цудоўным лірычным чытаннем верша "Не выстыла памяць..." народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч.

Згадкі пра жыццё і творчасць, шматкроць паўтораныя старонкі жыццёвага лёсу М. Мятліцкага люстравалі асобу аўтара ў шырокай плыні сучаснага літаратурнага працэсу. Найперш — як таленавітага паэта другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзяў. І — як галоўнага рэдактара аднаго са старэйшых літаратурных часопісаў Беларусі — "Полымя". Не зусім спрыяльныя часы былі ў літаратуры, калі Мікола Міхайлавіч узначаліў часопіс. І вывеў яго да сённяшніх абсягаў, да тых тыражоў і папулярнасці, якая ёсць. За сем гадоў праклаліся да часопіса шматлікія творчыя сцяжынкі, памножылася кола аўтараў.

З трыбуны гучалі вершы М. Мятліцкага ў выкананні артыстаў Беларускага тэатра драматургіі, сустрэчу аздаблялі выступленні народнага фальклорнага гурта "Гасцінец" Ракаўскага сельскага Дома культуры, залу прэзентацый упрыгожвала выстаўка мастацкіх твораў Івана Семілетава (унука Івана Мележа). Святлана Лобач выканала песню "Дзівасіл", на словы М. Мятліцкага. Чытаў вершы і сам паэт. Прыязна сустрэлі слухачы ягоныя прысвячэнні Марыі Захарэвіч, Алесю Савіцкаму, Міхасю Міцкевічу, Аляксею Сцепаненку, услухваліся ў пранікнёныя радкі — добра вядомыя беларускаму чытачу і зусім новыя.

Як вядома, не адзін твор М. Мятліцкі прысвяціў сваёй малой радзіме, вёсцы Бабчын Хойніцкага раёна, якую пахавалі пасля Чарнобыльскай трагедыі, і тым мясцінам, якія яго вывелі ў людзі. Народная артыстка Рэспублікі Беларусь Марыя Захарэвіч згадала расповед юбіляра пра тое, як ён пісаў і чытаў гэтыя вершы сярод людзей, якіх адрывалі ад хат са страшэнным галашэннем: бо хавалі цэлую вёску, а не аднаго чалавека. Вершы тыя гучалі непаўторным рэквіемам усім хатам і паселішчам, якіх бязлітасна паядае стронцый.

Паводле трапнага назірання пісьменніка Алеся Савіцкага, менавіта з кнігі "Бабчын. Кніга жыцця" (1996), за якую Мікола Міхайлавіч атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь, і пачаўся новы паэт Мікола Мятліцкі — маштабны, умелы, удумліва-свядомы, прызванне якога — апяваць Радзіму, чалавека і яго добрыя справы на гэтай зямлі.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: Міколу Мятліцкага віншуе Міхась Міцкевіч; выступае народны фальклорны гурт "Гасцінец".

Фота Кастуся Дробава

Дзень добры, Казахстан!

Сувязі

Яшчэ зусім нядаўна пісьменнікі і выдаўцы Казахстана гасцявалі на традыцыйным кніжным кірмашы ў Мінску, а вось ужо трэці нумар вядомага на постсавецкай прасторы літаратурна-мастацкага часопіса "Простор" выходзіць з "беларускім сшыткам".

Зразумела, што такі праект рыхтаваўся загадзя. І ён — толькі частка тае працы, што рэалізоўваецца зараз Саюзам пісьменнікаў Беларусі і рэдакцыйна-выдавецкай установай "Літаратура і Мастацтва" па прапагандзе айчыннай літаратуры ў свеце. Расказвае рэдактар аддзела паэзіі часопіса "Простор" Любоў Шашкова, між іншым, наша зямлячка, ураджэнка Гомельшчыны:

— На мой погляд, сучасная беларуская літаратура ў сакавіцкім нумары аўтарытэтнага казахстанскага часопіса прадстаўлена досыць сур'ёзнымі творамі і імёнамі. У паэтычным раздзеле — вершы Уладзіміра Карызны, Віктара Гардзея, Васіля Макарэвіча, Міхася Пазнякова, Віктара Шніпа. Спадзяюся, чытач з прыемнасцю адкрые для сябе творы і тых паэтаў Беларусі, якія пішуць па-руску: Валянціны Паліканінай, Валерыя Грышкаўца, Анатоля Аўруціна. А з апавяданнямі выступаюць Алесь Бадак, Леанід Левановіч, Міхась Пазнякоў, Ніна Маеўская, Анатоль Андрэеў, Сяргей Трахімёнак, Наталля Касцючэнка. Будзем чакаць, як на мастацкія адкрыцці нашых беларускіх калег адрэагуе чытач. І, магчыма, такія праекты стануць добрай традыцыяй.

Восенню мінулага года ў Мінску гасцявалі і Любоў Шашкова, і вядомы ў Казахстане літаратуразнаўца Святлана Ананьева. Яны ўдзельнічалі ў форуме "Культурная спадчына ў дыялогу традыцый", які быў арганізаваны Пасольствам Рэспублікі Казахстан у Беларусі пры ўдзеле Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, а таксама Саюза пісьменнікаў Беларусі. Святлана Ананьева расказвае пра гэтую сустрэчу навукоўцаў і літаратараў у артыкуле "Форум у Мінску".

...З Казахстанам звязаны лёсы многіх і многіх пісьменнікаў Беларусі. Згадаем імёны хаця б Пятра Бітэля, Рыгора Барадуліна, Іосіфа Васілеўскага, Яўгена Васілёнка, Іосіфа Дорскага, Сямёна Дорскага, Кліма Грыневіча, Алега Ждана, Сяргея Зайцава, Рыгора Бярозкіна, Фёдара Куляшова, Янкі Маўра, Яўгена Радкевіча і шмат каго яшчэ. У Казахстане пахаваны Змітрок Бядуля. Несумненна, будуць напісаны яшчэ новыя і новыя старонкі ў стасунках літаратурнага пабрацімства дзвюх багатых культур, двух багатых і адкрытых для дружбы народаў.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Рэвю тыдня

Свята кнігі ў кінатэатры

У Магілёве ўрачыстае адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі адбылося ў кінатэатры "Радзіма". Зала, у якой сабраліся вучні малодшых класаў, была цалкам запоўнена, што не дзіўна: бібліятэкі горада наведваюць больш як 35 тысяч юных чытачоў. Тыя з іх, каму пашчасціла патрапіць на традыцыйнае кніжчына свята, сталі гледачамі цікавага тэатралізаванага прадстаўлення з вершамі і песнямі, галоўнымі героямі якога былі, вядома ж, сама Кніга і, бадай, самы папулярны беларускі літаратурны персанаж — славутая купалаўская Паўлінка.

Да юных магіляўчан на адкрыццё Тыдня з Мінска прыехалі пісьменнікі Алесь Бадак, Міхась Пазнякоў і Наталля Касцючэнка. Яны пазнаёмілі ўдзельнікаў свята са сваімі творамі, а лепшым чытачам дзіцячых бібліятэк горада — Аліне Кавалёвай, Паўлу Фядосу, Дзіяне Махоркінай, Ірыне Шасцярні, Кацярыне Лазаравай, Данілу Мачалаву, Вераніцы Храмцовай — падарылі кнігі з аўтографамі. Хто ведае, можа пройдзе няшмат часу, і гэтыя імёны стануць шырока вядомыя ўсёй краіне. Не апошнюю ролю ў тым адыграе менавіта Яе Вялікасць Кніга, магчымасці якой у выхаванні чалавека і станаўленні яго як асобы па-ранейшаму вельмі вялікія. Тым больш, што, як пераканаліся госці, наведаўшы шэраг магілёўскіх бібліятэк, аматараў прыгожага пісьменства, у тым ліку, айчыннага, у горадзе сапраўды шмат. І тут, між іншым, ахвотна чытаюць выданні РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Алесь МАЛІНОЎСКІ

Ад «Маладосці» завіталі ў госці

Часопіс "Маладосць" як рэспубліканскае літаратурна-мастацкае выданне для моладзі даволі плённа адзначыў тыдзень дзіцячай і юнацкай літаратуры. 18 сакавіка ў мінскай дзіцячай бібліятэцы № 15 адбылася творчая сустрэча з Раісай Андрэеўнай Баравіковай, вядомай пісьменніцай, галоўным рэдактарам "Маладосці". Арганізатарам выступіла дырэктар установы Ала Аўласенка. Супрацоўнікі бібліятэкі адмыслова для гэтай сустрэчы падрыхтавалі мастацкую частку, прысвечаную Яе Вялікасці Кнізе, чым выклікалі шчырае захапленне ў аўдыторыі — вучняў малодшых класаў. Раіса Баравікова, знаная паэтэса і празаік, таксама вядомая як аўтар дзіцячых кніг — "Казкі астранаўта. Касмічныя падарожжы беларусаў", "Казкі з гербарыя" і многіх іншых, распавяла маленькім чытачам пра свае новыя творчыя задумы, адказала на шматлікія пытанні. 26 сакавіка пісьменніца выступіла ў Дзяржаўным мінскім медыцынскім каледжы, з якім Раісу Андрэеўну звязвае даўняе творчае сяброўства.

19 сакавіка мінскую бібліятэку № 12 наведала Віка Трэнас, рэдактар аддзела паэзіі "Маладосці". Творчая сустрэча з супрацоўніцай часопіса была зладжаная Людмілай Навасельскай, дырэктарам бібліятэкі, а таксама Валянцінай Барцовай, выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 130. Вучні сёмага класа мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца як з самім выданнем, на старонках якога дзякуючы рубрыкам "Упершыню ў "Маладосці", "Мы — маладыя", "Першацвет" штомесяц з'яўляюцца цікавыя творы дэбютантаў у галіне паэзіі і прозы, адкрываюцца новыя імёны будучых пісьменнікаў, так і з сучасным літаратурным працэсам.

Вікторыя ЛЯЙКОЎСКАЯ

Я свет спазнаю...

У канцы сакавіка ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя Максіма Горкага прайшоў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі "Я свет спазнаю з кніжнай старонкі...". За тыдзень адбыліся сустрэчы з пісьменнікамі Алесем Карлюкевічам, Аленай Масла, Людмілай Рублеўскай, Генадзем Аўласенкам, а таксама прэзентацыя дзіцячых кніг рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва". Прайшлі імпрэзы з нагоды дзён нараджэння дзіцячых пісьменнікаў Івана Сяркова, Міхася Лынькова, Ірыны Токмакавай, Кіра Булычова.

Павел РАДЫНА

З-пад пяра

У рамках правядзення Дзён грэчаскай культуры ў нашай краіне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае святочнае мерапрыемства "Под небом Греции Священной...". Яно прымеркавана да Дня незалежнасці Грэцыі (вызваліць краіну ад чатырох стагоддзяў асманскага іга ўдалося падчас нацыянальнага паўстання 1821 года).

На адкрыцці Дзён гучала нацыянальная грэчаская музыка, выступілі танцавальны ансамбль "Белыя крылы" Цэнтра мастацкай творчасці навучэнцаў горада Маладзечна і юныя грэкі — лаўрэаты рэспубліканскіх конкурсаў. У часе мерапрыемства адбылося адкрыццё выстаўкі мастакоў Ірыны Гілеп і Паўла Дзімітрыядзі, а таксама экспазіцыі фотаматэрыялаў з выявамі нацыянальных касцюмаў, музычных інструментаў, партрэтамі герояў нацыянальна-вызваленчага руху Грэцыі 1821 — 1833 гадоў.

У гонар нацыянальнага свята Беларускае грамадскае аб'яднанне грэкаў "Пелопоннес" прэзентавала Нацыянальнай бібліятэцы 25 кніг па гісторыі і культуры Грэцыі.

Застаецца дадаць, што арганізатарамі мерапрыемстваў выступілі Беларускае грамадскае аб'яднанне грэкаў "Пелопоннес", Пасольства Грэцыі ў Расіі, міністэрствы культуры, адукацыі і Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Ул. інф.

У бібліятэцы № 1 г. Маладзечна адкрылася персанальная выстаўка палотнаў старэйшага маладзечанскага мастака Кастуся Харашэвіча. Кастусю Іванавічу ўжо 81 год. Не так даўно выйшла яго аўтабіяграфічная кніга "Зведанае і перажытае" і быў выдадзены каталог яго твораў "Старонкі жыцця і творчасці".

Яго першыя карціны былі сюжэтна-тэматычнымі: "Паўстанне нарачанскіх рыбакоў", "Выступленне Браніслава Тарашкевіча перад сялянамі Заходняй Беларусі"... Цяпер гэтыя творы сталі літаральна хрэстаматыйныя. У бібліятэцы ж прадстаўлены работы, прысвечаныя хараству родных мясцін ("Старое месца", "Вілія", "Ля царквы"), і серыя партрэтаў ("Янка Купала", "Язэп Драздовіч").

Кацярына ТАРАСЕВІЧ

Да 20 красавіка ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі будзе працаваць персанальная выстаўка Віктара Сафроненкі "Скарбніца мудрасці". Усе, хто прыйшоў учора на яе ўрачыстае адкрыццё, атрымалі яскравыя ўражанні не толькі ад саміх вырабаў народнага майстра, але і ад яго падзвіжніцкай дзейнасці па прапагандзе народнай творчасці. Першую частку выстаўкі, названую "Залатыя рукі Майстра", складаюць больш як 200 непаўторных твораў з дрэва: дэкаратыўныя кампазіцыі, мэбля і свяцільнікі, разнастайны посуд, біжутэрыя — з карэльскай бярозы, дубу, вольхі, ясеню. Другая частка ("Залатое пяро майстра") — дакументальны расповед пра В. Сафроненку як аўтара шматлікіх публікацый і 25 кніг, некаторыя з якіх неаднойчы перавыдаваліся. Выпускнік колішняга БПІ В. Сафроненка ўзнагароджаны знакам "Ганаровы будаўнік", а за самабытнае мастацтва, якое захапляе і замежных спажыўцоў, ён прыняты ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці.

С. ВЕТКА

Аўтарскаму калектыву дзесяцітомнага выдання “Беларусы” Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прысуджана прэмія “За духоўнае адраджэнне” 2008 года. Першы том гэтага выдання выйшаў у 1995 годзе, а апошні — у 2008-м. Трынаццаць гадоў сур’ёзнай і грунтоўнай працы.

Карэспандэнт “ЛіМа” сустрэўся з Аляксандрам ЛАКОТКАМ, членам-карэспандэнтам НАН Беларусі, доктарам архітэктуры, прафесарам і доктарам гістарычных навук, дырэктарам ІМЭіФ імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі.

Хто мы, беларусы?

— Выданне выспявала на працягу многіх гадоў. Такая праблематыка была актуальная ўжо на пачатку XX ст., калі будавалася наша нацыянальная дзяржаўнасць. Таму нам папярэднічала вядомая трохтомная праца Я. Карскага “Беларусы”, але яна датычыла больш лінгвістычных, мовазнаўчых складнікаў і асобных нацыянальных прыкмет. Адна ж з галоўных мэт сённяшняга выдання — навукова абгрунтаваныя адказы на пытанні: “беларусы — адкуль мы?”, “у чым наша адметнасць?”, “паходжанне, матэрыяльная і духоўная культура”.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны такія даследаванні былі актуальнымі яшчэ і таму, што на хвалі патрыятычнага ўздыму адным з напрамкаў была ідэя стварэння новай гістарычнай супольнасці савецкага народа. Думалася, што такая супольнасць стане квяцістым калейдаскопам нацыянальных культур. Былі спробы адлюстравання гэтай ідэі нават музейнымі сродкамі. Яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя на тэрыторыі ВДНГ рабіліся выставы, дзе ладкаваліся сядзібы калгаснікаў з розных рэгіёнаў СССР. А ў 60-я гады была прапанавана ідэя стварэння ўсесаюзнага музея архітэктуры і побыту на Клязьмінскім вадасховішчы пад Масквой, куды збіраліся перавезці экспанаты з розных рэспублік.

— Скажыце, Аляксандр Іванавіч, грунтуючыся толькі на “Беларусах” Я. Карскага, пэўна ж, немагчыма было стварыць такое выданне? Напрыклад, у XIX ст. у цыкле “Жывапісная Расія” выйшаў цэлы том, прысвечаны “Літоўскаму і беларускаму Палессю”...

— Шмат было прац. Трэба пачаць з Паўла Шпілеўскага, нашага даследчыка, краязнаўца і фалькларыста, яго падарожжа па Палессі і беларускім краі. Вялікі ўклад у накапленне матэрыялаў зрабілі даследчыкі Андрэй Меер (“Апісанне Крычаўскага графства”, канец XVIII ст.), Аніміле (“Быт беларускіх сялян”, першая палова XIX ст), а таксама вядомыя даследчыкі фальклору і этнаграфіі Шэйн, Нікіфароўскі, Сержпутоўскі, археолаг і знаўца беларускай даўніны Сапуноў. Вельмі шмат аўтараў. Пасля з’яднання беларускіх зямель з Расійскай імперыяй, гэтай, новай, часткай імперыі даследчыкі займаліся вельмі грунтоўна. Варта нагадаць падарожжа Севергіна і Ляпёхіна па Падзвінні і Падняпроўі, дзе быў сабраны самы разнастайны этнаграфічны матэрыял. Кіраўнік Віленскай вучэбнай акругі Бацюшкаў шмат зрабіў па зборы звестак пра помнікі даўніны на тэрыторыі сённяшняй Беларусі. Гэты працэс накаплення матэрыялу налічвае два стагоддзі.

З нагоды распрацоўкі канцэпцыі новай гістарычнай супольнасці, літаральна ва ўсіх рэспубліках СССР былі распачаты тыя ці іншыя этнаграфічныя даследаванні, пачалася работа па стварэнні рэгіянальных этнаграфічных атласаў. У рамках падрыхтоўкі атласаў (70—80-я гг. XX ст.) былі напісаны грунтоўныя этнаграфічныя працы, напрыклад, “Народная сельскагаспадарчая тэхніка”, “Беларускае народнае жыллё”, “Беларускі народны касцюм”, вядомы даследчык Васіль Бандарчык напісаў “Гісторыю беларускай этнаграфіі” ў трох тамах. Да гэтага была кніжка М. Грынблата “Беларусы”, дзе таксама разглядаліся складаныя пытанні па этнагенезе, этнічнай гісторыі беларусаў. Нарэшце, у пачатку 90-х выходзіць вядомая энцыклапедыя “Этнаграфія Беларусі”. Усё гэта складае тыя навуковыя крыніцы і карані, якія сталі базай для напісання новай фундаментальнай працы. А канкрэтнай падставай з’явілася тое, што са стварэннем маладой незалежнай Беларускай дзяржавы пытанне пра паходжанне беларускага народа і перспектывы развіцця яго нацыянальнай культуры стала вельмі актуальным. Трэба было на ўзроўні новых ведаў адказаць на яго. Тым больш, што ў канцы 70-х і ў 80-я гады ішлі гарачыя спрэчкі пра паходжанне і рассяленне ўсходніх славян: “Быў ці не быў балцкі субстрат?”

— Скажыце, калі ласка, а ваш інстытут якой думкі прытрымліваецца? Адкуль мы, славяне? Прыйшлі аднекуль з Праіндыі, з Дуная, ці нашы тасячагадовыя карані знаходзяцца тут?

— Зразумелая справа, што не лічыцца з гістарычным фактам рассялення ўсходніх славян — ненавукова. З’яўленне гэтай працы дало адказ і на пытанне “балцкага субстрата”, з аднаго боку, і на пытанне “калі склаўся беларускі народ” — з другога. Гэта адносна маладая этнічная супольнасць, якая бярэ свае карані ад рассялення ўсходніх славян, дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў, ад Кірылы Тураўскага і Еўфрасінні Полацкай. З гэтых старажытнарускіх каранёў нарэшце ў XIV—XVI стст. і складваецца беларуская нацыя. Што вельмі важна ў гэтай спрэчцы: калі там узніклі беларусы? Вядома, што ў летапісах першае ўпамінанне пра Белую Русь адносіцца да канца XIII ст. Прычым цікава, што недзе ў рэгіёне, адкуль бяруць пачатак тры ўсходнеславянскія і ўсходнееўрапейскія ракі — Заходняя Дзвіна, Волга і Дняпро — ўпершыню і ўпамінаецца назва *Белая Русь*. І ў XIV ст. ва ўмовах іншага палітычнага стасунку складваюцца кампаненты, неадлучныя ў паразуменні этнасаў і народаў: беларуская мова, яе дыялектныя напрамкі, матэрыяльная і духоўная культура, паразуменне тэрыторыі, паразуменне тых ці іншых рэгіёнаў (Палессе ўжо сустракаецца на заходнееўрапейскіх картах). Самасвядомасць. Асаблівасці фальклору. Мы не ведаем крыніц фальклору, якія адносяцца да больш ранніх часоў, чым гэты перыяд. Сукупнасць названых прыкмет дае падставы гаварыць, што ў гэты перыяд склалася беларуская народнасць ці, проста кажучы, па-сапраўднаму — народ, які меў сваю тэрыторыю, мову, матэрыяльную і духоўную культуру, свае карані. Дзесяць тамоў прысвечаны распрацоўцы гэтай праблемы і раскрываюць багацце матэрыяльнай і духоўнай народна-традыцыйнай культуры, уяўляючы сабою завершаны цыкл.

— Аляксандр Іванавіч, на вашым стале бачу і адзінаццаты том. Калі ласка, коратка ахарактарызуйце кожны з тамоў, каб нашы чытачы маглі ўявіць сабе аб’ём зробленай працы.

— *Першы том* прысвечаны промыслам і рамёствам. Нездарма менавіта з гэтай тэмы пачалася серыя — пра гаспадарчыя рамёствы, пра тыя бакі дзейнасці, якія на першых этапах фарміравання матэрыяльнай культуры беларусаў мелі істотнае значэнне. Паляўніцтва, рыбалоўства, бортніцтва. Рэдкія віды промыслаў — паташны, ардашны, буды, гуты, рудні...

Другі том — дойлідства і архітэктура — ахоплівае іх развіццё на працягу тысячагоддзя, пачынаючы ад храма Святой Сафіі Полацкай. Галоўная ідэя тома — архітэктура Беларусі ўяўляе сабой гістарычны феномен, які склаўся на хвалі сінтэзу будаўнічых культур Усходу і Захаду Еўропы. У выніку з’явіліся нацыянальныя асаблівасці беларускай архітэктуры, якія ўспрымаюцца ў еўрапейскім кантэксце як нацыянальная адметнасць і сімвалізуюць Беларусь як краіну і народ і ў часы Вялікага княства, і ў XVIII — XIX стст. і на сучасным этапе. Я не буду пералічваць славутыя палацава-паркавыя комплексы, абарончыя збудаванні тыпу Белай вежы. Тут і сімвалы, звязаныя з вобразам сучаснай Беларусі: з праспектам Незалежнасці, з Домам урада, помнікам Перамогі, будынкам НАН і сучаснымі будынкамі — чыгуначным вакзалам, Нацыянальнай бібліятэкай і інш.

Трэці і чацвёрты тамы раскрываюць усе тэорыі і канцэпцыі паходжання беларускага народа як народа маладога, як народа са славянскай гісторыяй, як народа, які сёння бачыцца цэнтрам усходнеславянскай кансалідацыі. Выпрацаваныя стагоддзямі традыцыі добразычлівых і братэрскіх адносін беларусаў з іншымі народамі і народнасцямі з’яўляюцца добрым вопытам. Асабліва ў час сутыкнення цывілізацый, распаўсюджання масавай культуры.

Пяты том — “Сям’я”. Тут раскрыты традыцыі сямейнага побыту, якія грунтуюцца на павазе да бацькоў, на працавітасці і клопаце пра старэйшых, пра дабрабыт і сямейнае шчасце. Сёння гэта надзвычай актуальна. Крызісныя з’явы, дэмаграфічныя праблемы спараджаюць эклектычныя, псеўдасямейныя саюзы. Дарэчы, апошні час паказаў, што людзі згуртоўваюцца і вяртаюцца да традыцыйнай сям’і. У традыцыйнай сям’і закладзена аснова згуртаванасці нацыі і народа.

Шосты і сёмы тамы прысвечаныя грамадзянскім традыцыям. Грамадскія сувязі ў вёсцы, у горадзе, каляндарныя, абрадавыя святы — словам, усё, што вякамі вызначала наша адзінства.

Восьмы том прысвечаны дэкаратыўна-прыкладному мастацтву: вышыўка, строі, кераміка, пляценне з саломкі, кавальства і інш.

Дзевяты том — “Антрапалогія” і *дзесяты* — “Славянскія этнакультурныя традыцыі ў кантэксце сусветнай культуры”. Апошнія тры тамы, якія ствараюцца, — “Музыка”, “Кіно” і “Тэатр” — у дзесяцітомны цыкл не ўваходзяць.

— Зразумела, што ўвесь калектыў інстытута працаваў над выданнем. Але, можа, хацелі б назваць прозвішчы асобных супрацоўнікаў?

— Над гэтымі тамамі працаваў калектыў усяго інстытута на працягу многіх гадоў. Найбольш вызначыліся тыя з аўтараў, хто распрацоўваў канкрэтныя напрамкі і рыхтаваў асобныя тамы. Да такіх людзей трэба аднесці Галіну Каспяровіч, Таццяну Кухаронак, Любоў Ракаву, Валянціну Бялявіну, Яўгена Сахуту, Ігара Чаквіна, Аляксандру Гурко — яны рупліва і ў найбольш значным маштабе працавалі над гэтым выданнем.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

На здымку: А. Гурко, Г. Каспяровіч, Я. Сахута, А. Лакотка, В. Бялявіна, І. Чаквін, Л. Ракава, Т. Кухаронак.

З-пад крыла

Саюз пісьменнікаў Беларусі, Мінскае гарадское і абласныя пісьменніцкія аддзяленні праводзяць вялікую работу сярод моладзі па выяўленні талентаў. З мэтай выхавання юных талентаў пры рэдакцыях раённых і абласных газет, бібліятэках, палацах культуры і вышэйшых навучальных установах ствараюцца і дзейнічаюць літаратурныя аб’яднанні ды гурткі, ладзяцца конкурсы і вечары паэзіі, прозы, на старонках перыядычных выданняў друкуюцца лепшыя творы аўтараў-пачаткоўцаў. Сёння рэдакцыя штотыднёвіка “Літаратура і мастацтва” дае магчымасць выказацца па гэтай тэме кіраўніку Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміле Кебіч.

Самым важным кірункам у дзейнасці Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі з’яўляецца работа з творчай моладдзю, тым больш, што Прынёманскі край заўсёды быў вельмі багаты на маладыя таленты ў галіне літаратуры і мастацтва.

Пры пісьменніцкім аддзяленні працуе кансультацыйны пункт, куды юнакі і дзяўчаты амаль штодзень прыносяць свае творы, атрымліваюць заўвагі і парады па іх удасканаленні ад вопытных пісьменнікаў. У мінулым годзе, напрыклад, па літаратурную дапамогу звярнуліся 70 чалавек. Як вынік — найбольш адметныя творы пачаткоўцаў пабачылі свет у абласной газеце “Гродзенская праўда” на старонцы “Літаратурныя акцэнты”. Дарэчы, творы некаторых маладых аўтараў з’явіліся сапраўдным адкрыццём года.

Праца з найбольш здольнымі да літаратурнай дзейнасці маладымі людзьмі вядзецца таксама ў гуртку “Сугучча”, які створаны пры абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі. Кіруе ім член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт і педагог Фёдар Чычкан. Па сутнасці, гурток працуе як вочна-завочная школа. Юныя таленты дасылаюць сюды свае творы, прыязджаюць і прыходзяць на пасяджэнні, што адбываюцца два разы на тыдзень, удзельнічаюць у мерапрыемствах і конкурсах, разам з кіраўніком рыхтуюць літаратурную старонку для інфармацыйна-пазнавальнай газеты “Дворцовские вести”, якая выходзіць кожны месяц. Выдадзены таксама зборнік вершаў гурткоўцаў.

Кожны год сярод вучнёўскай і працоўнай моладзі ладзіцца конкурс рускай паэзіі ў намінацыях “Паэзія” і “Малая проза”. Узроставыя катэгорыі ўдзельнікаў — да 18 гадоў і ад 19-і да 30-і. У мінулым годзе конкурс праводзіўся сумесна з гарадскім грамадскім аб’яднаннем“БРСМ”. Чацвёра з яго пераможцаў паедуць ў г. Брэст на штогадовы рэспубліканскі фестываль рускай паэзіі, дзе прымуць удзел у конкурсе маладых паэтаў і празаікаў, а іх творы будуць надрукаваныя ў літаратурным альманаху.

Выяўленне таленавітай моладзі адбываецца і падчас штогодніх абласных алімпіяд школьнікаў па беларускай мове і літаратуры, якія праводзяцца ўпраўленнем адукацыі аблвыканкама і Гродзенскім дзяржуніверсітэтам імя Янкі Купалы і ў праграму якіх уваходзяць абавязковыя сустрэчы ўдзельнікаў алімпіяды з пісьменнікамі Гродзеншчыны.

Наладжана сувязь з літаратурнымі аб’яднаннямі навучальных устаноў і бібліятэк, у якіх працуюць літаратурныя гасцёўні і гурткі (каледж мастацтваў, філіял бібліятэкі № 10, СШ № 28, медуніверсітэт і інш).

Арганізоўваюцца таксама аўтарскія вечары маладых творцаў. Так, у мінулым годзе ў гродзенскай гімназіі № 5 прайшла прэзентацыя творчасці маладых талентаў з горада Ліды — брата і сястры, Васілісы і Яраслава Пазнуховых. Яны пішуць вершы, празаічныя творы, вядуць літаратурную перадачу на лідскім радыё.

Думаецца, што “з-пад крыла” Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ на шырокі паэтычны прасцяг хутка выляцяць новыя паэты. У прыватнасці, Марыя Цітарчук і Дзмітрый Радзівончык рыхтуюць да выдання свае ўжо другія кнігі вершаў.

Людміла КЕБІЧ,
старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ

Жыццё перад мікрафонам

Голас Алега Вінярскага добра знаёмы слухачам беларускага радыё: насычаны прыемны барытон, добрае вымаўленне, пазнавальная інтанацыя. Радыёспектаклі, інсцэніроўкі, праграмы кшталту "Помні імя сваё", нават рэкламныя паведамленні вельмі часта гучаць у эфіры яго голасам. Сёння Алег ВІНЯРСКІ — госць "ЛіМа".

— У чым спецыфіка радыёвядучага? Чым, напрыклад, акцёр тэатра і кіно адрозніваецца ад артыста, які агучвае тэксты ў радыёэфіры?

— У кожнага акцёра сваё разуменне ролі радыёвядучага, сваё ўяўленне пра іх маюць і радыёслухачы. Я належу да тых людзей, якія любяць радыё за камернасць і сардэчнасць, за яго спакойны тон. Самая галоўная рыса вядучага — не абвастраць жарсці. Радыёвядучы павінен мець у сабе гэткую якасць, каб кіраваць слухачом. Мала мець голас і цудоўную дыкцыю, хаця гэта таксама важная акалічнасць у маёй прафесіі. Для радыёвядучага неабходна і такая якасць, якая істотна адрозніває яго ад тэлевядучага, ад вядучага на эстрадзе ці канферансье, вядучага літаратурных вечароў, карпаратываў... Адным словам, радыёвядучы павінен валодаць абсалютным слыхам, не толькі музычным, але і слыхам на фальш, на неінтэлігентнасць, слыхам на грубасць. І адфільтроўваць у сабе гэтыя адчуванні, аддаючы слухачу чысты прадукт. Эфір нельга засмечваць.

— Радыёслухач не бачыць вядучага. Усё яго ўяўленне пра тое, што адбываецца ў эфіры — толькі голас і інтанацыя.

— Цалкам згодны. Якраз старыя майстры вучылі аднаму: ствараць са слоў малюнак. Калі на тэлебачанні мы бачым карцінку, то на радыё павінны жывапісаць словам і стварыць яе ва ўяўленні слухача.

— Раней на Беларускім радыё была рэдакцыя літаратурна-драматычных праграм. Кожны дзень некалькі гадзін эфіру адводзілася мастацкаму вяшчанню: радыёспектаклі, пастаноўкі, літаратурныя чытанні, сустрэчы з пісьменнікамі... Радыёэфір быў своеасаблівай мастацкай трыбунай. Што з літаратурна-мастацкага вяшчання прапануе радыё беларускаму слухачу сёння?

— Мы не можам параўноўваць часы. Вельмі многае за апошні перыяд памянялася. І ў адносінах да літаратуры — таксама. Цяпер розумам людзей валодаюць новыя пісьменніцкія імёны, надышоў, пэўна, час масавай культуры. Мы ж з табой маем на ўвазе сур'ёзную літаратуру, якая кранае праблемы душы, сацыяльныя праблемы чалавека, які трапіў у абставіны выжывання ці экстрэмальныя ўмовы. Масавы слухач (асабліва моладзь) цяпер не патрабуе сур'ёзнай літаратуры. І гэта сумна. Я прыхільнік добрай класічнай літаратуры, якая нясе чалавеку акрэсленыя паняцці гармоніі, маральных каштоўнасцей, якія цяпер знікаюць, але ж чалавек павінен захаваць у сабе добрае, нягледзячы ні на якія часы.

Бываюць "пустыя" гадзіны радыёэфіру, бясколерныя, сярэднія, дзе для прозы, паэзіі не знаходзіцца месца. Тым не менш, літаратура павінна прамаўляць сваё слова. На першым канале, на жаль, яна прадстаўлена не ў тым аб'ёме, які патрэбны чалавеку інтэлігентнаму і высокадухоўнаму. Праўда, у нас засталіся праграмы, дзе гавораць пра беларускую літаратуру. Ёсць добрыя фонды. Не хапае публіцыстычнасці і пісьменніцкага слова. Я спадзяюся, прыйдуць часы, (і яны не за гарамі!) калі мы зноў пачуем на першым канале высокае мастацкае слова, як гэта было раней, калі аўдыторыя выхоўвалася па радыёперадачах з малых гадоў. Людзі раслі і сталелі разам з радыё. Яно прымушала іх думаць, было добрым выхавацелем і тым госцем у хаце, для якога заўсёды знаходзілася пачэснае месца.

Чалавек выхоўваўся на сваёй літаратуры, мастацтве, на сваёй народнай культуры. Трэба, каб гучалі нашы традыцыйныя беларускія песні, выступалі майстры слова савецкай і постсавецкай эпохі.

— Ці не шкадуеш, што ў свой час не "прыбіўся" да якога-небудзь драматычнага тэатра? Не сумуеш па тэатральных падмостках?

— Для мяне адно служыць суцяшэннем: я адкрыў для сябе на радыё новы тэатр — радыётэатр. Я б не змог адкрыць яго на тэатральных падмостках, не змог бы столькі перачытаць і пражыць, як перад мікрафонам. У звычайным тэатры прэм'еры расцягваюцца на гады, а мы гэта робім у вельмі абмежаваны прамежак часу. Можам два тыдні рэпеціраваць, затым запісваем спектакль, манціруем і — у эфір. Гэта канцэнтруе чалавека. Каб настроіцца і прачытаць, напрыклад, урывак, мне патрэбна менш часу, чым драматычнаму акцёру. Хаця ведаю шмат выканаўцаў, якія прывыклі ўжо да радыё. Але, на жаль, на сённяшні дзень адсутнічае пераемнасць радыёмайстэрства. Чаму? Таму што раней вялі перадачы, напрыклад, народныя артысты Савецкага Саюза і Беларусі. Яны добра ведалі, што гэта выключная школа майстэрства, не проста дыкцыі, а школа гутаркі са слухачом. Больш за тое: чуюць артыста, значыць, ён жывы як акцёр. Мільёны слухачоў ведаюць іх толькі па перадачах радыё.

Не ўсе, як вядома, могуць трапіць у сталічны тэатр. На мой погляд, трэба, каб малодыя акцёры не саромеліся — ішлі на радыё вучыцца. Калі ж перарвецца ланцужок пераемнасці, мы не зробім задзелу на будучыню. Не стане новых радыёмайстроў. Такім чынам, роля рэжысёраў на радыё — адфільтроўваць адораных людзей і паказваць ім лепшыя ўзоры творчасці. Няхай яны атрымаюць у нас не надта вялікія грошы, але іх душа набудзе каштоўны акцёрскі вопыт: чалавек сутыкнецца з цудоўным літаратурным матэрыялам, папрацуе ў студыі перад мікрафонам, навучыцца ствараць вобразы. Наогул жа, мастацтва радыё яшчэ да канца не вывучана. Яно, як і мультыплікацыя, мае шырокі дыяпазон і ў часе, і ў прасторы, можа закранаць самыя непрыкметныя парыванні душы.

Адным словам, працуючы на радыё, я нічога не страціў. За гэты час шмат прачытана і класічных старонак сусветнай літаратуры, і беларускай. У прыватнасці, на радыё прагучала ўся трылогія Мележа, прачытаны ўсе раманы Караткевіча, за выключэннем "Хрыстос прызямліўся ў Гародні". Нядаўна закончыў чытанне на канале "Культура" эпапеі Яраслава Гашака "Прыгоды бравага салдата Швейка". Слухачы званілі, дзякавалі за выбраны твор. Яраслаў Гашак піша, што гэта той сціплы герой, якога мы не заўважаем і які ўмее цвярозым розумам раскласці ўсё па паліцах, адрозніць белае ад чорнага, умее знайсці сцяжынку да кожнага сэрца. Таму што ён ведае людзей, у яго не зашораны погляд і ён, як дзіця, адкрывае свет. Швейк разумее, што чалавека трэба шкадаваць, што кожны годны свайго месца.

Як ні парадаксальна, для мяне Швейк — гэта цалкам ціхамірны і лагодны чалавек. Ён з усім пагаджаецца, гаворачы: "Так, канечне, вы лепшыя за мяне". Але ж гэта зборны вобраз якраз таго Івана-дурня з беларускіх народных казак, які і прынцэсу возьме замуж, і паўцарства атрымае, і будзе кіраваць каралеўствам.

— Скажы, Алег, цябе па голасе не пазнаюць, напрыклад, у трамваі ці аўтобусе?

— Не здаралася. Ды і не патрэбна мне гэта. Самае галоўнае, калі ўзнікае кантакт са слухачом, калі атрымліваеш тэлефонны званок, ці прыходзіць чалавек і кажа: "Ведаеш, гэтая праграма мне штосьці адкрыла". У сэрцы слухача павінна нешта зрушыцца. І калі гэта здараецца, то задаволены і я. Як у таго ж Баратынскага, які жыў з Пушкіным у адну эпоху. Слава Пушкіна распаўсюджвалася па ўсёй Расіі. Але паэт заўважыў талент Баратынскага, і пісаў, што чалавека трэба неяк падтрымаць... Неабавязкова дамагацца народнага прызнання, важней тое, што дзесьці здзейснілася адкрыццё ў сэрцы чалавека, — і ўжо кантакт адбыўся. І калі такое здараецца, гэта вышэйшая ўзнагарода.

— Неаднойчы Алег Вінярскі рэалізоўваў сябе ў якасці рэжысёра. Якія з новых праектаў асабліва запалі ў душу?

— Перш за ўсё, я па прафесіі — рэжысёр. Хаця многія мяне ведаюць па дыктарстве. Рэжысура — гэта мая любімая прафесія. Тое, што я выпрабаваў пры запісе спектакляў і падрыхтоўцы праграм, дае магчымасць выявіць сваё грамадзянскае пачуццё. Мы разам з аўтарам і артыстам спрабуем знайсці тыя адметныя кропкі, пра якія трэба гаварыць цяпер. Зыходзім з таго, што чалавек жывы, пакуль у яго баліць душа, пакуль ён можа пакутаваць, а не пагаджаецца са злом і з тым, што адбываецца вакол. Зараз мая рэжысура зводзіцца да таго, што я займаюся падрыхтоўкай аўтарскіх чытанняў. Трэба знайсці музыку, вызначыцца са стылістыкай твора, выявіць ідэю: дзеля чаго? Гэта ўсё робіцца, падкрэсліваю, у жывым эфіры! Я не ведаю, ці ёсць на постсавецкай прасторы падобныя эксперыменты. Гэта сур'ёзнае выпрабаванне для акцёра. Магчыма, у Беларусі гэта адзінкавы эксперымент.

Антось ПЕРАГУД

Знаёмцеся — «Галіяфы»!

Зміцер ВІШНЁЎ нарадзіўся ў 1973 годзе, вывучаў філалогію і журналістыку ў Мінску і Маскве. Адзін з заснавальнікаў выдавецтва "Галіяфы". Піша вершы, прозу, крытыку, займаецца жывапісам і перформансам. Аўтар кніг: "Штабкавы тамтам" (1998), "Тамбурны маскіт" (2001), "Трап для сусліка, альбо Некрафілічнае даследаванне аднаго віду грызуноў" (2002), "Фараон у заапарку" (2007) і іншых.

Удзельнік шматлікіх міжнародных літаратурных фестываляў і кангрэсаў.

— Афіцыйная назва вашага выдавецтва — "Галіяфы". Яно адносна маладое. Прыватнае і камерцыйнае. Вядомыя і яго арганізатары — Зміцер Вішнёў і Міхась Башура. Раскажыце, Зміцер, пра гісторыю яго стварэння.

— Ну, па-першае, калі прыватнае — не значыць камерцыйнае. Што я маю на ўвазе? Наша выдавецтва працуе не столькі дзеля грошай, колькі дзеля аўтарытэту культурнай прасторы. Усё ж утварылі яго не зусім "левыя" людзі ў мастацтве, а прафесійныя літаратары.

Наколькі выдавецтва маладое? З пункта гледжання атрымання ліцэнзіі — немаўля. Але з пункта гледжання выдавецкага досведу — мы старыя-Хатабычы (смяецца. — **А.К.**). Міхась Башура і я — у гэтай сферы шмат гадоў. Варта адзначыць, што "Галіяфы" ўтварыліся не на пустым месцы а на базе кніжнай серыі "Другі фронт мастацтваў", што была заснавана ажно ў 2000-м годзе! Таму вакол выдавецтва атабарылася шмат таленавітых аўтараў.

— Кніга — прадукт даволі спецыфічны: патрафіш густу чытача, ён купіць яе, не спадабаецца — застанешся сам-насам са сваімі выдаткамі. На чым будуецца ваша рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць?

— Мы пакуль не зарабляем вялікіх грошай. Выдавецтва трымаецца на энтузіязме ягоных заснавальнікаў. Тым не менш мы не друкуем абы-што. Кожная кніга праходзіць праз сіта рэдакцыйнай калегіі, куды ўваходзяць паважаныя і вядомыя літаратары. Мы арыентуемся на мастацкія вартасці твора — гэта наш асноўны крытэрый.

— Зміцер, вы неяк сказалі, што распачалі серыю выданняў беларускай фантастыкі? Што выйдзе ў бліжэйшы час у гэтай серыі?

— Так, мы распачынаем "Калекцыю беларускай фантастыкі". Першае выданне з'явіцца неўзабаве — "Анамалія" Алеся Бычкоўскага. Затым рыхтуецца да выхаду ў свет кніга Сержа Мінскевіча "Сад замкнёных гор". Серыю афармляе малады і таленавіты мастак, дызайнер Юры Круглікаў. Наколькі мне вядома, да сённяшняга часу аніводнае беларускае выдавецтва ўсур'ёз не займалася распрацоўкай гэтай важнай прасторы ў айчынным пісьменстве. Усе мне вядомыя праекты ў гэтай галіне былі досыць дробнымі і разавымі — яны не вытрымалі выпрабаванне часам. Спадзяюся, што новая серыя будзе добрым падарункам для аматараў фантастыкі.

— Кнігі выдаюцца толькі на роднай мове? Усё-ткі беларускамоўны чытач нешматлікі. Магчыма, для камерцыйнай устойлівасці друкуюцца і кнігі на рускай мове?

— Мушу не пагадзіцца з пазіцыяй пра нешматлікасць беларускамоўнага чытача. Практыка сведчыць, што добрая кніга на роднай мове вельмі запатрабаваная. У Беларусі неабавязкова мова дыктуе сітуацыю з продажам кніжнай прадукцыі. Ёсць беларускамоўныя творы, якія маюць вялікі попыт. Таму няварта спасылацца, ды скардзіцца на нашага чытача.

На вялікі жаль, мы пакуль недастаткова добра арганізавалі сетку рэалізацыі сваёй прадукцыі — нашы кнігі ёсць толькі ў крамах Мінска і Мінскай вобласці. Але думаецца, гэта часовая праблема. Разам з тым, мы ні ў якім разе не ігнаруем рускамоўнага. Але прыярытэтнымі ў нашым выдавецтве з'яўляюцца менавіта беларускамоўныя тэксты.

— Што перашкаджае працы выдаўца? З якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца?

— Нястача сродкаў. І заімшэласць некаторых чыноўнікаў.

— Як аўтару можна звязацца з выдавецтвам?

— У выдавецтве ўжо з'явіўся мадэратар сайта — паэт Зміцер Плян. Таму ўсю інфармацыю можна адшукаць на нашым сайце.

Падрыхтаваў Антон КУДЛАТЫ

Фантастыка ў драматургіі для дзяцей

На сучасным этапе развіццё дзіцячай драматургіі ідзе сцежкамі, у многім дагэтуль не асвоенымі майстрамі гэтай літаратурнай дзялянкі. Чыннікам сталі не толькі шпаркія тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу, але і новыя тэндэнцыі ў культурнай сферы ў цэлым. П'еса для дзяцей, нягледзячы на ўзроставую скіраванасць, сваімі канцэптуальнымі катэгорыямі — перадусім канфлікту і характару — адлюстравала ўплывы на мастацкі дыскурс, зрэагавала на з'яўленне новых актуалій як у жыцці грамадства, так і ў светапоглядах падрастаючай генерацыі. Як адзначае Славяна Шамякіна, "своеасаблівым далейшым развіццём літаратуры казачна-фантастычнага характару можна лічыць фэнтэзі".

Зразумела, што ў сілу моцнай і трывалай традыцыі, чым характарызуецца беларускае мастацтва наогул, наватарства ў прадукаванні п'ес для дзяцей не стала дамінантай, аднак пашырыла драматургічныя далягляды і аўтарскія магчымасці, дынамізавала творчы працэс у гэтым кірунку. Новае дыханне адкрылася ў жанры казкі, маркіраванне формаў якой набыло самы шырокі спектр. Прычым кідаецца ў вочы тэндэнцыя да мадэрнізацыі гэтага жанру. П'еса для дзяцей, калі можна так сказаць, асучасніваецца. Назіраецца кантамінацыя класічных казачных матываў з рэаліямі дня сённяшняга, а часам і перавага апошніх. Вобразы таксама часта ўяўляюць сплаў архетыпічных рысаў са штрыхамі сучаснікаў.

Яскравым і паказальным прыкладам з'яўляецца "камп'ютэрная гульня ў сцэнічным увасабленні ў дзвюх дзеях (паводле беларускіх народных казак, з элементамі фантастыкі)" "Шкляныя горы, альбо Праграміст Чароўнай даліны" Р. Баравіковай (2004). У ёй традыцыйныя казачныя элементы "рэжысёрам" гэтай гульні заменены аналагамі сучаснай рэчаіснасці: дыван-самалёт — лятаючай талеркай, вірмяк-невідзімец — кавалкам нябачнай віртуальнай прасторы, чароўны клубочак — мабільным тэлефонам, голка, ад якой залежыць жыццё Кашчэя-Несмяротнага, — лазерам. Пратаганіст Іван-Знайдзён са "звыклага фальклорнага персанажа" Праграмістам пераўвасабляецца ў маладзёна, які быццам бы "толькі што збег з нейкай сучаснай маладзёжнай тусоўкі". Фактычна з героем адбываюцца тыя ж прыгоды, што і ў звычайных чарадзейных казках: лёс яго разлучае з дзяўчынай, і ён вымушаны перамагчы злую сілу, каб вярнуць каханую. Толькі казачныя дзеянні адбываюцца ў кантэксце зусім непрывычнага антуражу. Напрыклад, Кашч-Несмяротны жыве не ў якім-небудзь дрымучым лесе, а ў космасе, у халоднай і змрочнай Галактыцы. Бадай, адзіным, хто застаецца ў сваім звыклым абліччы, з'яўляецца стары Лесавік, якога можна разглядаць як захавальніка колішняй культуры і традыцый. Акрамя таго, вобраз згаданага Праграміста выглядае як мінімум неардынарна: за ім бачыцца свайго роду alter-ego аўтара — Р. Баравіковай, якая такім чынам зрабіўшы сябе прататыпам, адшукала месца ў кантэксце свайго твора, а не па-за яго тэкстуальнымі рамкамі.

Цікавым досведам у драматургіі З. Дудзюк стаў зварот да элементаў замежнай культуры: у фантастычнай п'есе "Сінязорка" (1995) сквапны агрэсар Кароль Краіны катумаў заваёўвае мірную Краіну вудэнаў з мэтай злавіць іх чароўную птушку Сінязорку, якая дае вечнае жыццё і шчасце. Вудэны змагаюцца за сваю зямлю, але іх сілы саступаюць магутнасці каралеўскіх робатаў. Толькі развязка прынесла расчараванне Каралю і яго акружэнню: Сінязорка аказалася ім непадуладнай, бо створаная яна ў казках і песнях мірнага, працалюбівага народа, ажыўлена яго марамі. Тым не менш яна, паводле п'есы, з'яўляецца большай рэальнасцю, чым Кароль і прыдворныя, якія нібыта напханыя найгоршымі чалавечымі якасцямі, — такім алегарычным чынам дэкларуецца вяршэнства дабра ў свеце.

Таксама прыгодніцкі жанр мае п'еса Т. Мушынскай — фантастычная казка "Калі прыляцелі іншапланецяне" (2008). Але, калі не лічыць падняцця экалагічнай праблемы, у ёй няма канфлікту. У творы праводзяцца паралелі паміж жыхарамі зямлі і прышэльцамі: аказваецца, у іх характарах шмат агульнага (у дзяцей тыя ж інтарэсы, у бацькоў тоесныя клопаты). Зямляне на фоне братоў па розуму з далёкай планеты, якая ў свой час пацярпела катастрофу і дзе цяпер нічога не расце, павінны быць шчаслівымі і шанаваць сваю зямлю, яе прыродныя багацці, — такі лейтматыў п'есы, ад якой вее, шчыра кажучы, тэорыяй бесканфліктнасці: няма не тое што сутыкнення супрацьлеглых характараў, няма ўвогуле характараў, больш-менш акрэсленых у мастацкім плане.

Моманты людской адчужанасці, якія праяўляюцца ў кантэксце навукова-тэхнічнага развіцця, знайшлі адбітак у памастацку гіпербалізаваным выглядзе ў "трылеры для дзяцей і дарослых" П. Васючэнкі з назвай, якая ілюструе амбівалентнасць сённяшняга людскога свету, — "Кацярынка і Кэт" (2007). Драматург канструюе ў творы сучаснае жыццё, якое перастала быць натуральным. Нават людзі становяцца схематычнымі і прагматычнымі, як машыны. Кацярынка, у якой наперадзе заканчэнне школы і шляхі дарослага чалавека, рыхтуецца бацькамі да такой будучыні. Іх падрыхтоўка не стасуецца з яе шчырай, яшчэ не забітай аксіялогіяй дарослых псіхікай, якая прагне не зносінаў з ідэалізаваным светам Сімулякрыі, а звычайнага прыроднага цяпла, без якога сучаснага чалавека можна лічыць абдзеленым: "Беднасць — гэта нашая адзіната", — словы доктара, якія так і засталіся незразумелымі бацькамі, фактычна замбіраванымі стэрэатыпамі і канонамі спажывецкага грамадства. Можна сказаць, што П. Васючэнка на прыкладах сваіх персанажаў адлюстраваў адну з мадыфікацый адвечнага канфлікту бацькоў і дзяцей, што спарадзіў стан цывілізацыі дадзенага этапа развіцця. Аднак Кацярынка дзякуючы Рыгорку знаёміцца з натуральным светам, у якім жыве Апошні Дзед. Яна ўсё ж не вытрымлівае ўмоў механізаванага і штучнага свету. Развязка, якой паспрыяў анёл у абліччы цацкі-сімулякра, пакідае яе разам з Рыгоркам у свеце сапраўднага жыцця. А бацькам замест Кацярынкі застаецца яе дакладная копія з Сімулякрыі, Кэт — увасабленне "правільнай" дзяўчынкі. Такім чынам, аўтар абазначае безальтэрнатыўнасць вяртання жыцця людскога на кругі свае, чарговай гуманізацыі чалавека, перад якім паўстала зараз дылема, якую прадбачылі яшчэ паўстагоддзя таму: "надо гуманизироваться или погибнуть".

Як бачна, многія фантастычныя п'есы аб'ядноўваюць перасцяражэнне ад згубных для жыцця шляхоў, на якіх па-за ўвагай застаецца тое, на чым жыццё фактычна і трымаецца, — чалавечнасць, любоў, дабрыня, без якіх інтэлект нічога не варты. На старонкі гэтых драматургічных казак выходзяць новыя героі: на змену фальклорным (ці стылізаваным пад фальклорнасць) персанажам (лепей сказаць, у дадатак да іх) з'явіліся вобразы з элементамі, знаёмымі дзецям па іх паўсядзённым жыцці. З іншага ж боку, антураж казкі (хоць і асучасненай) не нівеліруе іх арыгінальнасці і незвычайнасці. Дый адвечны канфлікт паміж дабром і злом асвяжыўся новымі сюжэтнымі перыпетыямі. Такім чынам, на прыкладах цікавых сюжэтаў і запамінальных персанажаў маладыя чытачы знаёмяцца з магчымымі наступствамі прагрэсу, вынікамі чалавечага розуму, калі сам чалавек забываецца не толькі пра наваколле, але і пра сябе.

Ці не ўсе фантастычныя п'есы для дзяцей беларускіх аўтараў спалучаюць у сабе як традыцыі, так і наватарства. Першае выяўляецца, безумоўна, у канфлікце, ад класічнасці якога — супрацьстаяння дабра і зла — увогуле складана пазбавіцца драматургіі, а таксама — у характарах, якія па-ранейшаму вывяраюцца гуманістычнымі каштоўнасцямі.

Развіццё фантастычнай п'есы-казкі, прыкладаў якой яшчэ параўнаўча няшмат у нашай літаратуры, не толькі разнастайвае беларускую дзіцячую драматургію, але і адкрывае новыя далягляды для яе існавання на літаратурнай ніве, робіць чарговую падказку творцам пра магчымасці і казкі, і п'ес для дзяцей увогуле.

Анатоль ТРАФІМЧЫК

Пра «Куфэрак Віленшчыны», № 13

Часопіс "Куфэрак Віленшчыны", які выходзіць з кастрычніка 2000 года ў залежнасці ад паступлення матэрыялаў і фінансавай дапамогі (выдае краязнаўца і пісьменнік Міхась Казлоўскі), даўно палюбіўся чытачам.

Публікацыі ў часопісе ў асноўным прысвячаюцца краязнаўству, фальклору, гісторыі, этнаграфіі, прапагандзе творчасці мясцовых паэтаў і празаікаў. Арыентуецца часопіс на чытацкую аўдыторыю Астравецкага, Ашмянскага, Смаргонскага раёнаў Гродзенскай вобласці і Валожынскага, Вілейскага, Маладзечанскага, Мядзельскага Мінскай, якія раней уваходзілі ў Віленскую губерню.

Кожны чарговы нумар прысвячаецца пэўнай гістарычнай асобе або роду Віленшчыны. Так, першы нумар прысвечаны краязнаўцу і пісьменніку Генадзю Каханоўскаму, пяты — пісьменніку Пятру Бітэлю, які зведаў усе жахі сталінскіх лагераў і пераклаў там на беларускую мову паэму Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш", шосты — народнаму песняру Янку Купалу...

І вось трынаццаты нумар "Куфэрка Віленшчыны" прысвечаны вядомаму драматургу, аўтару такіх знакамітых п'ес, як "Папараць-кветка" і "Над хвалямі Серабранкі", Івану Козелу.

Нарадзіўся Іван Васільевіч Козел 21 мая 1928 года ў вёсцы Канчаны Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Канчанскай школе, затым — у Маладзечанскай сярэдняй школе № 1 імя Янкі Купалы. Паступіў у Мінскі медыцынскі інстытут, але праз нейкі час яго пакінуў. Потым працаваў настаўнікам у розных школах. Адначасова скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Працаваў у інстытуце педагогікі Міністэрства асветы БССР, рэдактарам Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, старшым рэдактарам Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР. У 1969 годзе скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве.

Пісаў Іван Козел таксама вершы, апавяданні, артыкулы. З вялікай любоўю ён ставіўся да творчасці Максіма Багдановіча, пра якога часта гаварыў, што "гэта не зорка, а цэлая планета беларускай літаратуры". Як драматург пачаў выступаць з 1957 года. Урывак з ягонай п'есы "Папараць-кветка" быў упершыню надрукаваны ў газеце "Літаратура і мастацтва" 16 кастрычніка таго ж года.

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваюцца яго п'есы "Свежы вецер", "Любоў не за грошы", "Цяжар кахання", "Краіна фарбаў", а таксама пераклад камедыі А. Астроўскага "Свае людзі — памяркуемся".

Памёр драматург Іван Козел 30 студзеня 1970 года. Мяне, аўтара гэтых радкоў, вельмі радуе, што я часта сустракаўся з Іванам Козелам, добра ведаў яго. Мне часта ўспамінаецца той далёкі 1960 год, калі працаваў у калгасе трактарыстам. Неяк з'ездзіў у маладзечанскую газету, прысутнічаў там на літаб'яднанні, чытаў сваё новае апавяданне, і мне там добра перцу падсыпалі.

Неўзабаве пасля гэтага я і сустрэў Івана Козела — драматурга, які ў той час выкладаў у Ермакоўскай школе беларускую мову і літаратуру.

— Чаго пацямнеў, як хмара? — спытаў Іван Васільевіч, паціскаючы руку. — Усё за сваё "Будзем жыць", што на пасяджэнні чытаў, перажываеш? Пільнуйся, браток, сюжэта, і над словам працуй, без добрага мудрага слова не толькі апавядання не напішаш, але і заметкі звычайнай.

Іван Васільевіч усміхнуўся, і яго добрая адкрытая ўсмешка, як доўгачаканы прамень, развеяла ўсе мае сумненні.

Добра памятаю, што якраз тады паказаў мне Іван Козел часопіс "Маладосць", у якім была надрукавана яго п'еса "Папараць-кветка". Праўда скардзіўся, што без яго дазволу рэдакцыя скараціла цэлую старонку твора.

У 13-м нумары "Куфэрка Віленшчыны" надрукаваны аповед сына драматурга — Аляксандра Козела "З расказа маёй маці". Паэт Віктар Шніп прысвяціў драматургу "Баладу Івана Козела". Надрукаваны тут і артыкул Міхася Казлоўскага "У пошуках папараць-кветкі".

З вялікай цікавасцю чытаюцца ў часопісе і такія матэрыялы, як "Маці ўсё жыццё чакала свайго сына" Сяргея Чыгрына, "Новыя лісты дарогі" Сяргея Цімошкі, "Па хвалях маёй памяці" Віталя Гарановіча, "Лекарка" Лідзіі Гардынец, "Вяртанне ў далёкую маладосць" Ганны Новікавай, "Музычны канвалют" Людкі Сільновай.

Янка ГАЛУБОВІЧ

Кніжная паліца

У выдавецтве "Харвест" пры "Бібліятэцы Саюза пісьменнікаў Беларусі" выйшла ў свет кніга вершаў і паэм **Людмілы КЕБІЧ** *"Непераможны колер охры"*. Чарговы зборнік аўтаркі, як сказана ў анатацыі, *"прасякнуты шчымлівым лірызмам прадчуванняў надыходзячай восені і звязаных з ёю непазбежных расчараванняў... Адсюль і фанічная афарбоўка твораў — непераможна-жоўтая, але ўсё ж светлая, охра"*.

У выдавецтве Логвінава выйшла кніга ***"Наша страва"*** (сапраўдная беларуская кухня). *"Гэта не зусім звычайная кулінарная кніга. Нарысы, якія ўвайшлі ў яе, пісаліся ўкладальнікам, а потым і яго сябрамі, на працягу дзевяці гадоў. Яна не прэтэндуе быць поўнай. (...) Але асноўныя стравы, што калісьці былі неад'емнай часткай штодзённага побыту нашых продкаў, вяртаюцца з нябыту — у нашу свядомасць і на нашы сталы"*, — зазначае ў сваёй прадмове **Алесь БЕЛЫ** (ён жа ўкладальнік).



У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь выйшла кніга гістарычных дакументаў і матэрыялаў *"Увековечивание памяти защитников Отечества и жертв войны в Беларуси" (1941—2008)*. Складальнікі: У. Адамушка, Н. Калеснік, В. Селяменеў, В. Скалабан, В. Шумскі.

Сумесна — у аўстрыйскім Грацы і ў Мінску — выдадзены аб'ёмны навуковы зборнік з дванаццаці артыкулаў аўстрыйскіх, беларускіх і расійскіх гісторыкаў і юрыстаў *"Австрийцы и судетские немцы перад советскими военными трибуналами в Беларуси. 1945—1950 гг."*. Гэта першая праца, як у справе супрацоўніцтва аўстрыйскіх і беларускіх даследчыкаў, так і ў адносінах да канкрэтнай тэмы. Выданне выйшла пад рэдакцыяй **Стэфана КАРНЕРА** і **Вячаслава СЕЛЯМЕНЕВА**.

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла ілюстраваная кніга-альбом **Барыса КРЭПАКА** *"Владимир Товстик. Ладья Времени"*. Кніга распавядае пра жыццё і творчасць вядомага таленавітага беларускага мастака, заслужанага дзеяча мастацтва Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзіміра Тоўсціка, які змог у сваіх карцінах ярка і натхнёна адлюстраваць складаныя маральныя і эстэтычныя метамарфозы канца XX — пачатку XXI стагоддзяў.

Дыягназ не суцяшае

(палемічныя развагі пра стан сучаснай беларускай літаратуры)

Нямецкі пісьменнік, крытык празмернай сентыментальнасці ў мастацтве, Георг Ліхтенберг, сцвярджаў, што "святыя, вылепленыя ў камянях, робяць большую справу, чым жывыя". Марная справа спрачацца з аўтарам шматлікіх знакамітых афарызмаў, але, на маю думку, "святыя" таксама былі некалі зямнымі людзьмі і сваю "святасць", вядома, пры наяўнасці розных станоўчых якасцяў, набывалі пры жыцці, хоць, як тое часта бывае, зразуметымі сталі толькі пасля сваёй смерці. Я гэта да таго, што "святасць", калі гэтае паняцце разумець у патрэбным сэнсе, — праца сённяшняга дня, а не прывіднай далёкай перспектывы, а таму, каб пакінуць пасля сябе хоць нешта значнае, працаваць на гэта мы павінны ўжо сёння.

Мінулае стагоддзе было даволі-такі плённым для маёй краіны на ніве беларускай літаратуры ды і ўвогуле ўсяго мастацтва. Пералічваць знакавых таленавітых асоб няма патрэбы, — прозвішчы гэтыя на слыху. Мяне ж больш турбуе, які след у мастацтве і ўвогуле ў гісторыі краіны пакіне маё пакаленне літаратараў?

Адзін з рускамоўных маіх знаёмых, адукаваны і выхаваны чалавек, часта даводзіць мне, што, маўляў, ваша беларуская літаратура гэта ўсяго толькі —міф, яе не існуе ў прыродзе. Што ж, гэта яго асабістая думка. А нам застаецца толькі спрачацца і пераконваць гэтага самаўпэўненага чалавека. Напрыклад, так: наша літаратура — маладая яшчэ ў кантэксце сусветнай, але нават за той, непрацяглы па памеры, прамежак часу яна дасягнула пэўных вышынь, стала пазнавальнай. Але на мае, не зусім пераканаўчыя довады, у знаёмага падрыхтаваны адказ: "Я жыву тут і зараз, і мяне хвалююць не перспектывы, а сучаснасць.". Безумоўна, я не настолькі катэгарычны ў сваіх высновах, як ён, але спрачацца з ім робіцца мне ўсё цяжэй. Так, перыяд 1990 —2000-х гадоў я назваў бы для нашай літаратуры застойным, а калі больш дакладна, гэты перыяд амаль што выпадае з айчыннага творчага працэсу. Мякка кажучы, ён не стаў такім плённым і адметным, як папярэдні, а таму, пэўна, нам і пахваліцца сёння асабліва няма чым. Разумею, што гэтыя мае думкі спрэчныя, а таму дазволю сабе вольнасць паразважаць на гэтую тэму. Спадзяюся, што мяне ніхто не закідае камянямі за банальнае выказванне, што нібыта пісьменнік, калі ён сапраўдны, павінен апярэджваць час? А што насамрэч маем мы? Сучасных творцаў, імёны якіх на слыху, можна пералічыць на пальцах. Гэта тыя ж Казько, Разанаў, Някляеў, Станкевіч, Арлоў, з маладзейшых — Федарэнка, Наварыч, Казлоў, з яшчэ больш маладзейшых — Хаданові, а далей хто? Давайце на хвілінку задумаемся і паспрабуем назваць творы вышэйзгаданых намі аўтараў, якія, на наш погляд, сталі за апошнія дваццаць гадоў адкрыццём для нашай літаратуры, якія б маглі прэтэндаваць на права застацца актуальнымі і ў недалёкай будучыні. Безумоўна, статыстыка — рэч небяспечная і вы папракняце мяне ў гэтым, нагадаўшы, што, маўляў, час усё вырашыць, але... Вы так і не адказалі на маё пытанне. Агучце, калі ласка, свае падлікі? Зноў той жа Быкаў, Шамякін... А я не пра іх пытаюся. Назавіце мне творы сучасных аўтараў. Ага, усё ж дзесятак вы здолелі назваць і апраўдалі гэты свой мізэрны спіс тым, што для такой маленькай краіны, як наша Беларусь, гэтага цалкам дастаткова. А вось я з такім вашым падыходам не згодны, і вам, перад тым, як спрачацца са мной, раю наведаць хаця б некалькі школ. Зайдзіце ў любы дзесяты клас і задайце маё пытанне вучням. Вы жахнецеся ад пачутага. Вы нават і не ўяўляеце сабе, наколькі ўсё кепска у нас з гэтай статыстыкай.

Кнігарні я наведваю перыядычна. І кожны раз, накіроўваючыся туды, як у храм, цешу сябе надзеямі і спадзяваннямі, а вяртаюся адтуль зняверaным і з сапсаваным настроем. Твораў рускіх аўтараў там на любы густ, а беларускіх — дзесятак, не больш, але і тыя, пераважна заляжалыя, "не першай свежасці". У большасці сваёй гэта буклеты, прысвечаныя мясцовым краявідам, а яшчэ — танюсенькія зборнічкі паэзіі з некалькімі вокладкамі. Скажыце, хіба здольныя яны зацікавіць нас, чытачоў, сваімі тэкстамі, калі яны нават знешнім выглядам нас не прываблiваюць? Не адкрыю вялікай таямніцы, калі скажу, што на мове ўвогуле цяпер мала людзей чытае і не таму, што не разумеюць яе, а таму, што чытаць няма чаго. Памятаеце, як няпроста ў свой час было набыць "Крыніцу", якую рабіў Някляеў? А разыходзіўся гэты часопіс так імгненна таму, што яму было чым зацікавіць свайго чытача і не толькі пачаткоўца-літаратара, але і настаўніка. Надрукавацца ў "Крыніцы" пад адной вокладкай з такімі знакамітасцямі, як Шарль Бадлер ці Фрыдрых Дзюрэнмат, было за вялікі гонар. А што мы маем сёння? Што, нельга рабіць такія ж цікавыя і прафесійныя часопісы? Зразумейце мяне правільна, я не пераконваю вас у тым, што ў нас няма годных творцаў, наадварот. На маю думку, мы проста не жадаем заўважаць іх. Мы друкуем сябе любімых. Нашто змяняцца, калі лепей так, як ёсць. Здаецца, нешта і робіцца, а вынікаў — ніякіх. Чытаеш сучасную, "амбіцыйную", як модна цяпер называць яе, паэзію і дзіву даешся. Чалавек, які бессаромна называе сябе паэтам, не ведае самага простага, што такое рыфма, рытм, сэнс. Яго творы пазбаўлены ўсяго гэтага, але затое ён выдатна арыентуецца ва ўсіх тонкасцях класічнай усходняй паэзіі і выдае нагара дзесяткі "перлаў". Ён не ведае і не хоча ведаць, што нам, славянам, як бы мы да таго ні імкнуліся, ніколі не спасцігнуць ні таго рытму, ні таго рэха Усходу, якія, як трапна выказаўся адзін з французскіх крытыкаў, "чэрпаюць сваю глыбіню з паветра, з настальгіі і меланхоліі". Інтуіцыя, а не свядомасць нараджае паэзію, і ўсё штучнае, ўсё, што не мае душы, — мёртвае. Але замест таго, каб займацца працаю ўнутры мовы, мы ствараем нешта "хайканутае". І ўсё дзеля таго, каб быць сучаснымі і арыгінальнымі. Галоўнымі лірычнымі героямі пераважнай большасці вершаў па-ранейшаму застаюцца ўсё тыя ж бедакі-буслы, якія, каб маглі, даўно заклявалі б нас да смерці за адно толькі гэта. Колькі разоў на дзень не паўтарай: "Гапееў", але пра сучасныя выхаваўчыя праблемы маладога пакалення дагэтуль яшчэ не напісана. Ну хоць забіце мяне, але не стане ніхто з сучасных вучняў чытаць гэтае "чытво", не іх моваю яно напісана. Такога не бывае, каб яйкі вучылі курыцу, а героі аповесці спадара Гапеева не па ўзросце разумныя, ды і правільныя яны нейкія, занудлівыя.

Кнігарні я наведваю перыядычна. І кожны раз, накіроўваючыся туды, як у храм, цешу сябе надзеямі і спадзяваннямі, а вяртаюся адтуль зняверaным і з сапсаваным настроем. Твораў рускіх аўтараў там на любы густ, а беларускіх — дзесятак, не больш, але і тыя, пераважна заляжалыя, "не першай свежасці". У большасці сваёй гэта буклеты, прысвечаныя мясцовым краявідам, а яшчэ — танюсенькія зборнічкі паэзіі з не кідкімі вокладкамі. Скажыце, хіба здольныя яны зацікавіць нас, чытачоў, сваімі тэкстамі, калі яны нават знешнім выглядам нас не прываблiваюць?

Часта даводзіцца браць удзел у розных літаратурных сустрэчах і вечарынах, якія ладзяцца са студэнтамі і школьнікамі. Там такога наслухаешся, што сорамна робіцца. Паслухайце толькі, якія "творы" прапануюць сваім слухачам некаторыя мясцовыя паэты:

Увайдзі ў СПК
"Агра-Моталь",
На ферме кампутарны век.
Працуюць тут з песняй,
з ахвотай.
У пашане... у нас чалавек
Цэх рыбны,
каўбасны і хлебны... і г. д.

Пагадзіцеся, жахліва! Але ўсё гэта друкуецца, выдаецца. І ў той жа час, колькі намаганняў трэба прыкласці, каб выдацца таленавітаму чалавеку з правінцыі. Я памятаю, з якімі складанасцямі і цяжкасцямі сутыкнулася тая ж Ярына Дашына, калі рыхтавала да друку сваю першую кніжку паэзіі. Каб не настойлівыя намаганні кіраўніцтва абласной бібліятэкі, каб не дапамога тых жа калег са сталіцы, яе "Графіці на сэрцы" так і засталіся б марай. Вынікі гавораць самі за сябе. Наведайце любую кнігарню і паспрабуйце набыць яе зборнік, а выдаваўся ён не малым накладам.

"Так было заўсёды", — скажаце вы. Магчыма, але не зразумела тады, чаму так атрымліваецца? Гартаючы свежаспечаныя кніжачкі некаторых "амбіцыйных" аўтараў, я сумна ўсміхаюся: "Няўжо ў нашай краіне недахоп талентаў?". Чытаю ўступныя артыкулы да гэтых новых "шэдэўраў" і знаходжу там столькі кампліментаршчыны, што ў самы час "букераў" ім усім раздаваць. Не, любыя вы мае, амбіцыйнасць можна дазволіць толькі таленту, але ні ў якім разе не графаману.

Не стаўлю сабе за мэту аналізаваць шматлікія сучасныя літаратурныя "набыткі", гэта тэма для іншай размовы. Лічу, што сапраўдную вартасць большасці з іх вы ведаеце самі. Аднак тэма для разважанняў застаецца адкрытай. Надзея — нешта утапічнае ў нашай сітуацыі...

Алесь ПАПЛАЎСКІ

Па сцяжынах роднай зямлі

Пачатак XXI стагоддзя для берасцейскай пісьменніцы Зінаіды Дудзюк выдаўся надзвычай плённым. У 2002 годзе ў часопісе "Маладосць" была апублікавана яе аповесць-фарс "Пакаранне для Ноны", у 2005 годзе выйшаў з друку гістарычны раман "Год 1812", у тым жа годзе ў часопісе "Маладосць" быў надрукаваны гістарычны раман "Велясіты". У 2006 годзе выйшла з друку кніга "Кола Сварога", у якую ўвайшлі раман-эканструкцыя "Кола Сварога", аповесць-храналограф "Славянскія князі", эсэ "Вандроўкі ў вырай".

Зінаіда Дудзюк вядомая шырокаму колу чытачоў найперш як паэтка. У 1983 годзе пабачыў свет яе першы зборнік вершаў "Праводзіны птушак", за ім — "Абрысы лета", "Так і не", "Табе", "Падданыя кахання".

Апошнім часам З. Дудзюк адчувае патрэбу адлюстроўваць наш складаны і супярэчлівы свет не толькі ў красным пісьменстве. Сама пісьменніца тлумачыць пашырэнне творчага дыяпазону наступным чынам: "Бываюць такія тэмы, якія нельга раскрыць сродкамі паэзіі. Таму і ўзнікла неабходнасць звярнуцца да прозы".

Раман "Кола Сварога" — першая спроба ў беларускай літаратуры аднавіць цэласную сістэму светабудовы, якою яе ўяўлялі нашы далёкія продкі. Ён складаецца з чатырох частак: "Стварэнне свету", "Сварга", "Дажбог", "Багі і людзі". У першай частцы расказваецца пра нараджэнне першага бога Рода, ад якога пайшлі ўсе славянскія багі. Каб Роду не было адзінока, Усявышні паслаў яму жонку Ладу, разам з якой яны стварылі сонца, месяц, аблокі, глебу, кветкі, травы. У другой частцы паказваецца жыццё на першай зямлі — Сварзе, названай гэтак у гонар бога Сварога. Трэцяя частка твора прысвячаецца Дажбогу і яго сыну Калядзе. Яна найбольш звязана з народным календаром, тлумачыць сутнасць шматлікіх абрадаў і звычаяў. Мы даведваемся, чаму людзі святкуюць Каляду, свята восені Багач, адзначаюць Радаўніцу. Чацвёртая частка апавядае пра той час, калі багі яшчэ жылі сярод людзей ці наведвалі іх на зямлі.

На пытанне, што змусіла звярнуцца пісьменніцу да славянскай міфалогіі, З. Дудзюк адказвае, што "міфалагічныя ўяўленні і сюжэты займалі значнае месца ў вуснай фальклорнай традыцыі славянскіх народаў, што пасля адбілася і на развіцці літаратурных сюжэтаў". Тут аўтарка прыгадвае такія імёны, як А. Пушкін, М. Гогаль, А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, У. Караткевіч. "Міфалагічныя персанажы, вобразы і сюжэты неаднойчы пераасэнсоўваліся ў літаратуры. Раман "Кола Сварога" — працяг гэтай традыцыі".

Аповесць-храналограф "Славянскія князі" створана на аснове ўспамінаў, што пакінулі нам старажытныя гісторыкі. У візантыйскіх, арабскіх крыніцах згадваецца, што славяне былі мірным народам, займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, але з-за таго, што на іх пачалі нападаць суседзі, вымушаныя былі абараняцца. Старажытны гісторык Пракопій Кесарыйскі паведамляў, што славянамі не кіраваў адзін чалавек, яны спрадвеку жылі народаўладдзем і таму ў іх шчасце і няшчасце ў жыцці лічылася справай агульнай. Але калі пачалася барацьба з іншапляменнікамі, са славянскага асяроддзя пачалі вылучацца правадыры, якія ўзначальвалі баявыя дружыны. Гэта не выдуманыя героі, а сапраўдныя людзі, пра якіх вельмі мала вядома, але чые імёны дайшлі да нас, дзякуючы мудрасці і адвазе, з якой яны адстойвалі незалежнасць сваіх плямёнаў.

У 2005 годзе выйшаў раман "Велясіты", у якім расказваецца пра жыццё славянскіх плямёнаў на Балканах. Аснову твора складае супрацьстаянне славян і Візантыі. Велясіты пакутавалі ад непамернай уплаты даніны Візантыі, якая з кожным днём павялічвалася, таму што іх княства межавала з імперыяй, і сюды найчасцей прыходзілі ўзброеныя рамеі. У сакавіку 799 г. славянскі князь Акамір наважыўся зрабіць дзяржаўны пераварот і скінуць з пасады імператрыцу Ірыну. Змова была выкрыта, змоўшчыкі схоплены. Каб умацаваць уладу Канстанцінопаля, Базіліса накіроўвае ў Волас узброеных рамеяў, якія абрабавалі горад, схапілі сыноў Акаміра Веляслава і Драгаміра, адвезлі ў Канстанцінопаль і прадалі ў рабства.

Значным дасягненнем беларускай літаратуры з'яўляецца раман Дудзюк "Год 1812", прысвечаны падзеям вайны 1812 года ў Беларусі. Напісаны з гуманістычным пафасам, твор раскрывае адну з драматычных старонак у жыцці нашага народа. У рамане мы бачым яскравыя, па-мастацку выпісаныя карціны ваеннага і мірнага жыцця, мноства каларытна намаляваных персанажаў, розных чалавечых лёсаў. Пісьменніца прапагандуе гуманнае стаўленне да чалавечай асобы. Адсюль праклянце вайне і ўсім, хто яе распачаў. Трагічная і горкая праўда пра вайну і чалавека на вайне выступае як аснова зместу і галоўная праблема, якая па-мастацку даследуецца ў кнізе. Значнасць твору надае і тое, што Зінаіда Дудзюк адлюстравала лёс духавенства, становішча праваслаўных святароў, якіх прымусілі прыняць каталіцтва і прысягу на вернасць Напалеону. Адметнасцю рамана з'яўляецца наступнае сцвярджэнне: вайна 1812 года для Беларусі не была айчыннай. Барацьбу супраць Напалеона нельга назваць нацыянальна-вызваленчай, бо галоўнай мэтай народа было зберагчы сваю маёмасць і сем'і.

Раман Дудзюк "Год 1812" — значны ўклад у беларускую літаратуру. Ён прасякнуты гуманістычным пафасам, непрыманнем вайны, тут закранаюцца важныя агульначалавечыя праблемы, узнімаюцца філасофскія праблемы смерці і сэнсу чалавечага жыцця, а таксама робіцца спроба стварыць у літаратуры вобразы рэальных гістарычных асоб, такіх як Іван Насовіч і Іван Грыгаровіч.

Талент Дудзюк шматгранны і рознабаковы. Яе пяру належаць дакументальныя нарысы "Лясы і лесаводы Брэстчыны", "Гады і людзі", эсэ "Шляхамі адвечнага слова (пра беларускую мову ў кантэксце сусветнай цывілізацыі), трагікамедыя "Бамбавозы", п'еса "Заложнікі шчасця", драматычная паэма "Падданыя кахання" часоў князёўны Ганны Кобрынскай і князя Хведара Бельскага, шмат напісана для дзяцей. На беларускую мову пераклала камедыю Яна Ходзькі "Вызваленая Літва, або Пераход праз Нёман", казку Пятра Яршова "Канёк-гарбунок", нізкі вершаў рускіх і ўкраінскіх паэтаў.

Творчасць Зінаіды Дудзюк прасякнута глыбокай любоўю да роднай Беларусі, яе цікавага і такога складанага мінулага. Пісьменніца імкнецца раскрыць перад чытачом багатую і слаўную гісторыю нашай краіны, абудзіць любоў і павагу да яе.

Ганна ЛЫСАЯ

Ганна МІКЛАШЭВІЧ

Твая усмешка вабіць чысцінёю.
Я веру у вачэй святы наіў.
Маё каханне — шчасце незямное —
Ты не прыдумаў, любы, не прысніў...

Яно жыве вясною і табою,
І вераю у наш святы саюз...
Не быў прывідам і спакуснай мрояй
Наш незямны, шчаслівы летні блюз...

Яно жыве тваім цяплом і песняй.
Душой, якая ўсцешвае здаля...
Пасля зімы
ў прыродзе ёсць прадвесне,
Шчэ не стаіць, а круціцца зямля...

Бо мы жывём надзеяю адною,
Яе у Бога кожны адмаліў...
Твая усмешка вабіць чысцінёю.
Я веру у вачэй святы наіў.

***

Я слухала б песню да самага ранку,
Люляла б мелодыі светлыя зыкі...
Майго неспакойнага лёсу заранка,
Мой сціплы і добры,чароўны музыка.

Я веру у самыя светлыя цуды,
Калі папрашу у нябёс малітоўна,
То самай жаданай мелодыяй буду
І самай прыгожай у свеце князёўнай.

Расквечу твой сон маладой чараўніцай,
Лясной сінявочкай усцешу самоту,
Прыйду ў твае мары адзінай царыцай,
Каб з сэрца твайго адагнаць адзіноту.

***

Ты напрарочыў дваццаць год кахання,
Надзеі, веры ці расчаравання?
Гадзіннік-сэрца шчодрыя хвіліны
Адлічвае, як лёсу пуцявіны.

Куды вядзе сляпая шлях-дарога?
Нямы мой боль прытуліць чысцінёю...
Я не ў людзей прашу, прашу я ў Бога,
Каб наталіўся ты вадой жывою

Вачэй бяздонных, што перад іконай
Струменяць чыстай роснаю слязою,
Любові просяць для цябе штодзённа,
Душы жадаюць міру і спакою.

Каб наталіўся ты вадой жывою,
Спагады шчырай, веры і прызнання
І не баяўся быць самім сабою
Ўсе дваццаць год адвечнага кахання...

***

Мой родны і блізкі, мой самы жаданы,
Цяпла мне твайго не стае і пяшчоты...
Нібыта ад кроны лісток адарваны,
У пары кружу са сваёй адзінотай...

Ты сонца маё у пахмурны дзянёчак,
Праменьчык зіхоткі у цёмным захмар'і...
Так мала адмерана лёсам нам ночак:
Пра светлыя далі з сузор'ямі марыць.

О, як жа вярэдзіць душэўныя раны
Маўчанне тваё і сустрэчы на потым...
Мой родны і блізкі, мой самы жаданы,
Цяпла мне твайго не стае і пяшчоты...

***

Мяне узрушвае пачуццяў глыбіня,
Вачэй прыветных сонечная казка...
Ты самая раднейшая радня,
Мая пяшчота і святая ласка.

У твой Сусвет, далёкі неба край
Я асцярожнай птушкаю ўзлятаю...
О, як вярнуць чаромхавы наш май?
Надзея, кажуць, і не памірае...

Я веру шчыра у адзін Сусвет.
Я веру шчыра у адну дарогу...
А зараз дзякуй за усмешкі свет,
Што адганяе сум, тугу, трывогу...

***

Радок нараджаю, як светлую споведзь,
Крыніцу з празрыстай святою вадою.
Напэўна, ён некалі зможа успомніць
Хвіліны, калі я была маладою...

Калі я кахала аддана і шчыра,
Сваё ахвяруючы сэрца і волю
Таму, хто цяплом абуджаў маю ліру
І вольныя думкі свабодаю кволіў.

Калі я спазнала жыцця асалоду,
У вочы твае зазіраючы смела.
Каханнем напісаных безліч мелодый
Табе аднаму падарыць я хацела.

Калі мітусня і жыццёвыя справы
Спрачаліся з песняй, з душой маладою,
Калі асалодай дурманілі травы,
Пачуццяў сваволя не знала спакою...

Ігар ПРАКАПОВІЧ

***

У маленькім тваім пакоі,
Дзе прытулак знайшло каханне,
Ачышчаюся я душою,
Апынаюся ў нірване.

У палоне вачэй чароўных,
Іх празрыстай і яснай сіні,
Я, пяшчотай тваёю поўны,
Зноў плыву ў шчаслівай плыні.

А сустрэча — адно імгненне.
І світанак нясе расстанне.
Але добра, што ёсць імкненне,
І так добра, што ёсць каханне

У маленькім тваім пакоі...

***

... І мне так холадна,
няўтульна без цябе...
Нібыта ўсе вятры,
што ёсць на свеце,
Ў душу зляцеліся.
І ў змрочнай варажбе
Імкнуцца шабаш зладзіць у паэце.

Іграе комін, песню вые дрот,
І лупіць дождж у лужыны-цымбалы.
Прырода паўтарае з году ў год
Свае факстроты, полькі і харалы.

Пара прывыкнуць да сляпых вятроў,
Да восені і мокрай, і мінорнай.
І грэць сябе надзеяй, што ізноў
З табой сустрэнуся
шчаслівай ночкай зорнай...

***

Маім вуснам няўтульна
без вуснаў тваіх,
Яны смягнуць,
нібыта навокал — Сахара,
І пачуццяў пажар
у душы не аціх —
У палоне яна тваіх чараў.

Не забудуцца ў буднях
пяшчотныя дні:
Я ізноў у бяздонні вачэй патанаю,
Апынаюся зноў у такой глыбіні,
Дзе ўсяго толькі шчасце і маю.

Ну а іншае што?
Толькі тлум.., мітусня...
Промні рэдкія сонца...
Счарнелыя хмары...
Толькі вуснам няўтульна
у буднях жыцця, —
Яны смягнуць,
нібыта навокал — Сахара...

***

Мая Чароўная Пяшчота,
У глыбіні тваіх вачэй
Сустрэч вячэрніх асалода
І жар напалмавых начэй.

Цябе ў расстанні ўспамінаю,
На хвалях памяці плыву,
Сустрэчы новае чакаю
І зноў чаканнем тым жыву.

Маглі б ніколі не спаткацца
І паасобку з году ў год
Жыццём няўтульным
наталяцца,
Не зведаўшы душы палёт.

Удзячны Богу за магчымасць
Хоць зрэдку бачыцца з табой —
Сустрэч і грэшнасць
і нявіннасць,
Расстанняў сум і неспакой.

Шапчу каторы раз "кахаю..."
Нібыта вернік на імшы.
Цябе ізноў успамінаю —
І светла гэтак на душы...

Фота Уладзіслава Басько

Алесь МАКРАЦОЎ

Парцэлы

***

Сэрца
апякае агонь...
Адчуванне
блізкасці Бога.

***

Пэндзаль
часу —
ў руцэ
Мастака...

***

Лапік густога
кляновага ценю
ратуе
чараду галубоў...
Нянаская спёка.

***

Шостае
пачуццё...
Вока
творчасці.

***

Над выганам
выбухнуў плач...
Гусак,
нібыта тарпеда,
дагнаў карапуза.

***

Хістаецца
жніўня галіна:
вавёрка
зрывае арэхі...

***

Россыпы канфеці
ў карнавальным
лесе...
Познія сыраежкі...

***

Восеньскі матыль
на яркай кветцы
махровага ручніка,
што сохне на дроце...

***

Паромная
пераправа:
"Нябыт —
Вечнасць"...

***

Пахавальны
настрой
лесу
над высекай...

***

Шпалеры
лёсаў
на сценах
вякоў...
Малюнкі
ўчынкаў...

***

Вёрсты жыцця
за спінай...
наперадзе —
загадкавы Дом.

***

Быццё...
Мастацтва
самотнага
Бога...

Зацемкі з левай кішэні



Леанід ГАЛУБОВІЧ

▪ У літаратурнай творчасці я не эгаіст. Ніколі не прагнуў ні ўласнай славы, ні вядомасці (і ці ёсць яны насамрэч у цяперашняй беларускай літаратуры ўвогуле?) і не зайздросціў у гэтым плане аніколі з калег па "цэху".

Пакладзіце мне 500 долараў у месяц, і я зусім пакіну хоць нешта пісаць на паперы... Ну, мо хіба які дзённік у стол на давяршэнне лёсу... Найперш жыццё я люблю, а не літаратуру, але, урэшце усё звялося да літаратурнай пакуты дзеля апраўдання жыцця.

▪ Не сам Бог памагае, а — вера ў Яго...

▪ Пераствараць сусветную паэзію ў беларускія вершы... Ёсць у нашым літаратурным працэсе і такая праява паэтычнага таленту.

▪ *"Яўрэй — родавае імя постмадэрніста, чалавека без стылю."*

Барыс Парамонаў

▪ Паэзія — не тое, за што яе прымае большасць людзей, — не *вершы*, а — **незавершанасць**...

▪ А яшчэ паэзія — гэта філасофія эгаізму...

▪ Жыццё маё настолькі поснае і нецікавае, што абсалютна не маю спадзеву, каб яно было цікавым хоць каму іншаму ў гэтым свеце...

Пішу? Толькі ад безвыходнасці такога жыцця...

▪ *"Творчасць Льва Талстога — гэта руская вёска, якая прыняла памеры і значэнне Рыма."*

Васіль Розанаў.

▪ Патэлефанаваў з Гановера Алесь Разанаў. Дык я распавёў яму, як новапрызначаны рэдактар "Крыніцы" Вячаслаў Дашкевіч даводзіў нам у апраўданне свайго прызначэння і такі аргумент: *"Ну хто з вас можа пахваліцца тым, што быў калісьці запрошаным на вяселле да самога Алеся Разанава, а я — быў..."*

Нечакана для мяне Разанаў гэтаму абрадаваўся і з разварушанай памяці вылавіў некалькі святочных эпізодаў, а напрыканцы, з адвакацкай паблажлівасцю ў голасе, дадаў: *"Слава — чалавек арыгінальны, па-свойму* ***злеплены****..."*

▪ Электаральнае: *"Якая розніца, на якой мове каўбасу есці?"*.

А паколькі найлепш яна есца моўчкі, то ў хуткім часе трэба чакаць агульнага беларускага бязмоўя...

▪ Па вялікім рахунку надзённая газетная крытыка інтэрпрэтуе, агрубляе і вульгарызуе ўсялякае мастацтва... і тым самым ідэалізуе другаснае і пасрэднае...

▪ Міністр культуры Расійскай Федэрацыі Швыдкой у тэлевізійнай праграме "Культурная рэвалюцыя", як рэзюме напрыканцы перадачы, у якой, дарэчы, прымалі ўдзел вядомыя людзі (Ванштэйн, Пятроў, Глазуноў, Баскаў) выказаў вельмі блізкую мне думку: *"Маскультура ніколі не стане мастацтвам, таму што яна не можа зрабіць балюча тым, хто з ёй судакранаецца"*.

▪ Каторы раз перачытваю цудоўныя рэлігійныя вершы Дануты Бічэль і, не-не, ды спатыкнуся на радках:

"Ты ведаеш Боская Маці Марыя
Чаму мне тут здрадзілі ўсе?"

Пераціскае Данута Янаўна. Няўжо ж — усе?! Тым больш — Паэтка ад Бога. Таму нават **калі б і ўсе**, то ёй не павінна быць крыўднай і страшнай іх *зямная* здрада...

▪ Кіргіз Чынгіз Айтматаў творыць у межах расійскай мовы даўно і паспяхова.

Але, прыгледзьцеся, — твар пісьменніка, асабліва на фоне яго азіятаў-суайчыннікаў, з цягам часу набыў характэрныя расійскія рысы...

▪ Мова народа — бессмяротная.

І толькі ў роднай мове літаратар мае шанц застацца неўміручым, — не імю свайму, а найперш мове дзякуючы...

▪ Паэзію мы чамусьці звязваем толькі з вершамі. Але паэзія аб'ёмнейшая за вершы. Вершы маюць свой тэматычны абсяг, а паэзія — неабсяжная... Яна нават велічней за самога творцу, не кажучы ўжо пра аўтара вершаў.

▪ Часта, чытаючы таго ці іншага нашага паэта, можна сказаць, што ён не **творыць**, а *прытвараецца*, што ён не **творца**, а — *прытворшчык*...

▪ *"Вялікае Дзіця"* — сказаў Мікола Папека пра Міколу Купрэева. Больш вобразна і ў той жа час дакладна ніхто яго ахарактарызаваць не змог.

▪ Футбол. Першынство свету ў Японіі. Матч: Японія — Расія. Трансляцыя па БТ. Уладзімір Навіцкі пачынае каментар па-беларуску, як і пазначана ў кантракце з нямецкай тэлекампаніяй, але пасля запрашае да мікрафона Людаса Румбуціса, літоўца па нацыянальнасці, які жыве ў Беларусі і трэніруе клуб "Маладзечна", — і яны аўтаматычна пераходзяць на рускую мову. Адразу ж званок ад "немцаў": каментар толькі згодна кантракту — на беларускай мове! Ну, хоць немцы, можа, навучаць нас шанаваць сваё...

Але Румбуціс працягвае па-руску, ды яшчэ з такімі закідамі: *"Наши пока не нашли свою игру..."* **"Наши"** — гэта для — літоўца?! — **рускія**?.. (Мне думаецца, што якраз наадварот, гэта рускія могуць назваць беларусаў ці літоўцаў *"нашымі"*, а мы сябе ўсё яшчэ *"іхнімі"*. Гуляў у мінскім "Дынама" літоўскі нацыяналіст Андрус Жута, вось той гэта разумеў.)

Аднак на другі тайм Румбуціс усё-ткі не застаецца (Навіцкі нават паіранізаваў наастатку: *"Засталіся б, Людас, навучыліся б размаўляць па-беларуску..."*) Але ці не таму і сыходзіць, што папрасілі, каб, крый Божа, за яго "расійскі каментар" штраф не атрымаць?

Ды як бы там ні было, а **футбол-2002 па-беларуску** — гэта нешта!

▪ Зноў беларуская спартсменка стала рэкардсменкай свету ў бегу на 3000 метраў з перашкодамі. Ці заўважаеце вы, якія ў нас цяпер чэмпіёнкі і рэкардсменкі — не Марыі, не Тацціяны і не Эвеліны нават, а — Яніны ды Алесі (Яніна Карольчык, Алеся Турава...) Нацыянальны гонар вылазіць наверх, і гэта радуе, — і абнадзейвае...

▪ Паэтам памірае толькі той, хто ім нараджаецца... Багдановіч, Жылка, Купала, Сербантовіч, Дубоўка, Караткевіч, Стральцоў, Янішчыц, Гадулька, Пісьмянкоў, Купрэеў, Сыс...

▪ Яшчэ пра футбол. Першынство свету. Матч за выхад у 1/8 фінала: Аргенціна — Швецыя.

Скандынаўскія вікінгі са *скалістымі* тварамі прагматычна "знялі скальпы" з *артыстычных стыхійных жывых* паўднёваамерыканцаў... Шкада да слёз. Я *хварэў* за іх — за відовішча, за спартыўны спектакль, за прыгожую гульню...

Тэлефануе Юра Станкевіч з Барысава. Радуецца перамозе шведаў: *"Я — за еўрапейцаў!"* А я — за футбол...

▪ Сустрэў на тралейбусным прыпынку двух бамжоў. Гадоў па 35. Здаровыя яшчэ з выгляду, стройныя рослыя мужыкі... Што здзівіла: чыстыя, коратка падстрыжаныя, адным словам — нейкія свежыя, хоць і відно, што — валацугі (*гэтага не схаваеш*)... І абсалютна нечакана — задаволеныя нечым, гаманкія...

Бываюць жа, падумалася, і ў іх радасныя хвіліны жыцця...

Перад Богам усе роўныя, Ён нікога не абдзельвае.

Толькі людзі могуць абдзяліць чалавека...

▪ *"Неабходна вар'яцтва, каб перамог розум."*

Ігар Гарын пра Дастаеўскага.

▪ З нейкім прызабытым ужо дзіцячым здзіўленнем прачытаў у "дзённіку" Жуля Рэнара (падарунак Барыса Бур'яна): *"Выпіваць кожную раніцу па кубачку сонца і з'ядаць па жытнім каласку"*.

Якое цудоўнае ўнутранае самапачуванне зямнога жыцця.

▪ Мне падалося, што, час ад часу, у мяне з'яўляюцца падобныя адчуванні да пераважнай большасці нашых "літмэтраў", як у працытаванага мной Ж. Рэнара: *"У зале для фехтавання: куча маркізаў, графаў. Гэтыя людзі жывуць за кошт сваіх імёнаў. Яны робяць на мяне моцнае ўражанне. Плебей, сын селяніна, я лічу іх усіх боўдзіламі. Аднак яны мне імпануюць, і калі, праходзячы міма, я бачу іх голыя, вартыя жалю целы, я сарамліва кажу: "Прабачце!""*

Які тонкі падтэкст закладзены, амаль незаўважны і няўлоўны. Думаю, гэта блізка і зразумела не толькі мне. Праўда ёсць адна парадаксальная калізія: амаль усе нашы "літаратурныя фехтавальшчыкі" — сялянскія дзеці...

▪ А як вам, найперш літаратарам, гэтае сведчанне Ж. Рэнара: *"Калі я трымаю ў абдымках жанчыну, я добра ўсведамляю, што і тут я ўсё яшчэ займаюся літаратурай. Я прамаўляю нейкае слова таму, што павінен яго прамовіць, і таму, што яно літаратурнае. Нават і ў такія хвіліны я не магу быць натуральным"?*

Яшчэ як зразумелае! І не толькі ў падобных выпадках...

▪ На пісьменніцкім сходзе нарэшце сустрэўся зноў з Купрэевым. Высах ён і састарэў — ад тытуню, віна і хваробаў розных. Наўрад ці ўжо што ён напіша. Шкада. Перадаў яму паліто пуховае (сінтэтычнае) ад Толі Сыса (не ведаю, ці сустрэліся яны сам-насам). Год праляжала-правалялася ў рэдакцыі "Крыніцы", а пасля ў мяне дома...

Не скажу, што ён гэтаму падарунку абрадаваўся (нават не падзякаваў), бо быў паглынуты (цалкам, увесь!) праблемай выпіўкі, між іншым, ужо і без таго "астограмлены"... Алесь Кажадуб прывёз яму з Масквы ганарар за публікацыю ў "Литературной газете" (300 расійскіх рублёў), Мікола абмяняў іх на 16000 беларускіх і шукаў (а яны ўжо й побач!) кола хаўруснікаў на танны "Крыжачок"...

На фіг яму той з'езд (Купрэеў у залу амаль не заходзіў і, здаецца, не галасаваў нават). Яму галоўнае — сустрэцца з тымі, з якімі *хочацца* і заўсёды *хацелася*... І сустракаюцца ўсё тыя ж.

Адзінокі пілігрым. Драматычны лёс. (Ён, Анатоль Сыс, Васіль Гадулька, Андрэй Федарэнка — *людзі без людзей*).

Не развітваліся... Не люблю яго п'яным і дарэшты бездапаможным. Як і Сыса, але ў таго яшчэ хоць ногі жывыя... Астатняе таксама ўжо амярцвела і атрафіравалася... амаль дарэшты...

Апраўданне за растрачаны талент у іх перад Богам адно — творчасць.

▪ Яшчэ адна немалаважная прычына, чаму я кінуў пісаць вершы. Таму што мне было сорамна і за чужыя...

▪ Як караблю небяспечна апускацца ніжэй ватэрлініі, так чалавеку ні перад кім нельга схіляцца ніжэй пояса...

▪ Госпадзе, стаю ўтрапёны пад высокім Небам Тваім і прыкрываю словамі цёмную прыроду сваю...

▪ Сёння адзін паважаны мной чалавек сказаў мне: *"Што ты ўсё пра іх пішаш, яны з радасцю чакаюць ад цябе не толькі ўхвалы, але й крытыкі. А на добры лад, дык гэта ж яны пра цябе пісаць павінны — ты, калі не вышэй, то роўны ім..."*

Дзіўныя людзі, няўжо яны не разумеюць: пра каго і пра што б мы ні пісалі — мы пішам пра сябе...

▪ Супраціўнік вайны, пацыфіст, выдатны наш пісьменнік Васіль Быкаў прэтэндуе на высокую ўзнагароду імя вынаходніка дынаміту Нобеля, гэта значыць, былога патэнцыйнага завадатара вайны, які менавіта на гэтым зарабіў свае першыя дывідэнды...

Зрэшты, і Быкаў хоча атрымаць прэмію за тыя свае творы, у якіх пісаў пра вайну...

"Неисповедимы пути Твои, Господи"...

▪ Па вялікім рахунку, я ўжо даўно жыву не ў гэтым свеце, а ў свеце літаратурным. А гэта зусім іншае жыццё. На жаль, яно таксама не вечнае, бо, калі я бяру ў рукі Біблію, то саромлюся напісанага мной...

▪ У крытычным артыкуле Галіны Друк вычытаў, што *"чалавек з'явіўся з праху зямнога і дыхання Бога, набыўшы боскую здольнасць тварыць, а з дапамогаю Сатаны і другую якасць — свабоду выбару ..."*

Цікава, ці няпраўда? Свабода выбару, аказваецца, у нас — ад Сатаны. Зрэшты, у цяперашняга беларускага інтэлігента гэта можа выклікаць супярэчлівыя пачуцці...

▪ У Поля Валеры: *"Трэба быць лёгкім, як птушка, а не як пяро"*.

▪ Запісаў, слухаючы мемуары Васіля Быкава па радыё "Свабода": *"Хрушчоў са сваёй стэрыльнай ідэалогіяй нават дазволіў Аляксандру Твардоўскаму надрукаваць у "Новом мире" "Один день Ивана Денисовича" Александра Салжаніцына — гэтую калядную казачку пра лагернае жыццё"...*

Якая непавага ў адносінах да знакамітага калегі па пяры. А за якія ж "казачкі" тады давалі Ленінскія прэміі і Залатыя Зоркі Герояў Сацыялістычнай працы?! Ці гэта проста эгаістычная зайздрасць — Ленінскіга лаўрэата да Нобелеўскага?..

▪ У жыцці, мажліва, няма аніякага сэнсу, апроч смерці. Але, каб дамагчыся гэтага найвышэйшага сэнсу, варта перажыць пакуты ўсяго жыцця...

▪ Нічога больш цудоўнага і больш паскуднага няма, чым тое, што ёсць у нашай галаве. Бо ўсё, што ёсць насамрэч, — асуджанае на смерць. А ўсё, што ў думках, — дзякаваць Богу, толькі магчымае, але пакуль насамрэч не выяўленае...

▪ Жанчына ў ложку павінна пахнуць свежай рачной вадой... Ты — бераг, яна — плынь...

▪ На кожны *грант* ёсць свой **гарант**.

▪ Калісьці ў траўні 1980 года "ЛіМ" **адкрыў** мяне як паэта. Мажліва, цяпер, праз 22 гады, ён мяне і *закрые*...

▪ Можна не любіць канкрэтнага чалавека ці нават групу людзей альбо нейкую сацыяльную з'яву ці аказваць супраціў злым намерам іншых людзей, але — нельга не любіць Айчыну толькі за тое, што яна цяпер ёсць — *такая*...

▪ Спяшаўся ў панядзелак на лімаўскую лятучку, ад пляца Якуба Коласа — да Круглай, на Захарава... Якраз насупраць выставачнага цэнтра "На ростанях" убачыў мужчыну гадоў сарака: белая кашуля — чырвоны гальштук...

Размінуліся ўжо, і тут ён аклікае мяне напаўголасу: *"Прабачце, вы часам не спадар Галубовіч?.."* Паварочваюся, ківаю. Сыходзімся бліжэй, і ён кажа: *"Я — ніхто, так, просты беларускі чалавек, працую ў санаторыях па службе, але заўжды чытаю вашы "зацемкі", бо яны жывыя і сапраўдныя, як наша жыццё..."*

Няёмка я сябе ў такіх выпадках пачуваю, ды ўсё ж, калі шчыра, недзе на донцы душы тое прыемна сагравае... Пастаялі-пагаварылі... Ён — з Пінішчыны, а таму спрабуе захаваць паляшуцкі дыялект, знаёмы з Алесем Наварычам...

Адным словам, я быў моцна ўражаны пасярод абруселага Мінска тым, што нехта тут недзе чытае мае "зацемкі", як ён назваў мае "з*а*цемкі"...

Можа, і сапраўды яшчэ варта сёе-тое пісаць для каго-небудзь, хоць бы для такіх маленькіх рэдкіх суцяшэнняў сваёй беспрытульнай беларускай душы пасярод абрыдлай бязмоўнай пусткі...

▪ Як часта ўзрушваемся мы да слёз з нагоды нечаканай радасці альбо шчаслівых імгненняў, тады як нехта недзе захлынаецца ад горкіх рыданняў з выпадку гора ці бяды...

Радасць і бяда, жыццё і смерць — побач. І там, дзе толькі што гайдалася калыска з немаўлём, ужо заўтра можа стаяць непарушная труна з нябожчыкам...

Заўжды памятай гэта, шчаслівы да слёз...

Мінск,
май — жнівень 2002 года.

У сталічнай галерэі “Мастацтва” прайшла выстаўка работ Віктара Лагоўскага. Мастак вядомы не толькі ў Беларусі, але далёка за яе межамі. Яго таленавітыя непаўторныя палотны прыцягваюць, выклікаючы самыя розныя эмоцыі, пачуцці. А гэта галоўнае для мастака: узрушыць... Багатая фантазія, вобразныя кантрасты, уменне лаканічна і кідка выказаць асабісты погляд на свет і на людзей – усё гэта характэрна для творчасці В. Лагоўскага.



Кідка, лаканічна, вобразна

У цэнтры выставачнай залы вялізнае, 2х2 метры, палатно “Тарэадор”. Праз чырвоны і чорны на вохрыста залатым фоне выказаў Віктар свае эмоцыі і адносіны да традыцый карыды. Забойства, але не проста забойства, а “прыгожа абстаўленае” відовішча для шматтысячнай публікі — гэтаму вучаць кожнага матадора, узброенага байца, які павінен завяршыць барацьбу з быком трапным ударам шпагі. У гэтым творы адчуваеш негатыўнае стаўленне мастака да крывавай расправы з жывёлай, негуманнага і таму амаральнага рытуала.

І зусім іншы каларыт і вобразнасць створаных В. Лагоўскім вітражоў у Нацыянальнай бібліятэцы “Кветкі радзіме — васілёк”, “Квітнеючая яблыня”, роспіс “Кветкі родным прасторам”. Колеры выяў ясныя, простыя і гарманічныя, далікатныя, чыстыя і празрыстыя, нібы вада, — блакітны, белы, жоўты, зялёны — нясуць супакаенне. За гэтую работу ён атрымаў прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры і мастацтва. І гэта не адзіны маштабны праект Віктара Лагоўскага — выпускніка манументальнага аддзялення Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: ён перыядычна займаецца афармленнем будынкаў па ўсёй Беларусі. Мастак умела кантактуе з архітэктурным асяроддзем, а таму стыль яго кампазіцый так пасуе інтэр'ерам. З апошніх работ — прыгожыя мазаічныя падлогі для Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

Падабаецца В. Лагоўскаму працаваць і ў авангардным напрамку, спалучаючы лініі і аб'ёмы, умоўнасці і акрэсленасць, а таму выявы беларускіх кветак у яго адметныя жыццярадаснасцю колеравых спалучэнняў і, як адзначылі на вернісажы мэтры жывапісу, нагадваюць “Сланечнікі” Ван Гога.“Кветкі красавіка”,“Ліпеньскія кветкі”... Вылучаецца карціна “Кветкі родным прасторам”, якую мастак намаляваў падчас знаходжання ў Ізраілі (Віктар Лагоўскі жыў там два гады — яго жонку накіравалі туды на працу, у пасольства Беларусі). На ружавата-пясочным фоне, як на старадаўняй карце, — лініі ці то рэк, ці то дарог, сярод якіх праглядае астравок беларускай зямлі: з палямі, паселішчам, дзе хацелася б жыць. Усё тут знакавае: выява медаля Сігізмунда “За адвагу” ў левай частцы палатна, букет яркіх кветак у цэнтры — як удзячнасць мастака роднай зямлі, што ўзгадавала яго.

Напісаная ў 2008 годзе карціна “Пілар” уражвае выявай іспанскай Божай Маці Пілар, з'яўленне якой, паводле легенды, падтрымала апосталамісіянера, які распаўсюджваў хрысціянства ў Іспаніі. А ў “Партрэце сучасніка” звяртаюць на сябе ўвагу філасофскія разважанні ў фарбах пра месца маладога чалавека ў сённяшнім грамадстве. Мастак не задумваецца над тым, як зрабіць твор, а проста стварае вобраз на палатне, таму атрымліваецца ўсё гэтак ярка і пераканальна...

Віктару Лагоўскаму споўнілася 35 гадоў, і да гэтай нагоды сябры, Беларускі прафсаюз работнікаў культуры дапамаглі мастаку выдаць першы альбом яго асноўных жывапісных твораў — ад 2000 года па сённяшні дзень. Прэзентацыя альбома адбылася на адкрыцці выстаўкі.

Галія ФАТЫХАВА

На здымку: Віктар Лагоўскі, “Тарэадор” (палатно, алей).

Красавік запомніцца тым, што...

●●● на пачатку гэтага месяца ў Віцебскім мастацкім музеі разгарнулася экспазіцыя, прысвечаная Дню смеху. Яна змяніла надзвычай адметную выстаўку творчасці васьмі сямейных пар — мастакоў горада на Дзвіне. Тая сакавіцкая экспазіцыя прадстаўляла жывапіс, графіку, батык, габелен, кераміку, ювелірнае і фотамастацтва. І ладкавалася яна пад канцэптуальнай назвай — “23+8”, што азначае дзве папулярныя святочныя даты, “мужчынскую” і “жаночую”: Дзень абаронцы Айчыны і Дзень жанчын. Экспазіцыя такога кшталту ладзілася тут упершыню. Да таго ж, яна знаменавала пачатак новага арт-праекта — цыкла камерных выставак-гасцёўняў у мастацкім музеі. Такія імпрэзы вельмі папулярныя ў Заходняй Еўропе: мастакі ды гледачы маюць магчымасць пазнаёміцца, пагутарыць у нефармальнай абстаноўцы. Напэўна, такая традыцыя прыжывецца і ў Віцебску.

●●● адзін з вечароў у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі парадуе публіку гучаннем жыццярадаснай і светлай аркестравай музыкі, неапалітанскіх песень і фрагментаў з аперэт. Гэта будзе першы канцэртны праект пад назвай “Вечар вальса”. Яго аўтар, дырыжор тэатра Алег Лясун, запрасіў да ўдзелу ў праграме Алену Бундзелеву, Уладзіміра Громава, Настассю Масквіну, Уладзіміра Пятрова, Алену Сало, Ніну Шарубіну, Алену Шведаву, іншых салістаў оперы, а таксама знаных артыстаў балета Юлію Дзятко і Канстанціна Кузняцова. Канцэрт адбудзецца 12 красавіка.

●●● дырыжор Вячаслаў Воліч распачынае (як аўтар і музычны кіраўнік) доўгатэрміновы праект “Партрэты”. Канцэрты будуць ладзіцца на сцэне НАВТ оперы і балета Беларусі. Першую праграму маэстра правядзе 7 красавіка. Называецца яна “Casta Diva” і прадставіць спеўнае мастацтва Ніны Шарубінай — адной з самых яркіх салістак тэатра, уладальніцы выбітнага па моцы і прыгажосці драматычнага сапрана. У канцэрце таксама ўдзельнічаюць народны артыст Беларусі Уладзімір Пятроў і заслужаны артыст краіны Сяргей Франкоўскі. Прагучыць оперная музыка В. Беліні, Д. Вердзі, Р. Леанкавала, Д. Пучыні, П.Чайкоўскага.

●●● будынак Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра зачыніўся на рэканструкцыю. У апошні сакавіцкі дзень тут адбылася ўрачыстая імпрэза, прысвечаная 25-годдзю з часу стварэння гэтага калектыву. Прыхільнікаў маладзёжнага тэатра, які працуе сёння пад мастацкім кіраўніцтвам рэжысёра Мадэста Абрамава, вабіць багацце рэпертуарнай палітры ды адметны акцёрскі ансамбль, у якім вылучаюцца такія вядомыя імёны, як Сяргей Журавель, Аляксандр Шароў, Ганна Лавухіна. Цяпер калектыву давядзецца іграць свае спектаклі на розных сцэнах — і ў роднай сталіцы, і на гастролях.

Лана ІВАНОВА

На здымку: дырыжор Алег Лясун.

Фота Кастуся Дробава

Ёй падабаецца слова «праца»

У музычным гурце “пахавана” безліч цікавых асоб. Іх імёны аўдыторыя не ведае, абыходзячыся пазнаваннем франтмена, які раздае аўтографы і адказы на пытанні. Парушым традыцыю і пагаворым не пра лідэра і заснавальніка гурта “НагУаль” Леаніда Паўлёнка, а пра адну з удзельнікаў — Ганну Шапашнікаву, музыку, вакалістку і лямцавых спраў майстра.

З біяграфіі

Ганна Шапашнікава нарадзілася ў 1982 годзе ва Уладзівастоку. Скончыла Інстытут сучасных ведаў імя А. Шырокага, спецыяльнасць “сацыяльная педагогіка”. Падчас вучобы стала неад'емнай часткай гурта “НагУаль” (вакал, цымбалы, банбор, званочкі). Пазней навучылася валяць з лямцу, сёння працуе ў майстэрні “Шарсцяная шафа”.

Крыху архітэктурнае дзяцінства

Сваё дзяцінства Ганна выбітным не лічыць:

—Яно было не вельмі творчае. Я жыла ў вёсцы, і у нас быў маленькі сямейны бізнес, так што ў падлеткавым узросце я дапамагала бацькам — гандлявала цукровай ватай. А творчасць зводзілася да прагляду галівудскага кіно і мульцікаў. Такая пасіўная творчасць была... У дзяцінстве я шмат чытала, крыху вязала і шыла для лялек. О! Мы з братам будавалі дамы. Вёска ж вакол — можна было будаваць з чаго заўгодна. Мы пабудавалі дом з бярвення, дом з цэглы пасярод дарогі, дом са снегу і дом з сена. Так што маё дзяцінства было крыху архітэктурнае.

Мы — гэта мы

Актыўнай творчасцю Ганна занялася ўжо ў юнацтве. Шмат чаго спрабавала: фатаграфавала, рабіла перформансы. І выпадкова знайшла сябе ў незвычайнай музыцы:

— Я пазнаёмілася з гуртом “НагУаль” і, як многія ў той час, пачала прыходзіць на рэпетыцыі. Спачатку ціхенька слухала, а потым, як слон у краме з посудам, пачала спрабаваць нешта рабіць разам з музыкамі. Гэта жудасная звычка — такое пачынанне. Таму што ты займаеш час рэпетыцыі ў людзей: яны яшчэ хацелі нешта абмеркаваць, паспрабаваць, а тут нехта прыходзіць, пачынае стукаць-грукаць. І я вельмі-вельмі ўдзячная музыкам за тое, што яны мне дазвалялі стукаць і не казалі, як у мяне гэта дрэнна атрымоўваецца. І дзякуючы характару (калі адчуваю, што магу нешта зрабіць, то хачу гэта развіць да належнага ўзроўню), я развівала свае здольнасці. Праз нейкі час мне даверылі шамацець. Але спачатку мне даверылі насіць інструменты, потым ужо крышку шамацець, і так, паступова, я ўвайшла ў калектыў.

“НагУаль” — калектыў добра вядомы і незвычайны. Для тых, хто хоць раз чуў яго, нічога пісаць не трэба — у іх абавязкова ёсць уласнае меркаванне, свае асацыяцыі з чароўнымі тэкстамі, складзенымі з гукаў, з кампазіцыямі пад дзіўнымі назвамі — “Суцяшэнне снегам”, “Албанская дурнічка”, “Галубы над Берлінам”. Для тых, хто не чуў, скажу: яго ўдзельнікі ствараюць музыку ва ўласным стылі (этнічны сюррэалізм), прыдумляюць для яе інструменты (елкін нос, банбор, чароўная рура). Кампазіцыі — гэта ўяўленне сучаснага чалавека пра вытокі народнай музыкі. Самая галоўная іх рыса, на думку Ганны, — асабістасць:

—Тое, што мы робім — гэта эксперымент з адчуваннем музыкі розных-розных народаў. Гэта ўяўленне гарадскога чалавека, які шмат дзе пабываў, шмат чаго ведае, пра наваколле. І увасабляецца гэтае ўяўленне праз музыку. Мы зыходзім са свайго ўласнага адчування свету. І калі мы ідзём за нашымі пачуццямі ў гэтай музыцы, то разумеем, што мы — гэта мы.

Ад завушніц да юрты

Студэнткай Ганна вельмі цікавілася рознымі арт-методыкамі працы з дзецьмі і дарослымі. Цікавасць урэшце перарасла ў вельмі сур'ёзную для нашай гераіні справу:

— Разам з кіраўніком маёй дыпломнай работы Аленай Валер'еўнай Рыбаравай я працавала ў інтэрнаце для сацыяльных сірот у Ждановічах. Яна падказала мне пагартаць часопіс “Ручная праца”, каб рабіць заняткі для дзетак больш цікавымі. І аднойчы я пабачыла ў гэтым часопісе лямцавыя работы, якія зрабіла маскоўская валяльшчыца. З гэтага ўсё і пачалося. Я пазнаёмілася з майстрамі. Прайшла выдатны майстар-клас у шведскай валяльшчыцы Гунілы Паятаў. Займалася сама, спрабавала, вучылася і вучуся да гэтае пары.

Я ўяўляўла сабе лямец як матэрыял для маленькіх цацачак, а на выстаўцы бачыла вырабленыя Г. Шапашнікавай лямпу, абажур, і не магла не пацікавіцца, што ж яшчэ можна з лямцу рабіць:

*— Усё можна. Я вось толькі есці яго пакуль што не ўмею (смяецца. — **А. М.**). А так магу зрабіць усё: ад маленькага шарыка для завушніцы — да юрты.*

Музыка і валянне ў жыцці Ганны існуюць не паасобку. На маю думку, сінтэз гэтых заняткаў адбываецца неяк падсвядома. Праца з лямцам мае тую ж аснову, што і музыка “НагУалі”: уяўленне сучаснага чалавека пра старажытны народны занятак. І ніякіх прыярытэтаў ні гурту, ні валянню! На маё пытанне: “Што для вас праца, а што хобі?” адказ катэгарычны:

— Маё жыццё — гэта не хобі. І мне падабаецца, што ўсё, чым я займаюся, — гэта праца. Мне падабаецца гэтае слова — “праца”. Працаваць, як пчолы: збіраць нектар, ляцець да сябе ў хатку, дапамагаць адно аднаму. Праца, якая стварае свой свет, свой мікракосм.

Верагоднае ўсё

Стаўленне Ганны да працы ўражвае. Яе самастойнасць і здольнасць арганізаваць сябе — зайздросныя. Калі заўтра Ганна вырашыць вывучыць кітайскую мову ці даць нырца з аквалангам — будзьце ўпэўнены, што праз колькі часу яна каліграфічна будзе выводзіць на паперы іерогліфы ці, як рыбка, рухацца пад вадой. Самая прыцягальная рыса Шапашнікавай — тое, што з ёю можа здарыцца ўсё што заўгодна (цяпер, напрыклад, яна наведвае трэці клас музычнай школы). Прыцягальная таму, што пасля сустрэчы з Ганнай твой уласны свет робіцца шырэйшым, а некаторыя рэчы ў ім — больш верагоднымі.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Фота Кастуся Дробава

Славутая «Купалінка», або Гісторыя аднаго замоўчвання

Светлай памяці Уладзіміра Тэраўскага — музыкі, чалавека-легенды і волата духу

Гэтая песня суправаджае нас усюды з дзяцінства: можна пачуць яе па радыё, тэлебачанні, у тэатры (першыя такты "Купалінкі" і сёння гучаць у Купалаўскім тэатры заміж традыцыйных званкоў), а то і ў застоллі. Яна даўно ўжо стала адной з самых вядомых і насамрэч любімых народам беларускіх песень, часта нават выконвае ролю рэпрэзентанта беларускага фальклору ў сучасным музычным свеце. І сапраўды, здаецца, што гэтая напеўная, выразная мелодыя наскрозь прасякнутая беларускім народным духам, сплеценая з беларускіх народных інтанацый і праўдзіва выяўляе самую сутнасць беларускай народнай душы. Безумоўна, так яно і ёсць, за выключэннем аднаго, але вельмі істотнага "але": сёння ўжо з ўпэўненасцю можна — і трэба! — сказаць, што ў гэтай песні, як і ў некаторых іншых г. зв. народных — "Люблю наш край" Міколы Равенскага, "Зорка Венера" Сымона Рака-Міхайлоўскага (гэты спіс можна доўжыць і доўжыць), — ёсць рэальныя прафесійныя аўтары. Іх імёны павінен ведаць кожны, каму неабыякавы лёс беларускай культуры.

Яшчэ ў далёкім 1964 г. выдатны айчынны вучоны Арсень Ліс закрануў у друку пытанне аўтарства "народнай" песні "Зорка Венера" на верш М. Багдановіча ("Маладосць", 1964, № 5). І сёння, як вынік шматгадовае працы па вяртанні ў навуковы і культурны кантэкст незаслужана забытага імя, С. Рак-Міхайлоўскі як кампазітар гэтага раманса згадваецца ўжо ўпэўнена і без агаворак. Песня "Люблю наш край" на словы К. Буйло яшчэ ў другім выданні шырокавядомай "Анталогіі беларускай народнай песні" Г. Цітовіча (1975) змяшчалася як ананімны музычны эпіграф да зборніка, з пазначэннем адно аўтарства слоў і часу стварэння (цікава, што першакрыніцай яе публікацыі, як дарэчы, і публікацыі змешчанай тамсама "Купалінкі", пазначаныя ў "Анталогіі" "Песні беларускага народа" (1959) самога ж Г. Цітовіча). Але ўжо ў даведніку "Кампазітары Беларусі" (1997), у артыкуле пра М. Равенскага, сцвярджаецца: *"М. Равенскі стварыў шэраг глыбока нацыянальных твораў, сярод якіх песня "Люблю наш край" (мелодыя яе вядомая ў Беларусі як народная)"*.

Былі ў той ананімнасці і іншыя прычыны, апроч шырокай распаўсюджанасці песень і народнай да іх любові. Сёння ўжо не сакрэт, што і Сымон Рак-Міхайлоўскі, рэпрэсіраваны ў 1938 годзе, і Мікола Равенскі, абвешчаны калабарацыяністам толькі за тое, што падчас Другой сусветнай не пакідаў межы радзімы, надоўга былі проста выкрасленыя з афіцыйнай гісторыі беларускай культуры. Такі ж лёс напаткаў і Уладзіміра Тэраўскага (1871 — расстраляны ў 1938) — знакавую постаць беларускай музыкі, чалавека, які стаяў ля вытокаў стварэння нацыянальнай оперы і нацыянальнай музычнай школы. Самастойна авалодаўшы неабходнымі прафесійнымі ведамі, *"ён стаўся першым беларускім кампазітарам, які паказаў дарогу беларускай прафесійнай музычнай творчасці"* і *"паклаў асновы тых метадаў, паводле якіх апрацоўвалася беларуская народная песеннасць ды пісаліся арыгінальныя беларускія творы"* (М. Травень).

У гісторыі беларускай культуры У. Тэраўскі, колішні ўдзельнік славутага хору Агрэнева-Славянскага, вядомы найперш як стваральнік нацыянальных хораў — першы беларускі хор быў арганізаваны ім яшчэ перад Першай сусветнай вайной (увогуле ж дырыжыраваць хорам У. Тэраўскі пачаў яшчэ ў 16—17-гадовым узросце). У розныя часы славуты беларускі хор пад яго кіраўніцтвам уваходзіў у склад першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Дзяржаўнага тэатра БНР, Беларускага савецкага тэатра, выступаў самастойна, заўсёды несучы ў масы ідэю унікальнасці беларускага нацыянальнага мастацтва.

Частка песенных стылізацый і г. зв. "новых песень у беларускім характары" У. Тэраўскага друкавалася ў зборніках "Беларускі спеўнік" (Менск, 1921, 25 узораў), "Беларускі лірнік" (Берлін, 1922, 99 узораў) і "Вайсковы зборнік" (Менск, 1926, 30 узораў). Цікавым і вельмі істотным тут момантам падаецца тое, што ў адрозненне ад згаданых мною песень М. Равенскага і С. Рака-Міхайлоўскага "новыя песні" У. Тэраўскага стваралися не толькі на словы вядомых паэтаў і драматургаў (Янкі Купалы, Ф. Аляхновіча, В. Дуніна-Марцінкевіча), але і на аўтэнтычныя народныя тэксты. І ўсё-ткі важнасць і колькасць зробленага У. Тэраўскім на ніве стварэння нацыянальнага музычнага рэпертуару не ўратавала яго ад рэпрэсій з боку савецкай улады. Выхад у свет другога з названых спеўнікаў Тэраўскі сустрэў



за кратамі смаленскай турмы, адбываючы там пакаранне, на якое быў заменены папярэдне вынесены яму "за антысавецкую дзейнасць" прысуд да расстрэлу.

Пад рэпрэсіі трапілі тады і некаторыя творы кампазітара, найперш "Ваяцкі марш" на словы Макара Краўцова, які выкарыстоўваўся ў якасці гімна Беларускай Народнай Рэспублікі. Калі ў "беларускім спеўніку" 1921 г. (рыхтаваным яшчэ пры паляках, але выдадзеным ужо за саветамі) ён займаў цэнтральнае месца, адно што са зменеными словамі, то ў наступным — "Беларускім лірніку" (1922) — яго, мяркуючы, увогуле знялі з падрыхтаванага ўжо да друку варыянта (думаецца, "Ваяцкі марш" змяшчаўся ў ім пад № 100, бо першыя два нумары — гэта гарманізаваныя Тэраўскім "Інтэрнацыянал" і "А хто там ідзе?" Л. Рагоўскага, а апошні — № 99 — гарманізацыя "Беларускай марсельезы"). Дарэчы, акурат у 1922 г. была створаная арганізацыя, якая аб'яднала ўсе віды цэнзуры: Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў, у Беларусі — Галоўлітбел. Паказальным для дзейнасці гэтай арганізацыі з'яўляецца, да прыкладу, рашэнне Галоўлітбела ад 29.11.1932 г. "Об изъятии из продажи и музыкальных библиотек народных песен с нотами "А ў бары", "А ў лесе, лесе", "Мужык жыта прадае", а также песен на слова Янки Купалы "Лісты валяцца", "У імгле" и Максима Богдановича "Як прыйшла я на ток малаціць". Дарэчы, шырока папулярныя апрацоўкі Тэраўскага "А ў бары, бары" і "А ў лесе" таксама змяшчаліся ў ягоных зборніках.

Адным з найбольш і па сёння папулярных зборнікаў беларускіх народных песень з'яўляецца "Анталогія беларускай народнай песні" Генадзя Цітовіча, выдадзеная ў 1968-м і перавыдадзеная — у дапоўненым выглядзе — у 1975 г. У падраздзеле "Каляндарна-абрадавыя песні" раздзела "Песні дасавецкага перыяду" абодвух выданняў змешчаная і славутая беларуская "Купалінка" — *"напеў навейшага паходжання, аб чым гаворыць яго інтанацыйная пабудова, якая адрозніваецца ад традыцыйнай мелодыкі купальскіх песень, і многагалоссе"*, як сцвярджаецца ў каментарыях складальніка пры канцы кнігі. Тамсама пазначаная і першакрыніца публікацыі — "Песні беларускага народа. Выбранае" (1959), укладзеныя і пракаменціраваныя самім Г. Цітовічам. І ў "Выбраным", і ў "Анталогіі" — мінімум пашпартных звестак пра напеў "Купалінкі": адзначана толькі, што песня **запісаная** У. Тэраўскім у Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці. Цікава параўнаць гэта са звесткамі "Зборніка купальскіх і жніўных беларускіх песняў" (1943), выдадзенага кампазітарам Міколам Шчагловым. Сярод 30-і нумароў, змешчаных — 26 апрацовак укладальніка, дзве — А. Туранкова і адна апрацоўка Я. Прохарава. "Купалінка" пазначаная з **музыкай** (!) Уладзіміра Тэраўскага — вядомы ўсім нам напеў з невялічкім адрозненнем у тэксце. У савецкім друку імя кампазітара было на той час пад забаронай, і да яго афіцыйнай рэабілітацыі ў 1957 г. ніякія публічныя згадкі пра яго ці яго творы ў СССР былі немагчымыя; таму творы, якія ўсё-ткі "пайшлі ў народ" і зажылі ў ім не залежным ад аўтара жыццём, папросту "публялі" нязручнае для ўлад аўтарства. Вось і ўсім нам вядомая "Купалінка" з музыкай Уладзіміра Тэраўскага ператварылася ў г. зв. народную (ананімную) песню. Адной жа з прычын доўгага вяртання яе аўтарства нават пасля рэабілітацыі кампазітара было, думаецца, і насамрэч традыцыйнае, фальклорнае паходжанне яе тэксту, вельмі ўдала падабранага і стылізаванага яшчэ адным рэпрэсіраваным дзеячам нашай культуры — Міхасём Чаротам, дарэчы, актыўным удзельнікам хору Тэраўскага. Праца з народнымі тэкстамі была для яго справаю, звыклай з дзяцінства: у аўтабіяграфіі М. Чарот прызнаваўся, што *"сачыняць" пачаў, не ўмеючы пісаць. Браў народную песню і пераплятаў яе з выдуманымі ў рыфму радкамі"*. Адным з найбольш вядомых у свой час яго твораў была пастаўленая на сцэне беларускага дзяржаўнага тэатра Еўсцігнеем Міровічам музычная драма "На Купалле" (1921), тэкст якой не друкаваўся і доўгі час лічыўся страчаным для айчыннай культуры. Толькі ў 1982 г., адноўленая па памяці колішнімі ўдзельнікамі пастаноўкі К. Кулаковым і К. Пуроўскім, яна была апублікаваная ў часопісе "Полымя". Там мы і знойдзем яшчэ адзін варыянт тэксту славутае "Купалінкі" — са сцэнічнымі рэмаркамі, бо "Купалінка" была проста адным з нумароў гэтае сапраўды народнае драмы (паводле падлікаў К. Пуроўскага, спектакль "На Купалле" толькі ў 1920-я гады вытрымаў ажно 432 паказы). *"Свежасць, меладычнасць, простасць і яснасць музычнае мовы хутка прынеслі вялікую папулярнасць "Купаллю" Тэраўскага. Паасобныя ўрыўкі з гэтага твора ўвайшлі ў народ як фальклорныя спевы — напрыклад: "Купалінка, песня Алесі, дуэт Алесі і Ядзі, хор "Гэй, ну хлопцы" і іншыя. "Купалле" Тэраўскага мае гістарычнае значэнне, як твор, што паклаў фундамент беларускай нацыянальнай оперы ды даў вехі ейнага далейшага развіцця"*, — адзначала яшчэ ў 1956-м годзе газета паваеннай беларускай эміграцыі "Бацькаўшчына". Дадам, што "Купалінка", у сваю чаргу, была своеасаблівай вяршыняй музычнай драмы і выконвала ў ёй ролю лейтматыву кахання галоўных герояў.

Тое, што "Купалінку" стварыў У. Тэраўскі адмыслова да п'есы М. Чарота, адзначана ў нарысе Н. Юўчанкі "Музыка ў пастаноўках драматычных тэатраў" ("Музычны тэатр Беларусі: 1917—1959 гг.", 1993), "Купалінка" Тэраўскага згадваецца ў апісанні "Зборніка купальскіх і жніўных беларускіх песняў" М. Шчаглова, зробленым С. Берасцень у артыкуле "І жадаў стаць казачнай няўгледкай..." ("Культура беларускага замежжа", 1993). І ўсё-ткі яшчэ і праз 15 гадоў пасля гэтых публікацый аўтарства чароўнай мелодыі — той самай "Купалінкі", якая вядомая ўсім нам з дзяцінства і трывала асацыіруецца ўва ўсіх з беларускім фальклорам, — застаецца, на жаль, схаваным ад грамадскасці. Дык няхай прагучыць нарэшце ўголас імя аўтара гэтай славутай народнай песні: **Уладзімір Тэраўскі.**

Паводле даклада, прачытанага аўтарам 8. 04. 2008 г. на XVII Навуковых чытаннях памяці Л. Мухарынскай у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Максім ІЎКІН

На здымках: У. Тэраўскі, Е. Міровіч, М. Чарот.

Вандруе па Магілёўшчыне выстаўка сучаснага іканапісу пад назвай "Пабудуем храм у душы". Жывапісныя карціны на рэлігійную тэматыку, хрысціянскія абразы, выкананыя і ў праваслаўнай, і ў каталіцкай традыцыях, завіталі, можна сказаць, не зблізку: іх аўтар Ядвіга Сянько жыве ў Маладзечне.

У Чавусах, Дрыбіне, Горках

Пазнаёміцца з яе творчасцю давялося падчас нядаўняй камандзіроўкі ў Магілёўскую вобласць. Наведаўшыся ў Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей, мы, што называецца, з парога трапілі ў незвычайную атмасферу выставачнай залы: уражлівая цішыня, урачыстае ззянне пазалоты і дасканала чыстых колераў на палотнах.

Аказалася, што работы Ядвігі Сянько ўжо не першы тыдзень экспануюцца ў Дрыбіне, да гэтага пабывалі ў Чавусах, а потым пераедуць у Горацкі гістарычна-этнаграфічны музей. І на гэтым іх падарожжа не скончыцца. Прытым, у кожным чарговым пункце прыпынку кананічныя карціны атуляе новы антураж. У Дрыбіне для афармлення выстаўкі скарысталі унікальныя рэгіянальныя вырабы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — супрацоўнікі музея падабралі з фондаў гожыя ўзоры ткацтва, ручнікі, аздобленыя вязанымі карункамі, вышыўкай...



Дык хто ж яна, Ядвіга Сянько? Родам з Маладзечаншчыны. У 1983-м скончыла Маскоўскі універсітэт мастацтваў (аддзяленне станковага жывапісу і графікі факультэта выяўленчага мастацтва, курс кіраўнікоў калектываў выяўленчай творчасці). Працавала мастаком на прадпрыемствах Маладзечна, у рэкламным агенцтве. З 1997 года супрацоўнічае з ЗАТ "Хрысціянская ініцыятыва" (Мінск). Яе творчасць звязана пераважна з хрысціянскай тэматыкай. Па блаславенні Уладыкі Філарэта мастачка стварае спіскі з усіх абразоў, вядомых у праваслаўным свеце. Піша таксама каталіцкія абразы і карціны на біблейскія сюжэты.

Працуе Я. Сянько і ў жанры нацюрморта, пейзажу, займаецца графікай. Стварыла больш як 800 работ на хрысціянскую тэматыку, і сустрэць іх можна ў храмах Беларусі і за мяжой. Нагул жа, яе творы ёсць у прыватных калекцыях — у Беларусі, Германіі, ЗША, Італіі, Расіі, Польшчы, прыбалтыйскіх краінах, Украіне.

Назве выстаўкі "Пабудуем храм у душы" Я. Сянько надае асаблівы сэнс. Бо мэта яе творчасці — прынесці чалавеку святло і радасць, падараваць надзею, што дабрыня і прыгажосць, міласэрнасць, вера ў Бога ўратуюць свет. А мэта яе асабістага жыцця — узвесці храм у душы. З гэтым памкненнем і пачынае мастачка сваю штодзённую працу...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: узоры каталіцкага і праваслаўнага іканапісу з выстаўкі Я. Сянько.

Фота Віктара Кавалёва

Пошукі нашчадкаў шведскіх жаўнераў у Беларусі, пра якія газета "ЛіМ" пісала ў сёлетніх №№ 2, 11, раскрылі і новыя старонкі ў агульнай гісторыі Беларусі і Швецыі.

Да верасня 1939 года Пінск знаходзіўся ў складзе Польшчы. Існуюць звесткі, што мясцовая запалкавая прамысловасць належала манапалісту са Швецыі Івару Грэйгеру. У самім Пінску, праўда, пра яго нічога не ведаюць. Некаторыя краязнаўцы адназначна сцвярджаюць, што швед не мог тут валодаць запалкавай фабрыкай. Маўляў, належала яна выключна яўрэям. Пра шведа падказаў гісторык Андрэй Катлярчук, спасылаючыся на кнігу іншага навукоўцы — Jozef Lewandowski, "Knutpunkt Stockholm: den polska motståndsrörelsens svenska förbindelse från september 1939 till juli 1942".

Але спынімся спачатку на асобе Крэйгера, вядомага ва ўсім свеце прамыслоўца, ды не знанага сёння ў Беларусі.

«Запалкавы кароль», невядомы ў Беларусі

Ад жалезабетону — да запалак

Нарадзіўся Івар Крэйгер 2 сакавіка 1880 года ў горадзе Кальмар. Скончыў Стакгольмскі тэхнічны каледж, атрымаў спецыяльнасць інжынера-будаўніка. Паехаў працаваць у ЗША. У Амерыцы гандляваў нерухомасцю, працаваў лінейным манцёрам у адной з чыгуначных кампаній. А затым накіраваўся будаваць апоры для мастоў у Мексіку. Адтуль вярнуўся і ўладкаваўся ў Нью-Йорку ў будаўнічую кампанію "Fuller Construction". Працаваў у Лондане, Паўднёвай Афрыцы. Не здолеўшы стварыць свой бізнес, скіраваўся ў вандроўку на Усход. Затым вярнуўся ў Еўропу. Зноў у ЗША. У 1907 годзе прыехаў у Швецыю. На радзіме Крэйгер стварыў будаўнічую фірму "Kreuger & Toll". Фірма займалася ўзвядзеннем мастоў і будынкаў з жалезабетону, у той час як усё ў Швецыі будавалася ў асноўным з цэглы. Зарабіў шмат грошай. Так Крэйгер, "скалаціўшы" капітал, увайшоў у сусветны бізнес. І толькі тады ён вырашыў заняцца вытворчасцю запалак. Яго дзед яшчэ ў канцы 1870-х купіў дзве запалкавыя фабрыкі. Праз пэўны час прадаў іх і заняўся іншай справай — гадаваннем тутавага шаўкапрада. Але справа прагарэла. І ўжо ягонаму сыну Эрнсту давялося працаваць на адной з бацькавых былых фабрык. Сабраўшы грошай, Эрнст Крэйгер набыў у Кальмары невялікую запалкавую фабрыку. Яшчэ адным прадпрыемствам валодаў ягоны брат Торсцен. На мяжы XIX—XX стагоддзяў запалкавая прамысловасць ператварылася ў Швецыі ў "нацыянальны від бізнесу". У 1912 годзе браты аб'ядналі свае фабрыкі. Гэта стала асновай будучай "запалкавай імперыі" Івара Крэйгера. Сабе за мэту Івар паставіў авалодаць стопрацэнтнай манаполіяй на вытворчасць гэтага тавару ва ўсім свеце. Да 1932

года ён валодаў ужо абсалютнай запалкавай манаполіяй у 15 краінах, яшчэ ў 9-і — манаполіяй дэ-факта. Акрамя гэтага, ён дамініраваў на рынках 10 краін. 12 сакавіка 1932 года Крэйгер быў знойдзены з прастрэленым сэрцам у парыжскай кватэры. Афіцыйная версія — самагубства. Хоць не ўсе лічаць такую версію адназначнай.

Беларускія фабрыкі – шведская манаполія?

Пакуль нельга дакладна сказаць, што Крэйгер валодаў запалкавымі фабрыкамі ў Заходняй Беларусі (была такая прамысловасць і ў Гродне). Нельга сцвярджаць, бо пакуль на руках няма адпаведных дакументаў. Але, мяркуючы па звестках з гісторыі Польшчы ў міжваенны перыяд, ускоснае дачыненне "запалкавага караля" да Заходняй Беларусі ўсё-ткі пацвярджаецца.

Пасля Першай сусветнай вайны Еўропу ахапіў фінансавы крызіс. Краіны-ўдзельніцы вайны былі спустошаны. Не мелі грошай і новыя краіны, што атрымалі незалежнасць пасля падпісання Версальскага міру. Гэтую сітуацыю скарыстаў Івар Крэйгер. Ён утварыў "Kreuger & Toll Holding Company", праз якую браў крэдыты ў амерыканскіх банках. І гэтыя ж грошы пазычаў пад працэнт еўрапейскім урадам. Апошнія ўзамен абавязаліся на некаторы час прадаставіць манаполію — выключнае права на вытворчасць, імпарт і продаж запалак кампаніі Крэйгера. А швед павінен быў штогадова ўносіць плату за гэтае права. І тут працавала наступная схема. Памер пазыкі разлічваўся такім чынам, каб сума, неабходная ўраду для аплаты працэнтаў па дзяржаўнай пазыцы, перакрывалася платай, якую ўносіў за манапольнае права Івар Крэйгер, прыкладна на 25 працэнтаў. На лічбах гэта магло выглядаць так. Калі плата за манапольнае права складае $ 50 000, то "Kreuger & Toll Holding Company" выдае ўраду крэдыт у памеры $ 1 000 000 пад 20 працэнтаў гадавых. Зразумела, што любая краіна была зацікаўлена ў тым, каб чвэрць сумы па працэнтах па пазыцы плаціў сам крэдытор. Упершыню такую схему, на колькі вядома, швед апрабаваў у 1925 годзе, калі Польшчы пазычыў $ 6 000 000. Ёсць інфармацыя, што ў гэтым самым годзе IMCO (International Match Company — Міжнародная запалкавая кампанія, створаная Крэйгерам у 1923 годзе) і даччыныя прадпрыемствы ў Польшчы пералічылі $ 25 000 000 з сваіх прыбыткаў на асабісты рахунак Крэйгера. А ў 1931 годзе рэклама ў газеце "New York Times" заклікала інвестараў прыняць удзел у размяшчэнні аблігацыі IMCO на суму $ 50 000 000 пад 5 працэнтаў канвертыруемых у золата ў "долговые обязательства". Згодна з рэкламай, у той час кампанія кантралявала 250 фабрык у 43 краінах. На іх долю прыпадала каля 75 (!) працэнтаў ад сусветнай вытворчасці запалак. Але цікава іншае. Рэклама запэўнівала, што прыцягнутыя сродкі мяркуецца накіраваць на павелічэнне магутнасцяў у Польшчы, а таксама пакупку аблігацый Германіі, Турцыі і іншых краін. Гэта сведчыць пра тое, што як мінімум з 1925-га (Андрэй Катлярчук указвае на 1920 год) па 1931-ы, а мо і да смерці ў 1932-м Крэйгер валодаў манапольным правам на запалкавую прамысловасць у Польшчы, а разам з тым і ў Заходняй Беларусі. А манаполія прадугледжвала навязванне сваіх інтарэсаў існаваўшым у той час у краіне вытворцам запалак. У пінскай фабрыкі быў уладальнікам, ці лепш сказаць дырэктарам, як сцвярджаюць краязнаўцы, мясцовы яўрэй, але ён падпарадкоўваўся "International Match Company" на чале з Іварам Крэйгерам, хоць апошні наўрад ці бываў у Пінску. У беларускіх архівах інфармацыя пра датычнасць шведа да пінскага прадпрыемства можа адсутнічаць. Трэба скіроўваць свае пошукі ў Варшаву. У польскай сталіцы, дарэчы, швед меў асабіста ім спраектаваныя апартаменты.

Прадпрыемствы Івара Крэйгера размяшчаліся ва ўсіх еўрапейскіх краінах, акрамя Іспаніі, Францыі, СССР. У кнізе "Спецоперации. Лубянка и Кремль, 1930—1950 годы" аўтар П. Судаплатаў прыгадвае, што ў пачатку 1930-х савецкія чэкісты па заданні кампартыі сустракаліся з Іварам Крэйгерам. "Запалкавага караля" шантажыравалі. Маўляў, калі швед не заплаціць "отступные" $300.000, тады Савецкі Саюз "заваліць" заходнія рынкі таннымі запалкамі. Судаплатаў сцвярджае, што грошы былі выплачаны. У той аперацыі прымаў удзел разведчык Абрам Слуцкі, які паходзіў з Чарнігаўшчыны. Слуцкі займаўся прамысловым шпіянажам. Цікава, што першы ордэн ён атрымаў за аперацыю па выкраданні тэхналогіі вытворчасці шарыкападшыпнікаў не дзе-небудзь, а ў Швецыі.

Аўтар публікацыі пакуль не мае магчымасці даехаць да архіваў Варшавы. Застаецца адно — шукаць нашчадкаў тых, хто працаваў на запалкавай вытворчасці ў Заходняй Беларусі ў 1920-х—1930-х гадах. Мо яны змогуць падказаць нешта важнае.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымку: Івар Крэйгер у галоўным офісе "The Swedish Match", Стакгольм, каля 1930 года.

Вілейская абласная газета — "Вілейская праўда", перайменаваная затым у "Сялянскую газету" — у канцы 1939 — пачатку 1941 гадоў, згуртавала вакол сябе кола пісьменнікаў. Адны былі штатнымі супрацоўнікамі, іншыя — проста друкавалі тут свае творы: Максім Танк, Міхась Машара, Ганна Новік, Алесь Дубровіч, Аркадзь Гейнэ... Працаваў у Вілейцы і Авяр'ян Дзеружынскі.

Вілейскі перыяд Дзеружынскага

Пра "вілейскі перыяд" у жыцці Авяр'яна Сафонавіча ў абласной газеце прачытаў у публікацыі краязнаўца Анатоля Рогача. Пры нагодзе зазірнуў у біяграфію паэта-песенніка. Але там ні згадкі пра Вілейку. І не дзіўна. У большасці біяграфій таго ж Максіма Танка факт працы ў "Вілейскай праўдзе" і "Сялянскай газеце" адсутнічае. Вось адна з біяграфій Авяр'яна Дзеружынскага.

"Нарадзіўся 10.06.1919 г. у вёсцы Хляўно Кармянскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскі газетны тэхнікум (1937), затым Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску (1941). У час Вялікай Айчыннай вайны карэспандэнт і супрацоўнік газет у Краснаярскім краі, Калінінскай вобласці, Маскве. У 1945—1949 гг. — загадчык аддзела газеты "Чырвоная змена". З 1949 г. — рэдактар выдавецтва "Беларусь", з 1972 г. — выдавецтва "Мастацкая літаратура", у 1981 — 1984 гг. — выдавецтва "Юнацтва". Сябра СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалём.

Першыя літаратурныя творы надрукаваў у 1939 г. Выйшлі зборнікі вершаў "Песні маладосці", "Калінавы цвет", "Залаты каласок"...

Многія вершы пакладзены на музыку, сярод іх "Мінскі вальс", "Дзявочая лірычная", "Песня аб Мінску", "Нездаровіцца". Песні "Сабірайся ў госці, мой дзядок", "Мяцеліца" сталі народнымі".

Памёр паэт у 2002 годзе.

Калі з 1937 па 1941 вучыўся ў КІЖы, а з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны — карэспандэнт у расійскіх выданнях, то працаваць у Вілейцы мог зусім непрацяглы час. Вось што пісаў паэт у 1972 годзе для кнігі аўтабіяграфій беларускіх пісьменнікаў "Вытокі песні".

"Як і заўсёды, усё мае пачатак і канец. Два гады вучобы ў газетным тэхнікуме праляцелі непрыкметна, і з 1937 года я ўжо — студэнт Мінскага Камуністычнага інстытута журналістыкі. <...>

Але вось заняткі закончаны, і я на самастойнай працы — літсупрацоўнік вілейскай абласной газеты ("Сялянскай газеты". — **Д.Б.**)...

Нядоўга давялося мне папрацаваць на Вілейшчыне. Грымнула вайна. Нечакана, як гром з яснага неба. На другі дзень эвакуацыйны эшалон павёз мяне на ўсход".

Чым Дзеружынскі займаўся ў газеце? Слова самому журналісту. "Любіў ездзіць у камандзіроўкі, арганізоўваць матэрыялы на розныя тэмы і пісаць фельетоны, замалёўкі, нарысы і крытычныя артыкулы. Старэйшыя рэдакцыйныя таварышы казалі, што ў мяне як з рога — усяго многа. Ды не кожны раз удача. Едзеш напісаць станоўчы матэрыял, — аказваецца трэба пісаць адмоўны. Бывае, што і ў тэрмін, вызначаны рэдакцыяй, ніяк не ўкладзешся і просіш дадатковага часу".

На жаль, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі падшыўка "Сялянскай газеты" захавалася не цалкам. Акурат артыкулаў Авяр'яна Сафонавіча там і не знайшоў. А гэта значыць, пошукі — наперадзе.

Дзмітрый БЕРАЖНЫ

Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

«Памяць» нагадала

Нядаўна звярнуўся да кнігі "Памяць. Краснапольскі раён", дзе ў вайну давялося партызаніць, і нечакана сустрэў у ёй артыкул пра сяброў па агульнай працы ў магілёўскай абласной газеце "За Радзіму" (так тады называлася "Магілёўская праўда") — пра Аляксея Пысіна і празаіка Міколу Ткачова. Першы быў ужо вядомым паэтам, другі — адказным сакратаром газеты.

Мы, былыя франтавікі-партызаны, даволі часта сустракаліся ў Аляксея ці ў Міколы. Пілі каву і не толькі... На такіх імправізаваных сустрэчах чыталі вершы. Аляксей заўсёды гаварыў мне: "Пішы вершы! Пішы. У цябе гэта нядрэнна атрымліваецца".

Усе мы прайшлі праз вайну. Усе мелі баявыя ўзнагароды. Успаміналі франтавое мінулае. Былі мы маладыя і шчаслівыя, што засталіся жывымі. Аляксей чамусьці не вельмі любіў расказваць пра сябе, не хваліўся, але на твары яго назаўсёды засталіся меціны парахавой гары. Ён быў старэйшы за мяне ўсяго на два гады і лічыў за даўняга франтавога сябра. А я захапляўся ягонымі вершамі, паэтычным талентам і хацеў быць падобным да яго. Аляксей, як і я, ваяваў на Проні, дзе ўзімку 1943 года вельмі доўта стаяў фронт. Можа, мы былі зусім побач, на плацдарме каля вёскі Рабавічы, але ў той час не ведалі адзін аднаго. Сёння, болей як праз паўвека, дастаю з кніжнай паліцы невялічкі зборнік ягоных лірычных вершаў "Карабельныя сосны" з дароўным надпісам. Кораткa, але ёмка апавядаюць яны пра нашы вайсковыя дарогі. Калінінскі фронт. Тапора. Таржок. Сяміжарава. Мажайск. Бабруйск... Назвы. Назвы. Шпіталі ў Табольску, у Саракташы...

Мы столькі вёрст прайшлі ў імгле,
У снягах, у агні і ў горкім дыме
Каб больш ніколі на Зямлі
Не паміралі людзі маладымі.

Аляксей Васільевіч Пысін нарадзіўся 22 сакавіка 1920 года. Цяпер яму было б 89. Не круглая дата... Але так ужо здарылася, што менавіта цяпер давялося мне сустрэцца яшчэ раз з даўнім сябрам і падзяліцца з вамі, дарагія чытачы, гэтымі ўспамінамі. Менавіта ў гэтыя дні нарадзіліся радкі, прысвечаныя А. В. Пысіну:

...Вайну таму перамаглі мы
(Кажу, Алёша, я табе):
Сасновы бор і Сож любілі
Напэўна, болей, чым сябе.

Аляксандр СУСЛАЎ

Ураганная «бухта»

Нарыс

У чыстым небе над прыгожымі і велічнымі купаламі царквы мігцелі зоры. Над горадам шырока распасцёрла пругкія крылы цішыня. Пад нагамі Таццяны Ражэвай парыпваў снег. Браўся моцны мароз, але яна нібыта і не звяртала на гэта аніякае ўвагі: ішла і засяроджана думала пра адно, як заўтра правесці нараду з маладымі спецыялістамі — культасветработнікамі, якія пасля вучобы прыехалі працаваць у Смаргонскім і суседніх раёнах.
Ішла па заснежаным тратуары, абдумвала заўтрашняе выступленне. Думкі аб рабоце крыху адступіліся, калі нехта прайшоў паўз яе, павітаўся. Жанчына звярнула з тратуара на сваю вуліцу, неяк міжволі зірнула на шырокае акно хаты — у ім гарэла святло: "Дачка, відаць, зачакалася".

* * *

...На стале настойліва зазвінеў будзільнік. Таццяна ўскочыла з ложка, басанож прайшла да акна, адкінула фіранку, прачыніла фортку. У пакой дыхнула прахалодным паветрам. Сонечны прамень слізгануў па шыбах, зайграў на шкле шафы. Пакуль гатавала каву, у памяці прамільгнулі даўнія дні: неяк сам па сабе ўсплыў успамін пра тое, што мінула, пра тыя ўжо далёкія дні, што праляцелі хуткакрылай ластаўкай, і нават тое, што ў памяці пазарастала бур'яном разнастайнага клопату.

...Стаяла спакойнае, ціхае надвор'е. Струменіла марозная свежасць. Дзяўчаты і маладыя жанчыны, іх кавалеры і мужы сабраліся ў той вечар ля навагодняй ёлкі. Адны танцавалі пад заліхвацкую мелодыю гарманіста, спрытна перабіралі ножкамі ў зімовых боціках, другія пасля выпітага бакала шампанскага ці чаго мацнейшага, — падтанцоўвалі жанчынам. У адным кутку плошчы гучала гуллівая мазурка, у другім — нехта з аматараў-музыкаў выконваў паланез.

Пад ёлкаю, дзе ўзвышалася вялікая сцэна, ішло прадстаўленне, выступалі самадзейныя калектывы.

Таццяна Ражэва, дзяўчына-красуня, увесь час, колькі вучылася ў школе, падчас свят Новага года звычайна выконвала ролю Снягуркі, але ў той вечар ёй выпала сыграць ролю Бабы Ягі, а другой дзяўчыне, яе сяброўцы, — пераўвасобіцца ў вобраз Кікімары. Дзяўчаты, апранутыя ў сцэнічныя касцюмы, павінны былі, як нечысць, адпуджваць Снягурку. Дзея пачалася. Баба Яга і Кікімара ўжо ў які раз пераказалі свае кароткія тэксты, а Снягуркі ўсё не было. Пасля, не разгубіўшыся, пачалі расказваць гледачам розныя небыліцы, анекдоты, як маглі, цягнулі час, а галоўная гераіня прадстаўлення з Дзедам Марозам нібыта праз зямлю праваліліся. Таццяна і Наталля Юркевіч (сёння яна працуе ў галіне культуры вядучым спецыялістам) пачалі нервавацца, а нястрыманыя гледачы ўзнялі свіст і крыкі, маўляў, хопіць "пудрыць" мазгі: "Снягурку на сцэну! Няхай дорыць цукеркі..І кропка...". Таццяне падалося ў тую хвіліну, што Снягурка з Дзедам Марозам наогул ужо не з'явяцца. "Хіба ж можна гэтак! Божачка!" — на вочы Таццяны набеглі слёзы, у грудзях дробна затахкала сэрца. А нехта з гледачоў ужо бэсціў іх і лаяў. Юныя артысткі, у чаканні благога, раз-пораз азіраліся: дзе ж яны падзеліся?

"Што тут нечысць вычвараецца..., — ускочыў на сцэну, вырачыў вочы на артыстак сп'янелы мужчына. — Псік са сцэны... Снягурку давайце", — пляснуў у далоні, злосна выгукнуў, пахіствацца з боку ў бок мужчына. Дзяўчат ці то жартам, ці то ўсур'ёз, сцягнулі са сцэны і ледзь не надавалі кухталёў. Праўда, да гэтага не дайшло. А вось касцюмы Бабы Ягі і Кікімары моцна папсавалі. У той момант дзяўчатам, вядома ж, было не да смеху. Гэта ўжо крыху пазней акрыялі.

...Але што б ні ўсплыло на памяць, над чым бы ні білася думка ў зімовы світанак, а трэба збірацца на працу.

* * *

Асабліва хвалюючая тэма і для смаргонцаў, і для культасветработнікаў раёна — гэта гісторыка-краязнаўчы музей. Сёлета яму споўнілася 25 гадоў. Раней ён месціўся пад дахам былога касцёла святога Міхаіла Архангела. Потым, паколькі будынак быў узведзены ў далёкім XVI стагоддзі і з'яўляецца гісторыка-культурным помнікам, музейцам прапанавалі перасяліцца ў іншае месца — у двухпавярховы будынак былога магазіна. Тут і працуе музей сёння. На другім паверсе размясцілася выставачная зала. Цікавая экспазіцыя распрацавана калектывам музея на чале з яго дырэктарам Марыяй Майсевіч і для першага паверха, дзе будзе ахоплены рэдкімі гістарычнымі экспанатамі, дакументамі літаральна кожны сантыметр плошчы. Тут размесцяцца чатыры залы, чатыры экспазіцыі, прысвечаныя Крэўскаму замку, Вялікай Айчыннай вайне і Першай сусветнай вайне, гораду Смаргоні, знакамітым землякам, дзе, у прыватнасці, будуць ушанаваны такія вядомыя дзеячы культуры, мастацтва і літаратуры, як заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Аляксандр Дзяруга, прафесар Віктар Роўда, вядомы паэт Уладзімір Някляеў ды іншыя.

Думаецца, неўзабаве гісторыка-краязнаўчы музей стане яшчэ адным важным духоўным асяродкам у жыцці не толькі смаргонцаў, але і іх гасцей з Ашмянаў, Астраўца, Маладзечна, Вілейкі...

Чаму ж у музеі з'явіцца экспазіцыя, прысвечаная Першай сусветнай вайне (1914—1918 г.г.)? "Справа ў тым, — кажа Таццяна Ражэва, — што акурат па тэрыторыі Смаргоншчыны праходзіла лінія абароны, якая доўжылася ў той цяжкай вайне, (у крывавую бойню былі ўцягнуты 38 дзяржаў свету і на ёй загінула больш як дзесяць мільёнаў чалавек, а дваццаць мільёнаў засталіся калекамі) аж 810 дзён. Наконт тых падзей сярод змагароў з інтэрвентамі нават існавала такая показка: хто пад Смаргонню не бываў, той і вайны не бачыў. Многія з удзельнікаў баёў за праяўленую мужнасць былі ўзнагароджаны Георгіеўскімі крыжамі. А вось горад быў знішчаны цалкам: ад урагану вайны, які вогненным шквалам пранёсся над Смаргонню, з 16 тысяч насельніцтва засталося ўсяго 160 чалавек". Думаецца, неўзабаве на адной з вуліц ці плошчаў горада з'явіцца помнік Першай сусветнай вайне. Ва ўсялякім выпадку, у кірунку ўшанавання памяці ахвяр той вайны ідзе інтэнсіўная праца.

Такім чынам, у межах Смаргоні ярка вымалёўваецца "Літаратурна-гістарычнае і турыстычнае колца": Крэва — Кушляны — Залессе — Жодзішкі. У апошнім з пералічаных населеных пунктаў таксама ёсць што паказаць айчынным і замежным турыстам: касцёл, езуіцкі каледж, вадзяны млын — гэтыя помнікі ахоўваюцца дзяржавай. У Кушлянах жа і Залессі жылі і тварылі паэт ды кампазітар — Францішак Багушэвіч і Міхал Клеафас Агінскі. Ну, а Крэва... Гэта, перш за ўсё, — замак, далёкая гісторыя.

"Я ўжо амаль дваццаць гадоў у сферы культуры, — гаворыць Таццяна Мар'янаўна. — Абрала спецыяльнасць не спантанна, а па падказцы ўласнага сэрца. Яшчэ калі вучылася ў Смаргонскай сярэдняй школе, як камсамолка актыўны ўдзел прымала ў рабоце культмасавага сектара, нават крыху спявала".

Пасля заканчэння школы Таццяна пайшла працаваць інструктарам гарадскога Дома культуры. І, па сутнасці, тыя гады, мусіць, і былі рашаючымі ў жыцці Таццяны. Некалькі гадоў яна заўзята аддавала сэрца справе і душою зразумела, што культура, няхай і вельмі турботнае месца (на працягу кароткага тэрміну змянілася аж 6 ці 7 дырэктараў Дома культуры), але — гэта яе вірлівая "бухта", яе прыстанак, яе надзённы хлеб, няхай іншым разам і нядужа салодкі, але той, да якога прыкіпела душою.

* * *

У Смаргонскім раёне на сённяшні дзень спраўна працуюць 52 установы культуры. З іх — 18 клубаў, але гэта не звычайныя ў нашым разуменні "пляцоўкі" культуры пад дахам, а адгалінаванні новага тыпу. Ёсць, напрыклад, дамы фальклору, народнай творчасці, сацыяльна-культурных паслуг, рамёстваў. Што ж да сеткі раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы (РЦБС), то ў ёй 28 публічных бібліятэк — шэсць у горадзе і астатнія ў вёсках.

Належная ўвага надаецца музычнай адукацыі падрастаючага пакалення. А ўвогуле ў гэтым прыгожым мастацтве задзейнічаны аж чатыры ўстановы. Тры з іх знаходзяцца ў вёсках Залессе, Солы, Жодзішкі.

"Мы працуем у розных кірунках і, вобразна кажучы, жанрах, звязаных з развіццём народнай творчасці, рамёстваў, мастацкай самадзейнасці, — распавядала падчас гутаркі Таццяна Ражэва. — Ганарымся, што 21 творчаму калектыву прысвоены ганаровыя званні народных і ўзорных. Напрыклад, высокім выканаўчым майстэрствам вылучаецца ансамбль песні і танца імя М. Кл. Агінскага. Дарэчы, гэта і самы старэйшы, і самы вялікі творчы калектыў, у які ўваходзяць харавая, танцавальная і аркестравая групы. Пры Залескім доме культуры даўно і плённа працуе таксама тэатр лялек "Батлейка".

Безумоўна, асноўнае культурна-асветнае асяроддзе ў жыцці і вяскоўца, і гараджаніна — гэта бібліятэкі. Але апошнім часам колькасць іх тут прыкметна зменшылася ў сувязі з тым, што некаторыя "кніжныя скарбніцы" прыйшлі ў непрыдатнасць, маральна застарэлі, як хваравітымі, застарэлымі сталі і жыхары некаторых вёсак. Але святое месца пустым не бывае. Двойчы ў тыдзень у аддаленыя і неперспектыўныя вёскі выязджае мабільная бібліятэка на колах. Аддзел культуры атрымаў ад людзей добрыя водгукі і парады наконт таго, якія кнігі ці перыядычныя выданні найбольш іх цікавяць. Высветлілася, што цяперашні чытач неабыякавы не толькі да твораў мастацкай літаратуры, але цікавіцца і кнігамі эканамічна-гаспадарчага, прававога зместу (клапоцяць людзей пытанні прыватызацыі жылля і зямлі, афармлення дагавораў дарэння кватэр і лецішчаў і г. д.), літаратурай па гісторыі, філасофіі.

"Як і ў суседніх раёнах, у нас ідзе працэс камп'ютэрызацыі бібліятэк, — працягвае аповед Таццяна Мар'янаўна. — Ужо камп'ютэрызавалі іх у аграгарадках Жодзішкі, Залессе, Солы, Сінькі, Лылойці, Вішнева, Крэва, Асінаўшчызна. Гэта цэнтры гаспадарак і дастаткова вялікія вёскі. Без афармлення папяровых картак працуе і наша Цэнтральная раённая бібліятэка: усе дадзеныя на чытача захоўваюцца на электронных носьбітах. У горадзе працуе шэсць публічных і дзіцячых бібліятэк, яны ёсць літаральна ў кожным з нашых мікрараёнаў — Каранях, Усходнім і Цэнтральным".

Штогод кніжны фонд мясцовых бібліятэк, дзякуючы бюджэтным сродкам, што выдаткуюцца на фінансаванне бібліятэк, папаўняецца на пятнаццаць працэнтаў новай літаратурай. Для патрэб чытачоў выпісваецца 125 найменняў часопісаў і 40 — газет. Сярод іх — "Нёман", "Полымя", "Маладосць", "Літаратура і мастацтва".

"У нашых культасветустановах, якімі з'яўляюцца бібліятэкі, існуюць кнігі запытаў, — казала далей Таццяна Мар'янаўна, — запісы, якія робяцца ў іх чытачамі, мы дэталёва аналізуем".

* * *

Пасля атрымання дыплома аб заканчэнні рэжысёрскага факультэта Мінскага інстытута культуры (цяпер БДУ культуры і мастацтваў) Таццяна Мар'янаўна працавала шмат на якіх "дзялянках" у сістэме культасветустаноў горада, паколькі ўвесь час існаваў нейкі кадравы рух, ішло перасоўванне спецыялістаў як па вертыкалі, так і па гарызанталі: была інструктарам Дома культуры, загадчыцай сектара, метадыстам, намеснікам дырэктара, дырэктарам, пасля перайшла працаваць рэжысёрам у раённы метадычны цэнтр народнай творчасці. Тут, у карпатлівай працы (пісала сцэнарыі да тэатральных відовішчаў і свят, канцэртаў і фестываляў), неўпрыкмет праляцелі некалькі гадоў. Яе творчы падыход да справы быў заўважаны, і Таццяну Мар'янаўну Ражэву прызначылі начальнікам аддзела культуры райвыканкама, дзе і працуе ўжо восем гадоў.

Як бы ні складваўся лёс у Таццяны Мар'янаўны, яна добра разумее адно: што працуе не для сябе, а дзеля людзей. З іх жа дапамогаю вырашае і праблемы, што час ад часу ўзнікаюць у культурна-грамадскім асяроддзі. І калі справы ў калектывах ладзяцца, калі тое ці іншае мерапрыемства ўдалося, фестываль прайшоў на "ўра!" — людзі задаволены, то і яна, як кажуць, на "сёмым небе". Радуецца, што праца яе не патанула ў халодных ці пахмурных буднях, а засталася ў кагосьці ў памяці і душы, няхай нават на дзень ці два.

"Мне падабаецца мой горад і нікуды б я адсюль не паехала, няхай бы нават нехта абяцаў залатыя горы... — прызнаецца Таццяна Мар'янаўна. — Тут і бацькі мае пахаваны. А песні як спяваюць у вёсках! Люба-міла паслухаць! Бацькаўшчына даражэй за ўсё. Дарэчы, мой тата, Мар'ян Іосіфавіч, працаваў печнікам у жыллёва-камунальнай гаспадарцы, а мама, Валянціна Якаўлеўна, ўсё жыццё — тэлеграфісткай на раённым вузле сувязі. Яны выхавалі трох дачок — я самая малодшая. Усе мы закончылі музычную школу, яна была побач, праз дарогу ад хаты. Сярэдняя мая сястра Марына закончыла музычнае вучылішча ў Маладзечне і там жа ўладкавалася па спецыяльнасці ў адным з дзіцячых садкоў, а старэйшая Алена працуе на прамысловым прадпрыемстве".

* * *

...Разышліся позна. Неба праяснілася на далягляддзе. Лёгка дыхалася на марозным паветры тут, у парку, сярод купалоў царквы і стромкасці касцёла, паміж якімі сінела закутая ў лёдавую браню рачулка, што падзяляе горад як бы на дзве часткі. У небе серабрыўся месяц. Я крочыў па вуліцы Юбілейнай, што пралегла ад цэнтра горада, да дома нумар 26, дзе мяне чакалі добрыя людзі Тамара і Саша Куцэнкі, і прыгадваў гутарку з начальнікам аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама Таццянай Мар'янаўнай Ражэвай. "Ведаеце, сказала яна, — нехта, пэўна, думае, што культура — гэта прыстанак у ціхай бухце. Але гэта не так. Час ад часу ў гэтай "бухце" ўздымаецца такая моцная бура, што хвалі не могуць супакоіцца аж да наступнага штармавога папярэджання".

Вобразна сказана і справядліва. Бо так яно і ёсць.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ
Фота Міхаіла Разумніка

Проста і глыбока

Сярод лепшых, найбольш удумлівых беларускіх літаратурных крытыкаў сваё законнае месца займае Рыгор Васільевіч Шкраба. Ён пражыў увогуле некароткае багатае на творчыя здабыткі жыццё.

Нарадзіўся Рыгор Шкраба 17 сакавіка 1919 г. у вёсцы Краснадворцы на Старобіншчыне (цяпер Салігорскі раён) у сялянскай сям'і. Закончыўшы Старобінскую дзесяцігодку (1939), паступіў на філфак Белдзяржуніверсітэта. У самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны, каб не трапіць пад гітлераўскую акупацыю, падаўся на Усход (у армію яго не бралі з-за непрыгоднасці да вайсковай службы). Бежанская дарога завяла Рыгора Шкрабу ажно ў Свярдлоўск. Там ён спрабаваў працягваць адукацыю ў педінстытуце. Але з-за матэрыяльных цяжкасцей з педінстытуцкімі аўдыторыямі давялося развітацца і пайсці на настаўніцкую працу ў школе. Тую працу ён атрымаў у Турынскай Слабадзе Свярдлоўскай вобласці. Выкладаў рускую мову і літаратуру. У жніўні 1944 г. вярнуўся ў Беларусь і прадоўжыў навучанне ў БДУ, якое скончыў у 1946 г. Яшчэ будучы студэнтам, юнак, надзелены пісьменніцкім талентам, стаў працаваць у друку — літкансультантам у газеце "Звязда", а потым на дзесяцігоддзе з гакам (1946—1957) звязаў свой лёс з газетай "Літаратура і мастацтва". У яе штаце ён быў спачатку літсупрацоўнікам, затым загадчыкам аддзела літаратуры і нарэшце — адказным сакратаром рэдакцыі. *"Праца ў газеце,* — прыгадваў Р. Шкраба ў аўтабіяграфіі, напісанай у 1965 г., *— многаму навучыла. У прыватнасці, навучыла глыбока ўнікаць у праблему, пра якую пішаш, вывучаць яе ўсебакова і дасканала, каб не прыносіць непрыемнасці ні людзям, ні сабе".*

З такой жа адказнасцю ставіўся Р. Шкраба і да рэдактарскай працы ў часопісе "Полымя". Тут ён шчыраваў больш як дваццаць гадоў (1957—1979). Адсюль, ужо са званнем заслужанага работніка культуры БССР, атрыманым у 1978 г., пайшоў і на пенсію (1979), хаця творчай дзейнасці, вядома, не спыніў. Яна ў яго працягвалася амаль да канца жыцця. Яно пасля цяжкай хваробы абарвалася 25 чэрвеня 1997 г.

Адметнай рысай Рыгора Шкрабы была сціпласць. Яна нараджала непрыманне паказухі, гучнага славаслоўя, самаафішыравання, выхвалення дасягнутым. Ён умеў і любіў, як сам казаў, вучыцца "ў жыцця, у людзей, у кніг". І ўсё рабіў вельмі грунтоўна, пазбягаючы спешкі і пагоні за колькаснымі паказчыкамі. Галоўнай для яго заўсёды была якасць зробленага. Таму і кніг ён выдаў параўнальна няшмат. Гэта зборнікі артыкулаў "Сіла слова", "Характар, стыль, дэталь", "Літаратура і мова", "Энергія слова" (адзначана ў 1989 г. Літаратурнай прэміяй Саюза пісьменнікаў БССР імя Івана Мележа), "Моваю вобразаў". У сааўтарстве з дачкой Ірынай Рыгор Шкраба стварыў тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак "Крынічнае слова".

А яшчэ да зробленага крытыкам трэба дадаць яго шматгадовую працу над школьнымі падручнікамі па беларускай літаратуры для вучняў старэйшых класаў. Па Шкрабавых падручніках наша школа вучыла дзяцей гадоў дваццаць. Напісаны гэтыя падручнікі, як і крытычныя працы Р. Шкрабы, як быццам зусім проста. Але прастата выкладання ў іх спалучаецца з глыбокай змястоўнасцю. На прыкладзе праграмных твораў Р. Шкраба хораша паказваў невычэрпнасць багаццяў нашай літаратуры, яе арыгінальнасць і вызначальную ролю ў абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Творчая праца Рыгора Шкрабы, як мне ўяўляецца, аказвала прыкметнае ўздзеянне на развіццё літаратурнага працэсу, на працу іншых крытыкаў. Асабліва адчувальным і значным было гэтае ўздзеянне ў палымянскі перыяд шчыравання Р. Шкрабы на крытычнай ніве. Большасць крытычных артыкулаў у тыя часы непазбежна праходзіла праз яго рукі. І ён, як мог, спрыяў іх выхаду ў свет у боскім выглядзе, ва ўсякім разе, не псаваў дробязнымі прыдзіркамі, амбіцыёзна-суб'ектывісцкім умяшаннем па прынцыпе: думай і пішы, як я. Ён увогуле вызначаўся сваёй добразычлівасцю, уменнем радавацца не толькі сваім удачам, але і агульнаму поступу беларускай крытычнай думкі.

Шкрабава добразычлівасць выразна адчуваецца ў яго артыкулах і кнігах, якія і цяпер перачытваюцца з цікавасцю. Гэта яскравае сведчанне, што і крытычнае слова таксама можа быць даўгавечным. Вядома, калі яно не павярхоўна-кан'юнктурнае. Не афіцыёзна-дагодлівае, а выпеставанае аўтарам, сагрэтае яго душэўным хваляваннем, прасякнутае глыбокім разуменнем сапраўднай літаратуры. Слова Р. Шкрабы — крытыка і педагога ў яго лепшых узорах мае такія якасці.

Дадам яшчэ, што Шкраба пісаў пра літаратуру без прадузятасці ў дачыненні да яе стваральнікаў, з улікам гістарычнага кантэксту, у якім творы нараджаліся.

У прынцыповых пытаннях даследчык быў няўступлівым, таму часта вёў палеміку з тымі крытыкамі і метадыстамі, якія спрошчана разумелі літаратуру, давалі недарэчныя парады наконт яе выкладання ў школе. Але па форме ягоная палеміка звычайна была карэктнай, у ёй адзначаліся і пробліскі слушных думак, калі яны пракідаліся ў апанентаў.

Я асабіста блізка ведаў Рыгора Васільевіча і ягоную добразычлівасць, а яшчэ ўменне быць удзячным... Адчуваў гэта праз свае стасункі з ім.

Пры жыцці Р. Шкрабы мне давялося надрукаваць некалькі артыкулаў пра яго. І ён засведчыў сваю ўдзячнасць у аўтографах на падараваных мне кнігах. Вось некалькі тых аўтографаў. Зборнік "Характар, стыль, дэталь" падпісаны так: "Дзмітрыю Бугаёву — з павагай да яго працы ў літаратуры. Р. Шкраба. 14.VI. 65 г."

Трошкі больш падрабязны аўтограф на кнізе "Літаратура і мова": "Дарагому Дзмітрыю Бугаёву — з вялікай павагай да яго, да яго працы, да яго кніг. Р. Шкраба. 24.VII.1969 г."

Ці не самы ёмісты зборнік артыкулаў Р. Шкрабы "Моваю вобразаў" суправаджаўся маёй прадмовай з загалоўкам "Жыццё ў крытыцы". Прадмовай аўтар кнігі быў цалкам задаволены і прэзентаваў мне свой зборнік пасля яго выхаду ў свет з подпісам, у якім акцэнтавана ўдзячнасць: "Дарагому Дзмітрыю Якаўлевічу Бугаёву — з вялікай павагай, шчырай падзякай за высокую ацэнку маіх сціплых творчых дасягненняў, з самымі добрымі пажаданнямі. Р. Шкраба. 9 лютага 1990 г."

Такія аўтографы для мяне былі добрай падтрымкай, якая для жывых людзей ніколі не лішняя.

Усё, што рабіў Рыгор Шкраба ў літаратурнай крытыцы і на педагагічнай ніве, натхнялася яго грамадзянскім сумленнем, клопатам пра нашу будучыню, якая ў немалой ступені залежыць і ад узроўню мастацкай літаратуры, і ад сумленнай працы школьных настаўнікаў.

Дзмітрый БУГАЁЎ,
прафесар філалогіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа

«Адчуваю сябе лішняй сярод пісьменнікаў...»

Пра паэтку Ганну Новік у сучасным беларускім літаратуразнаўстве згадваецца рэдка. Яно і зразумела. Завоблачных вышынь у творчасці не дасягнула. Ды і тое, што пасля яе засталося, далёкае ад уключэння ў школьныя хрэстаматыі. Але памятаць пра паэтку мы павінны.

Ганна Новік нарадзілася 25 сакавіка 1914 года ў горадзе Аўгустове Сувалкаўскай губерні, сёння тэрыторыя Польшчы. Але сям'я паходзіла з Вілейшчыны, куды прывезлі і Ганну, калі тое "дазволіла" зрабіць вайна. Ужо маладой дзяўчынай яна ўключылася ў нацыянальна-вызваленчую барацьбу, за што прабыла каля двух гадоў у турме. А допыт ў дэфінзіве стаў прычынай калецтва вока.

З першымі вершамі Ганна Аляксееўна выступіла ў 1937 годзе на старонках "Беларускага летапісу" і "Калоссяў". Тады яна завочна пазнаёмілася і з Максімам Танкам, які стаў яе хросным бацькам у літаратуры. Упершыню ўбачылася Новік з паэтам восенню 1939 года, у рэдакцыі абласной газеты "Вілейская праўда", куды Яўген Іванавіч прыехаў працаваць з Вільні. Пад рэдакцыяй Танка ў газеце друкаваліся вершы паэткі. У яе бібліяграфіі ў даведніку "Беларускія пісьменнікі" пазначаны толькі два творы — "Вёсцы" і "Пад зорамі Крамля". Але гэта не ўсе. Былі яшчэ "Глядзіце зорка", "Рассыпаны зоры"... Былі ўсе падставы, каб з прыходам Саветаў у Заходнюю Беларусь пайсці вучыцца, але паэтка падалася ўсталёўваць савецкую ўладу ў раёне. Была абрана дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі. Працавала інспектарам Куранецкага раёна. Гэта наклала адбітак на яе далейшыя жыццё і творчасць.

Падчас Другой сусветнай вайны Ганна Новік з'яўлялася партызанскай сувязісткай, за што была ўзнагароджана ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені і медалямі. У ваеннай віхуры страціла дачку. Сям'ю пакінуў муж. Ганна Аляксееўна засталася разам з маленькім сынам і бацькамі. У мірны час яна займала пасады старшыні калгаса імя Леніна ў вёсцы Варонічы, старшыні Кузьміцкага сельсавета на Вілейшчыне. На Будслаўскай МТС была памочнікам начальніка палітаддзела.

У вайну, зразумела, пра паэзію Ганне Аляксееўне не было як думаць. Але ў 1945 годзе яна напісала ліст у Саюз пісьменнікаў, і 1 жніўня атрымала адказ. "Паважаны таварыш Новік! Выбачайце, што пішу паштоўку, але мне хацелася б, каб яна хутчэй дайшла да Вас. Я вельмі рад быў і ўсе таварышы, якія Вас ведалі, калі змагаліся за вызваленне сваёй Бацькаўшчыны. Я распытваў пра Вас раней. Але мне ніхто нічога не мог сказаць. Калі зможаце зараз пераслаць нам свае вершы і ўсё тое, што Вы напісалі за апошні час, было б вельмі добра. Пераслаць можаце на маё імя, на адрас Саюза пісьменнікаў у Мінску. Прывітанне Вам ад таварышаў, якія помняць Вас. Моцна цісну Вашу руку — Максім Танк".

Так паміж Ганнай Новік і Максімам Танкам узнавілася былое знаёмства. Яны пачалі ліставацца. Яўген Іванавіч быў для паэткі з Вілейшчыны галоўным дарадцам, найперш у справах літаратурных. "Прашу Вас, Яўген Іванавіч аб адным: не шкадуючы мяне, напішыце адкрыта ці варта мне псаваць паперу, ці будзе што з гэтага, ці вартая я на сённяшні дзень Вашых падарункаў, ці ёсць у мяне якія задаткі на пісьменніка? Вашае пісьмо павінна стаць рашучым момантам у адносінах майго пісьменніцтва", — пісала Г. Новік у сакавіку 1955 года.

Паведамляла яна і пра свае планы. Хацела напісаць кнігу пра жыццё механізатараў МТС, сярод якіх прапрацавала чатыры гады. Па прапанове Танка думала напісаць нарыс, але наракала, што "ў нас няма матэрыялу, а пашукаць яго зараз я не ў стане". Шмат працавала над празаічнымі творамі. Ды не ўсё з яе прозы было надрукавана. Прычына — нізкая літаратурная якасць. Так, 13 жніўня 1955 года ў "ЛіМе" Мікалай Гарулёў выступіў рэцэнзентам апавядання Ганны Новік "Карэспандэнт", надрукаванага ў "Полымі". "Мне здаецца, — пісаў Мікалай Аляксандравіч, — што някепскі дэбют маладой пісьменніцы. І гэта, у першую чаргу, таму, што з апавядання ўстае жывы кавалак жыцця з яго супярэчнасцямі, цяжкасцямі, з яго дадатнымі і адмоўнымі з'явамі. Чытаючы апавяданне, раптам адчуваеш, што расказанае Ганнай Новік — чыстая праўда, якая падчас мяжуе з канкрэтным жыццёвым фактам. І вось тут, мне думаецца, аўтар, ідучы за фактам, часам забыў пра законы мастацтва, пра тыя элементарныя рэчы, якія неабходна ведаць пачынаючаму празаіку". Далей аўтарку крытыкуюць за лішні эпізод у творы, за выпадковых персанажаў, за расцягнутасць. "Першае апавяданне — гэта творчая заяўка маладога празаіка. Заяўка Ганны Новік — цікавая па матэрыяле і заслугоўвае ўсялякай падтрымкі. Няхай не крыўдуе аўтар на адкрытую размову аб недахопах, гэтая размова таварыская, шчырая", — падсумаваў у рэцэнзіі Мікалай Гарулёў.

Такі водгук не мог не расчараваць Ганну Аляксееўну. Таму мо і яе лісты да Максіма Танка часта прасякнуты сумам. Паэтка пачувала сябе пакінутай і забытай. У адным з допісаў яна так і зазначыла: "Адчуваю сябе лішняй сярод пісьменнікаў..." Яшчэ большае расчараванне прынеслі працэсы ўступлення ў Саюз пісьменнікаў Беларусі і выдання кніжкі.

"Уступаць у члены — трэба мець кніжку, а ў мяне яе няма і, магчыма, не будзе, бо я не ўмею змагацца за сваё месца ў жыцці, нават напамінаць аб сабе не ўмею і баюся, бо вельмі цяжка, калі незаслужана лаюць. Магчыма, Вы гэтага ніколі не сустракалі, таму злуецеся на мяне", — звярталася да Максіма Танка паэтка ў студзені 1958 года. Працяглы час не было пэўнасці ў Дзяржаўным выдавецтве наконт зборніка. Але ўсе справы вырашыліся станоўча. У 1960 годзе Ганна Новік была прынята ў Саюз пісьменнікаў. А праз год выйшаў і першы, ды адзіны прыжыццёвы, паэтычны зборнік "Мае вёсны".

Вось толькі паласа белага змяняецца паласой чорнага. Ганна Аляксееўна мела слабае здароўе. Не магла працаваць. І ўзнікла праблема з пенсіяй.

"Другая бяда — са стажам. Райстат не залічвае выбарных пасадаў і таму ўвесь час, што я білася ў калгасе старшынёю — прападае. Трэба даведку райвыканкама, што мяне накіроўвалі на гэту работу. І гэта вельмі цяжка ўладзіць. І яшчэ адно: з даваеннай службы ў мяне застаўся толькі прафбілет з райана. А сведак знайшла, але тыя прыйшлі значна пазней за мяне, толькі ў 40-м годзе. Я ж прыйшла ў раён з 1-га кастрычніка і рабіла ўсё, што было трэба. Як і Вы ведаеце, арганізоўвала гандлёвыя кропкі, загатаўляла лён... Але з тых людзей таксама нікога не засталося і таму ўвесь час я хачу аформіць на райана, каб не было лішняй цяганіны. Дык вось няма людзей, якія б прымалі мяне на работу. І тут можа са стажу прапасці амаль год. А прафарганізацыя ў райана арганізавалася толькі ў красавіку 40-га года". Звярталася да Максіма Танка з просьбай зрабіць ёй даведку, у якой былі б указаны даты першых публікацый вершаў. Такі дакумент даваў падставу для адліку працоўнага стажу з 1937 года. Яшчэ ў 1957 годзе паэтка атрымала другую групу інваліднасці. Значна пазней не стала сына Ганны Аляксееўны. Душэўныя перажыванні прывялі да таго, што ў паэткі здарыліся інсульты. Нягледзячы на ўсе жыццёвыя выпрабаванні паэтка пражыла 82 гады. Памерла ў студзені 1997 года.

На шматпавярховіку па вуліцы Маркава ў Вілейцы вісіць памятная дошка, якая нагадвае, што тут "з 1982 па 1997 гг. жыла Ганна Новік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі". За апошнія гадоў шэсць у Вілейцы з'явіўся цэлы шэраг новых вуліц і завулкаў, якія названы ў гонар пісьменнікаў, мастакоў, гістарычных асоб: Ігнацы Ходзька, Леў Альпяровіч, Эдвард Жалігоўскі, Нікадзім Сілівановіч, Піліп Орлік... Мо да 100-годдзя паэткі з'явіцца вуліца імя Ганны Новік? Хоць яна і не была выбітным літаратарам, але стала першым сябрам Саюза пісьменнікаў з Вілейшчыны. А таму гэты факт заслугоўвае, каб і яго ўвекавечылі.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

Яшчэ з савецкіх часоў павялося лічыць, што беларусы зусім не ваяўнічая нацыя. Зямельку абрабіць, узараць, засеяць і сабраць ураджай — калі ласка, гэта наша, а ваяваць у адкрытым полі... Хіба што "партызанка"... У нашай памяці ўстойліва сядзяць, бадай, толькі падзеі апошняй сусветнай вайны. Тым не менш, ваенных дзеянняў на нашай тэрыторыі было шмат, і нашы продкі безліч разоў бралі ў рукі мячы і шаблі, гналі ворага з нашай зямлі, а потым вярталіся на радзіму і адраджалі свае знявечаныя гарады і мястэчкі. І таму нас не павінна здзіўляць, што вайна ў традыцыйнай культурнай спадчыне беларусаў заўсёды была падзеяй, з якой звязаны многія народныя ўяўленні. Яна з'яўляецца аб'ектам прадказання ў прыкметах, снах, варожбах, фігуруе ў песнях, касмаганічных міфах і тапанімічных назвах.

Пад аховай былых ваяроў

Грунвальдская бітва

Стыхія вайны і смерці мае глыбокія міфалагічныя карані і звязваецца ў самым старажытным беларускім фальклоры з жанчынамі-асілкамі — валатоўнамі. Так, тэма вайны прасочваецца ў паданнях пра Дароту з Асвейшчыны; пра асілка Кацярыну; пра багатырку са Смалявіцкага раёна, якая білася з багатыром Юзэфаўскага замка; пра багатырку з Лепельшчыны, якая перамагае міфічнага волата і яго войска; пра дзяўчыну-рыцара Настассю-каралеўну ды іншых. Лічыцца, што ў гэтых паданнях вобраз валатоўны ўзыходзіць да разбуральнай іпастасі індаеўрапейскай Багіні-Маці, якая заўсёды ў міфалогіі звязваецца з дзікунствам і ярасцю, вайной і злымі чарамі, што, у сваю чаргу, тлумачыцца прыналежнасцю жаночага пачатку да стыхіі хаосу. А такая міфалагічная постаць, як Плачка, якая таксама прадвяшчае вайну, з'явілася ў беларускім фальклоры значна пазней і ўвабрала ў сябе рэшткі культу легендарнай валатоўны.

Але падаецца, што тэма вайны ў старажытнай культуры беларусаў не заўсёды мела адмоўнае значэнне, а першапачаткова ёй надаваўся сакральны сэнс. На маю думку, вобраз асілкаў-жанчын звязваецца з першанасельнікамі беларускага краю, якім уласцівы пэўныя касмаганічныя дзеянні. Да прыкладу, у выніку вайны з кім-небудзь ствараюцца сакральныя аб'екты — т. зв. цэнтры Сусвету, тыя кропкі ў прасторы і часе, дзе здзейснілася акт стварэння. Дзякуючы нашым эпічным багатыркам і іх дзеянням па ўпарадкаванні беларускай прасторы і стварэнні свайго ландшафту, з'явіліся такія сакральныя аб'екты, як Дзявочая гара блізу Мсціслава, Багатыр-Гара на Полаччыне, гара Замак у Смалявіцкім раёне і іншыя. Такім чынам, паданні пра ваенныя дзеянні жанчын-асілкаў можна аднесці да касмаганічных міфаў стварэння.

Вобраз вайны можа быць звязаны і з гісторыяй узнікнення самога Вялікага княства Літоўскага. Амаль да XIII ст. слова «літва» азначала дружыну воінаў-язычнікаў, якія займаліся набегамі на суседзяў. Паступова яны пашыралі свае межы, і «літвой» сталі звацца землі, падуладныя князям, якія ўзначалілі тых воінаў.

А беларускае слова "вой", "ваяр", вытворнае ад ваяўнічага выцця — "вою", і гаворыць пра тое, што старажытныя літвіны-беларусы спавядалі культ ваўка, запазычыўшы яго ў старажытнаславянскага племені вялетаў (волатаў), якія жылі на нашай тэрыторыі на ўсход ад Нёмана. У племені існавалі свае воінскія дружыны-брацтвы воінаў-прафесіяналаў. Яны жылі ў асобных лагерах-селішчах, насілі замест вопраткі неапрацаваныя воўчыя скуры і верылі, што падчас вайсковых дзеянняў ператвараюцца ў ваўкоў. Дзякуючы гэтаму ўзніклі беларускія легенды і паданні пра ваўкоў-пярэваратняў, ваўкалакаў. Узгадаем тут аднаго з лепшых ваяроў нашай даўніны — полацкага князя Усяслава Чарадзея, здольнага, згодна з легендай, ператварацца ў ваўка. Паводле шматлікіх летапісных крыніц, пры нараджэнні гэтага князя было зацьменне сонца, што, па народным вераванні, прарочыла вялікае праліццё крыві. На гербе Вялікага княства Літоўскага чырвоны колер на гербавым полі з'яўляецца традыцыйным колерам воінскай касты, а воін-рыцар на кані сімвалізуе старажытнага бога Ярылу, пазней, у хрысціянскія часы, — святога Юр'ю, які, паводле вераванняў нашых продкаў, лічыўся заступнікам ваўкоў і, натуральна, апекаваўся дружынай ваўкоў-воінаў. А ў народных прыкметах беларусаў ваўкі пракладаюць свае сцяжыны абавязкова ў той бок, дзе вядзецца або распачнецца неўзабаве вайна. У старажытных скандынаўскіх крыніцах гаворыцца пра незвычайных воінаў XIII ст., якія падзяляліся на берсеркераў (мядзведзепадобных) і ульфхеднераў — ваўкагаловых, хаця і сярод берсеркераў сустракаліся ваяры, якія насілі імя ваўка. У беларускім жа фальклоры ваяўнічасць мядзведзя прадстаўлена сувяззю яго з жанчынай-воінам, багатыркай Кацярынай і народнай прыкметай, распаўсюджанай у Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці згодна з якой прадвесцем вайны лічыўся мядзведзь, што прайшоўся па вёсцы.

Прадвеснікамі вайны лічылася таксама шмат вавёрак у лясах і мышэй у палях, вялікая колькасць буслоў на лузе. Неадназначную ролю ў тэме вайны адыгралі і пчолы. Згодна з адной легендай з Віцебшчыны, некалі існавала царства рагатых людзей з жалезнымі зубамі, якія не верылі ў Бога і, калі ім зрабілася цесна ў сваім царстве, рушылі вайной на праваслаўных, чаму і былі ператвораны Богам у пчол, а іх царыца — "разводніца-загадніца" — у пчаліную матку.



Аршанская бітва

Матыў вайны ў фальклоры не абмінуў і птушак, асабліва адну з іх — гругана, які ў народным успрыманні звязваўся з гвалтам, кровапраліццем і вайной. Разам з тым, груган, як вяшчун, прадказвае ў былінах смерць і напад ворагаў, а ў песнях і балядах прыносіць маці вестку пра гібель на вайне яе сына. Зграі груганоў і варон успрымаліся ў мінулым як прадвеснікі нападу татар. Прадвеснікамі вайны лічылася таксама шмат вавёрак у лясах і мышэй у палях, вялікая колькасць буслоў на лузе. Неадназначную ролю ў тэме вайны адыгралі і пчолы. Згодна з адной легендай з Віцебшчыны, некалі існавала царства рагатых людзей з жалезнымі зубамі, якія не верылі ў Бога і, калі ім зрабілася цесна ў сваім царстве, рушылі вайной на праваслаўных, чаму і былі ператвораны Богам у пчол, а іх царыца — "разводніца-загадніца" — у пчаліную матку.

Вобраз вайны прадстаўлены ў вясельным абрадзе беларусаў: дружкі жаніха выступаюць як ваенная дружына, нават яе ўдзельнікі называюцца на ваенны лад — харонжы, маршалак, удзельнікі вясельнага поезда выпраўляюцца па нявесту, як у ваенны паход, клянуцца ў вернасці адно адному, падчас абрада выкарыстоўваецца ваенная атрыбутыка: меч, шабля, страла, сцяг і г.д. Таму невыпадкова, што першая шлюбная ноч ("камора") апісваецца ў фальклорных тэкстах як штурм і заваяванне горада: "Куры, куры, да не пейце рана,// Да не пейце рана, не будзіце пана.// Ой, наш паночак з вайны прыехаў,// З вайны прыехаў, горад зваяваў,// Горад зваяваў, паланяначку ўзяў." Матыў вайны таксама згадваецца ў беларускіх жніўных песнях: "Сягоння ў нас вайна была,// Усё поле зваявалі,// Усё жыта пажалі,// У снапы павязалі..."; калядных, валачобных, купальскіх песнях.

У тапанімічных паданнях беларусаў, якім папярэднічалі касмаганічныя міфы тварэння пра жанчын-багатырак, пасля вайны ўтвараюцца ўрочышчы (Крычаў, Табарэц), мястэчкі (Крайск), палі (Татарына поле), гаі (Казацкі гаёк), пруды (Паганы Пруд, Прудзішча), азёры (в. Свіцязь). У некаторых паданнях падчас вайны пад зямлю правальваюцца цэрквы, палацы...

Паходжанне некаторых камянёў таксама тлумачыцца вайной. Так, пра Пястун-Камень на Віцебшчыне расказваюць, што ў яго абярнулася сумленная дзяўчына, якая ўцякала ад войска, сказаўшы перад гэтым: "Лепш бы я каменем па зямлі качалася, чым ім на пацеху дасталася". Многія камяні з крыжамі на месцах старых могілак лічацца адзнакамі месцаў бітвы з ворагам. Паходжанне некаторых аб'ектаў падаецца наадварот — у супрацьвагу вайне. Да прыкладу, як у паданні пра паходжанне назвы Мір-Гара ў в. Сорагі Слуцкага раёна, дзе нібыта заключылі перамір'е.

У якасці абярэгаў у шмат якіх вёсках Беларусі падчас вайны ткалі абыдзённік, замаўлялі ў храмах "свечы" — каб усе тутэйшыя мужчыны, якія сышлі на вайну, вярнуліся дадому жывымі і здаровымі.

Як бачым, вайна стала ўвайшла ў наш фальклор і замацавалася ў народнай свядомасці. Народныя паданні, песні, казкі, прымаўкі і прыкметы хаваюць яшчэ шмат неразгаданых таямніц і загадак. І чым больш мы будзем даследаваць іх, тым больш зразумеем непаўторную і вартую наследавання душу нашага народа.

Ірына КЛІМКОВІЧ

Пісьменнік, патрыёт, зямляк

Заслаўскія краязнаўцы, праглядаючы гістарычную кнігу "Памяць", звяртаюць увагу на знакамітых людзей, якія нарадзіліся ці жылі ў нашым старажытным горадзе. Мне было цікава даведацца пра асоб, мала вядомых сучаснай моладзі, не са школьнай праграмы. На адной са старонак убачыла партрэт інтэлігентнага мужчыны з крыху сумным, праніклівым позіркам. Гэта — Хвядос Сяргеевіч Шынклер. У звестках пра яго паведамлялася, што гэта паэт, празаік, крытык, які загінуў у Сталінградскай бітве падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Ён нарадзіўся 22 верасня 1903 года ў сям'і служачага чыгункі на станцыі Ізяслаўль (цяпер — станцыя Беларусь). Яго бацьку, Сяргея Канстанцінавіча Шынклера, прызначылі начальнікам станцыі Рудзенск, дзе прайшло дзяцінства і юнацтва Хвядоса. Пасля заканчэння Мінскай рэальнай вучэльні ён пачаў працаваць тэлеграфістам на станцыі Рудзенск. На той час Хвядосу споўнілася 16 год. Жыццё і праца чыгуначнікаў сталі галоўнай тэмай яго літаратурнай творчасці. Сустрэча з пісьменнікам Міхасём Лыньковым мела вялікае значэнне для маладога карэспандэнта рэспубліканскіх і мясцовых газет. Менавіта Лынькоў запрасіў яго на пастаянную працу ў рэдакцыю бабруйскай газеты "Камуніст", менавіта з рэкамендацыяй Лынькова малады аўтар увайшоў у літаб'яднанне "Узвышша". У аўтабіяграфіі Шынклер напіша: "Беларускай літаратурай і наогул усім беларускім зацікавіўся ў 1919 годзе, калі працаваў у Мінску. Лепшым сваім творам лічу "Сонца пад шпалы".

У 1935—1941 гадах Хвядос Шынклер супрацоўнічае з газетай "Літаратура і мастацтва" і часопісам "Полымя рэвалюцыі". Творчае жыццё ў росквіце. Добрыя водгукі атрымала яго кніга "Пульс жыцця. Запіскі тэлеграфіста", якая выйшла з друку ўжо ў эвакуацыі. На пачатку вайны ў 1941г. Шынклер пакідае Мінск і спыняецца ў Свярдлоўску, дзе працуе на цэнтральным тэлеграфе, не пакідаючы літаратурнай творчасці. З-за слабага здароўя ён меў вызваленне ад мабілізацыі на фронт, аднак у сакавіку 1942 г. пайшоў на вайну добраахвотнікам. Пасля заканчэння вайсковага вучылішча ў Кыштыме ў Чэлябінскай вобласці (чатыры месяцы паскоранай вучобы) Хвядос Шынклер атрымаў званне малодшага лейтэнанта і быў прызначаны камандзірам кулямётнага ўзвода. Ён апынуўся на фронце пад Сталінградам у надзвычай цяжкі перыяд — кастрычніку 1942 года... Яго родным прыйшла трагічная вестка, што камандзір 1 роты 93 асобнай стралковай дывізіі Хвядос Шынклер па-геройску загінуў у баі каля пасёлка Бякетаўка і пахаваны ў брацкай магіле. Жыццё гэтага чалавека абарвалася ў няпоўныя 40 год. Загінуў на фронце і яго 17-гадовы сын Юрый.

Нядаўна мы з настаўнікам В. Тарасевічам сустракаліся з дачкой Х. Шынклера — Ірынай Максімовіч. Яна жыве ў Мінску на вуліцы Альшэўскага, разам з дачкой і ўнукам. Ірына Хвядосаўна ганарыцца сваімі бацькамі, захоўвае кнігі, фотаздымкі, артыкулы, іншыя дакументы, што складаюць сямейную гісторыю. Для нас усе гэтыя дакументы таксама маюць вялікую каштоўнасць — яны дапаўняюць гістарычную скарбонку Заслаўя.

Вікторыя ВНУК,
вучаніца 9 класа сярэдняй школы № 1 г. Заслаўя

Алена БРАВА. Нарадзілася ў 1966 годзе ў горадзе Барысаве. Скончыла факультэт журналістыкі БДУ. Жыла на Кубе. Апошнім часам працуе намеснікам галоўнага рэдактара барысаўскай газеты "Адзінства".

Піша вершы і прозу. Пісала на рускай мове. Нават паспела выдаць зборнік вершаў "На глубине корней". Аднак ужо больш як дзесяць гадоў піша па-беларуску. Публікавала прозу ў часопісах "Крыніца", "Маладосць", "Полымя", у тыднёвіку "Літаратура і мастацтва". Заявіла пра сябе як пра адну з найбольш таленавітых пісьменніц псіхалагічнага жанру. Выдала кніжку "Каменданцкі час для ластавак" у выдавецтве "Мастацая літаратура" (2004). На пачатку гэтага года там жа выйдзе ў свет чарговая кніга яе мастацкай прозы "МЕНАДА І ЯЕ САТЫРЫ".

Папярэдне, у двух нумарах часопіса "Маладосць" (№ 9 —10, 2008), быў выдрукаваны гэты аднайменны раман.

"Любовь — это труд души."

Мікалай БЯРДЗЯЕЎ

МЕНАДА І ЯЕ САТЫРЫ

Раман

Ці не пяць гадоў таму пісаў пра Алену Брава і таксама ў сувязі з публікацыяй яе мастацкай прозы ў часопісе "Маладосць". То была помная аповесць "Каменданцкі час для ластавак", што паспрыяла вядомасці тады яшчэ малазаўважнай літаратаркі. Адчуванне сур'ёзнасці, унутранай заглыбленасці і ахвярна-біяграфічнага аўтарскага дачынення да ўласнай творчасці спараджала ўзаемную чытацкую павагу і прыхільнасць.

Псіхалогія і ўнутраны свет жанчыны ў савецкім і постсавецкім грамадстве — вось асноўная тэма творчасці Алены Брава. Можна сказаць і прасцей, што пісьменніца ў вобразнай форме даследуе ўласную псіхалогію, паколькі сама па сутнасці і з'яўляецца зборным прататыпам большасці сваіх гераінь. Гэта вельмі смелая, хоць і небяспечная спроба ствараць вобразы на алюзіях аўтарскага жыццёвага вопыту. Рэальнасць быцця таксама відавочная. Аўтар толькі дазваляе сабе мастацкую карэкцыю тых ці іншых сюжэтных адценняў-адгалінаванняў, якія парадкуюцца агульнай стылістычнай мелодыкай. Як для жаночага рамана, то яго можна назваць нават жорсткім, паколькі ў ім даволі шмат непрыхаваных сцэн фізічнага характару.

Сюжэт: дзяўчына-старшакласніца з няпоўнай сям'і, начытаўшыся замежнай класікі пра каханне, сама хоча перажыць тыя самыя пачуцці; гатовая да самаахвярнасці дзеля любімага мужчыны (быць *Дзяўчынкай-Дыванком-ля-Яго-Ног*"), прагне спазнаць **Вялікае каханне** ў нешчаслівай любві... І прайшоўшы сем пякельных колаў жарсці, вярнуўшыся па спіралі да пачатку, не знаходзіць іншага выйсця, як сысці самой... назусім.

Безумоўна, у вобразе галоўнай гераіні прачытваюцца лёсы шмат якіх жанчын постсавецкага часу, гэткіх, прабачаюся, "душэўных прастытутак", духоўны свет якіх, часам, надзіва шырокі, рознабаковы і ўражвальны... З гэтага вынікае, што жанчына (гераіня), прагнучы самадастатковасці і агульначалавечай дасканаласці, іншы раз забываецца на сваю жаночую і мацярынскую сутнасць, ігнаруючы дзеля сваіх узвышаных эгаістычных мэтаў тое, што закладзена ў ёй самой прыродаю...

Старшакласніца Юля жыве з маці, не маючы з ёй нават агульнага паразумення. Як кот з сабакам — цярпімасць на аддаленні. (*"Вочы ў яе, між іншым, былі колеру няспелага агрэсту, з густымі веямі і ружаватымі павекамі, заўжды прыпухлымі, нібыта пасля слёз, а скрозь скуру прасвечвалі блакітныя жылкі, як тая рачная сетка на новенькай контурнай карце па геаграфіі. Але ніхто яшчэ не спяшаўся скіраваць свае ветразі да гэтага пятнаццацігадовага мацерыка, яшчэ не адкрытага і не нанесенага на карту."*) Аднак дзяўчо многа чытае. Асабліва ўражвае яе аповед С.Цвейга "Ліст незнаёмкі". Адчуваючы сябе беспрытульнай у школе і дома, у чыста жаночай сям'і (дзе мужчына "прыляцеў — адляцеў"), яна мроіць пра каханнне да адзінага чалавека, якому яна ахвяравала б сваё жыццё... (*"Для таго, каб атрута рамантычнае літаратуры ўсмакталася ў кроў, трэба з дзяцінства песціць у сабе тонкае пачуццё закінутасці. Ці здагадваецца мая гераіня пра тое, што павуцінне, якое ёй уяўляецца рэальнасцю, вытка-ла для яе Арахна, размятваючы нітку з рота?"*)

Застойны перыяд сацыялізму паказаны праз халодныя малюнкі гарадской панарамы, прымітыўны чалавечы побыт, нацягнутыя стасункі паміж людзьмі, нервова-рваныя дыялогі... (*"Позняя восень, як п'яная расхлістаная дворнічыха, корпаецца ў дварах, змятаючы брудныя папяровыя кветкі ды затаптаныя кумачовыя банты ў калюжыны (горад толькі што адсвяткаваў чарговую гадавіну рэвалюцыі. (...) Паблізу ад эстрады знаходзіцца напаўразбураны фантан, пабудаваны яшчэ ў сталінскую эпоху: на пастаменце ў сярэдзіне круглай яміны, якая калісьці запаўнялася вадою, басаногая дзяўчына ў лёгкай сукні і вянку з плюшча танчыць у атачэнні двух мужчын з флейтамі. Скульптура істотна пацярпела ад дажджоў, снегу ды мясцовай шпаны, і цяпер цяжка дакладна вызначыць, што менавіта меў на ўвазе аўтар: танец менады з сатырамі або німфу, якая спакушае фаўнаў."*) Дарэчы, зазірнуўшы ў міфалагічны даведнік, можна зразумець, што **менады** нароўні з **сатырамі** былі ўсяго толькі карнавальнай світай дыянісійскага Вакха: выконвалі пры ім вясельныя хмельныя цырымоніі: іграл і, танцавалі, спявалі, выслаўлялі, высмейвалі, спакушалі — папросту кажучы, жылі ў сваё задавальненне... Калі, з пэўнай адцягненасцю ў часе і прасторы, параўнаць не такі даўні перабудоўчы хаос з той дыянісійскай парой, то бадай можна пагадзіцца з правамернасцю назову рамана. Хоць сам жанр гэтага твора можна назваць не **раманам**, а *жаночымі раманамі*, сабранымі да купы...

І ўся гэта "вакханалія" — першы муж (*аўтар* ейнай дэфларацыі; вось каб *"ён меў звычку забіваць бабулек — о, тады была б зусім іншая справа!"*) і цэлая чарада няўдзячных падлаватых мужыкоў-мужланаў (суддзі, дырэктара, салдафона, доктара і проста бомжа-зладзюгі), якіх яна намагалася "ашчаслівіць сабой", наноў патрапіўшы на самага першага, — завяршылася любоўным актам з рэпертуару тэатра абсурду... каб дайсці да *"полной гибели всерьёз"* пад коламі аўтамабіля (пасля першай спробы абманнага самагубства)... Хоць па сутнасці сам твор больш чым сур'ёзны, з элементамі драматызму, прынамсі такой была аўтарская задума і менавіта ў такім ракурсе было пастаўлена "вечнае жаночае" пытанне. Ці ўдалося аўтару вырашыць яго ў мастацкім плане? І ці магчыма гэта ўвогуле, хутчэй можна паставіць яго так: наколькі гэта ўдалося аўтару?

Дзеля адказу спынімся на некаторых аспектах твора.

Вельмі грунтоўна і рэалістычна паказана эпоха застою пачатку 80-х, асабліва на побытавым узроўні, помная аўтарам, хоць і падкарэкціраваная сучасным поглядам на яе асобныя дэталі. І дзіўна, што ніякім бокам не праявіўся ў рамане важны грамадска-дзяржаўны працэс перабудовы, дэмакратызацыі і суверэнітэту, хіба толькі ўскоснымі штрыхамі рынкавых адносін і камерцыялізацыі. Відаць, змена грамадскага ладу асаблівым чынам не паўплывала на светаўспрыманне і ўнутранае жыццё гераіні. Зрэшты, гэта таксама майстэрства пісьменніка, не агалошваючы ўласнага стаўлення да палітыкі і ідэалогіі, паказаць іх сутнасць праз другарадныя вобразы і метафары. (*"Вось і стварай трагічны раман свайго жыцця ў такіх неспрыяльных умовах! Што ж, тады яна будзе эканоміць на самым неабходным: гэта не так выкшталцона, як гандляваць сваім целам, але больш-менш упісваецца ў рамантычны стандарт."*)

Уласна мне падаецца, што псіхааналіз учынкаў гераіні падчас залішне перанасычаны рэалізмам і натуральнасцю (фізічнай дэталізацыяй), ажно да вульгарнасці (*"Правая рука доктара ў гумавай пальчатцы груба шнырала ў лабірынтах яе ўлоння, у той час як левая прыціскала да вуха мабільнік, у які ён ажыўлена гарлаў: "Зараз у мяне такая сука — вышэйшы клас! Якраз тое, што твайму кабялю патрэбна! Прывозь на вязку! Шчанюкі атрымаюцца супер-пупер!" Калі яна прыніжана спаўзла з крэсла, знакамітасць, меланхалічна аглядаючы урбаністычны пейзаж за акном, паведаміла, што ёй, Юлі, неабходныя біялагічна актыўныя дабаўкі..."*)

З іншага боку ёсць адчуванне, што без такіх наўпроставых "малюнкаў" жыцця немагчымага паказаць жаночую *долю* дастаткова поўна, а да таго ж па сітуацыі гэты эпізод выпісаны проста філігранна.

Дзіўна, што гераіня не робіць аніякіх высноў са свайго горкага вопыту і, чым далей, тым глыбей і незваротней заходзіць у сваіх любоўных маніях... Пэўна, гэта фрэйдаўскія штучкі, у якіх я слаба абазнаны. Але чаму іх не можа быць, калі побач фігуруюць *літаратурныя комплексы* Дастаеўскага, Цвейга, Купрына, Фітцджэральда... Адчувальны ўплыў і Эльфрыды Ялінэк.

"Блізкасць пісьменніцы да свайго тэксту" і частыя ўводы слоў ад аўтара ў самім рамане як бы пацвярджаюць яе "саўдзел" нароўні з гераіняй, прынамсі, у "распрацоўцы" самой ідэі рамана і яго сюжэтных хадоў.

Прабачым аўтару відавочныя моўныя і граматычныя хібы, якія, спадзяёмся, будуць выпраўленыя ў кнізе (часціца *"бы"* пасля галосных: *"сцерці бы адразу"*, *"калі бы знайшоўся"*, — *"ля каранёў валос"*, *"ва двор"*, *"агібае"* і г.д.)...

А што ж, як кажуць, засталося ў асадку — на сэрцы і розуме чытача? Узнікла адчуванне, што ў беларускай літаратуры з'явіўся прэтэнцыёзны глыбокі і жанрава аб'ёмны твор, які можа стаць сур'ёзным апанентам (і канкурэнтам) жаночых раманаў. Бо хто яшчэ з сучасных нашых пісьменніц у тым ці іншым ключы распрацоўваў падобную тэму: Вольга Куртаніч, Ева Вежнавец, Наталка Бабіна, Югася Каляда? Крытыка адзначала іх удачы і пралікі. Паспрабавала намацаць гэтую праблематыку і Валянціна Коўтун, ствараючы вобраз Еўфрасінні Полацкай (тут, праўда, высокае духоўнае пакліканне і сам даўно замацаваны ў гісторыі вобраз услаўленай асобы аказваў супраціў, роўны сіле пасягання на яго статус-кво)... Параўнаўшы творы вышэйзгаданых аўтараў з апошнімі творамі Алены Брава, схіляюся да думкі, што менавіта яна найбольш ярка і годна заявіла пра сябе, *замахнуўшыся* на лідэрства і вядучую ролю ў гэтым жанры на бліжэйшую літаратурную перспектыву. Ёсць у яе тэкстах і адчуванне мастацкай няскончанасці, і творчай невыпрацаванасці, і затоенага патэнцыялу. Будзем спадзявацца.

І памятаць пра светлыя і чыстыя памкненні юнай дзявочай душы, якія, бы промні ранішняга сонца, натыкнуліся на празрыстае шкло рэальнасці і прагна *праламіўшыся* ў заваконне, ужо не змаглі там нікога сагрэць, а толькі паступова згасалі на непранікальных ліках сваіх абраннікаў...

Аўтар запэўнівае нас, што *"з тымі "духоўнымі каштоўнасцямі", якія яна старанна гадавала ў сабе,* **добра паміраць**. *Але жыць — жыць з імі немагчыма..."* Так было ўчора, гэтак ёсць сёння, так будзе і...

Ці ўсё-ткі *"ніякага кахання ўвогуле і не было: усе яе "раманы", і гэты, найпершы — адно ўцёкі ад той дзяўчынкі, якую яна сама ў сабе так і не здолела палюбіць..."*?

Шчыра кажучы, пэўнага адказу ведаць не хацелася б. Бо сэнс літаратуры і палягае ў таемнасці самога мастацтва, якое тут, безумоўна, прысутнічае.

ЛеГАЛ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар, намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3380
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 1.04.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1681

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09013